Г.П. Арлова

# Беларуская народная педагогіка



*Светлай памяці бабулі*
*Ганны Мікалаеўны прысвячаю*

Г.П. Арлова

# Беларуская народная педагогіка

Мінск
„Народная асвета"
1993

ББК 74.03 (2Б)
А82
УДК 37:39 (-826) (091)

**Арлова Г. П.**

А 82 Беларуская народная педагогіка. – Мн.: Нар. асвета, 1993. – 120 с.: іл.

ISBN 5-341-00966-5.

Орлова А. П. Белорусская народная педагогика.

У кнізе педагагічныя ідэі, выхаваўчы вопыт беларускай народнай педагогікі раскрываюцца праз прыказкі, прымаўкі, казкі, песні, загадкі, прыпеўкі, міфалогію, галашэнні, абрадавыя гімны, быліны. Ля іх вытокаў – сялянская сям'я канца XIX – пачатку XX стагоддзя, калі пад адным дахам жыло некалькі пакаленняў, калі строга захоўваліся народныя традыцыі.

Адрасуецца настаўнікам, бацькам, усім, хто цікавіцца пытаннямі выхавання.

Навукова-папулярнае выданне

**АРЛОВА Ганна Пятроўна**

**Беларуская народная педагогіка**

Загадчык рэдакцыі М. А. Нікітка. Рэдактар А. М. Парахневіч. Малодшы рэдактар Л. І. Сташэнка. Афармленне мастака Л. У. Паўленка. Мастацкія рэдактары Л. У. Паўленка, Л. А. Дашкевіч. Тэхнічны рэдактар М. Р. Каліберава. Карэктар І. С. Яромчык.

**ИБ № 3383**

Здадзена ў набор 16.01.92. Падпісана ў друк 14.09.93. Фармат $84 \times 108^1/_{32}$. Папера газетная. Гарнітура Прэс Раман. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк 6,3. Умоўн. фарба-адбіт. 6,51. Ул.-выд.арк. 7,82. Тыраж 12 700 экз. Заказ 77. Цана 185 р.
Выдавецтва „Народная асвета" Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Ліцэнзія ЛВ № 4. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

$А \frac{4302000000 - 250}{М 303 (03)} 1-93$

**ББК 74.03 (2Б)**

**ISBN 5-341-00966-5**

**© Г. П. Арлова, 1993**

# Прадмова

На працягу стагоддзяў народная педагогіка была амаль адзіным сродкам выхавання людзей. Пад уплывам прыродна-геаграфічных і сацыяльна-эканамічных умоў жыцця беларуская народная педагогіка стварыла адпаведны тып асобы. Шматлікія этнаграфічныя працы сведчаць пра тое, што беларус працавіты, шчыры, па-сапраўднаму любіць сваю родную зямлю, сумленны і адданы справе, яму ўласцівы высокі гуманізм, добразычлівасць, павага ў стаўленні да людзей, ашчаднасць, гасціннасць.

Асноўным творцам і ахоўнікам народных педагагічных традыцый на многія часы была сялянская сям'я. Пра дабратворны ўплыў і дзейнасць народнай педагогікі сведчыць тое, што ў ХУІ–ХУІІІ стагоддзях на беларускіх землях быў пашыраны звычай „дзядзькавання", калі дзяцей шляхты аддавалі на выхаванне ў беларускія сялянскія сем'і. На думку заможных бацькоў, гэта давала магчымасць выпрацаваць у сыноў і дачок найкаштоўныя маральныя якасці.

Сфарміраваны стагоддзямі лад жыцця беларускіх сялян стварыў спецыфічнае выхаваўчае асяроддзе, своеасаблівы выхаваўчы фон, дзе ў суладдзі дзейнічалі разнастайныя сродкі, спробы і прыёмы выхавання. Усё гэта разам, з улікам канкрэтных абставін уплывала на духоўна-маральнае, разумовае, фізічнае і эстэтычнае развіццё асобы.

Беларускія этнографы-асветнікі не раз падкрэслівалі ў сваіх даследаваннях ні з чым непараўнальную сілу і моц народнай педагогікі. У прыватнасці, М. Я. Нікіфароўскі напрыканцы ХІХ стагоддзя ў „Нарысах Віцебскай Беларусі" пісаў: „Практычнае жыццё падказвае, што беларуская маці, нават непісьменная, умее пакуль выхоўваць дзіця ў адданасці праваслаўю і дзяржаўнай уладзе" (40, 54).

Асобныя моманты педагагічнай творчасці беларускага народа ў дарэвалюцыйны час згадваліся ў працах Д. Г. Булгакоўскага, М. В. Доўнар-Запольскага, Я. Ф. Карскага, М. Я. Нікіфароўскага, І. І. Насовіча, Е. Р. Раманава, А. К. Сержпутоўскага, П. В. Шэйна, П. М. Шпілеўскага і іншых.

Першым даследаваннем, прысвечаным спецыяльна пытанню беларускай народнай педагогікі, стаў артыкул А. Я. Багдановіча „Педагагічныя погляды беларускага народа" (1886) (13).

Работы даследчыкаў-асветнікаў ХІХ – пачатку ХХ стагоддзя падрыхтавалі грунт, грамадскае ўспрыманне, стварылі падмурак для выкарыстання народнай педагогікі ў працы

школы. Іхнія ідэі атрымалі сваё развіццё ў дзейнасці настаўнікаў па стварэнню беларускай народнай школы.

Сацыяльныя ўзрушэнні, якія прывялі да змен ладу жыцця, спроба перавесці велізарную масу сялянства на урбаністычны тып культуры прывялі да распаду патрыярхальнай сялянскай сям'і, парушылі стагоддзямі сфарміраванае выхаваўчае асяроддзе. У выніку шматлікія добрыя народныя традыцыі зніклі з сямейнага выхавання. У школе калі і скарыстоўваюць асобныя элементы народнай педагогікі, то часцей спантанна, неўсвядомлена. А між тым народная педагогіка – невычэрпная крыніца педагагічных ідэй, не валодаючы якімі мы падсякаем корань педагагічнай навукі, бо народная і навуковая педагогіка – адно дрэва выхавання. Усё гэта сведчыць пра неабходнасць узнаўлення беларускай народнай педагогікі, дзеля таго каб аднавіць яе ў яе ж спрадвечных правах, выкарыстаць народную мудрасць дзеля вырашэння сучасных педагагічных задач.

У кнізе, якую мы адрасуем зацікаўленаму чытачу, педагагічныя ідэі і выхаваўчы вопыт беларускай народнай педагогікі раскрываецца на падставе аналізу помнікаў этнаграфіі і фальклору. Прычым у большасці выпадкаў мы спасылаемся на традыцыі, што існавалі напрыканцы XIX – пачатку XX стагоддзя. Гэты перыяд гістарычнага развіцця беларускага народа дае найбольш поўнае і цэльнае ўяўленне пра педагогіку беларусаў. Звязана гэта з тым, што на той час галоўны захавальнік народнай педагагічнай мудрасці – сялянская сям'я, яшчэ была моцная, пад адной страхой жыло некалькі пакаленняў. Сяляне прытрымліваліся патрыярхальнага ўкладу, строга выконвалі народныя традыцыі, кіраваліся запаветамі дзядоў і бацькоў

# УВОДЗІНЫ Ў НАРОДНУЮ ПЕДАГОГІКУ

## Што такое народная педагогіка?

НАРОДНАЯ педагогіка нарадзілася на зямлі разам са з'яўленнем „разумнага чалавека" ( homo sapiens). Праца стварыла чалавека і стала першым сродкам і метадам выхавання, выпеставаным народнай педагагічнай творчасцю. Народная педагогіка з'явілася і развілася як вынік неабходнасці перадаваць ад пакалення да пакалення пэўныя працоўныя веды, умельствы і навыкі, а таксама правілы і нормы грамадскіх паводзін, без якіх была б немагчымай жыццядзейнасць чалавека. „Вынікі грамадска-працоўнай дзейнасці, як паказваюць законы генетыкі, не маглі запісвацца ў генах, – адзначаў акадэмік М. П Дубінін – Гэта здзяйснялася шляхам развіцця асаблівай формы перадачы ад пакалення да пакалення сацыяльнага вопыту, што адбілася ў стварэнні ўсё больш складанай сацыяльнай праграмы, якая перадавалася праз выхаванне" (23,51). Змястоўнасць народнай педагогікі, механізм уплыву яе сродкаў і метадаў пастаянна развіваецца і абнаўляецца ў залежнасці ад сацыяльна-эканамічных умоў жыцця і працы народных мас

На працягу многіх стагоддзяў народная педагогіка назапасіла пэўны вопыт у справе выхавання і навучання падрастаючага пакалення. Педагагічныя ўяўленні, погляды, меркаванні, ідэі праяўляліся ў працоўнай дзейнасці, у традыцыях, звычаях, гульнях, святах, вуснай народнай творчасці, сямейным ладзе жыцця. На аснове практычнага ажыццяўлення гэтых уяўленняў-ідэй фарміравалася своеасаблівая сістэма народнага выхавання. З яе ўмоўна можна вылучыць працоўнае, рэлігійнае, маральнае, патрыятычнае, разумовае, эстэтычнае і фізічнае выхаванне. Усе складовыя часткі ўзаемазвязаныя і ўзаемапранікальныя і знаходзяцца ў цесным дыялектычным адзінстве. Грунтам і пладаносным зернем народнай педагогікі было і ёсць працоўнае выхаванне. Гэта абумоўлена ўсёй гісторыяй развіцця народа.

Народная педагогіка фарміруецца ў асяродку актыўнай творчай жыццядзейнасці народа, якая і забяспечвае пераемную сувязь пакаленняў. У шырокім сэнсе слова аб пераемнай сувязі пакаленняў беларускі народ кажа: „Вучы народ, вучыся і ў народа" „Староннія людзі кажуць: кінь за сабою, то знойдзеш перад сабою". Між пакаленнямі існуе шматбаковая пераемнасць, якая абумоўлена спадчыннасцю, асяроддзем і выхаваннем. У беларускай народнай педагогіцы маюцца прамыя і ўскосныя доказы на ўплыў гэтых фактараў на фарміраванне асобы чалавека. Напрыклад, намёк на рознасць паміж людзьмі, абумоўленую спадчыннасцю, утрымліваюць многія

народныя выказванні: „Нораў не клетка – не пераставіш", „Час часу рознь і чалавек чалавеку тож". Аднак: „Разумным дзіця не родзіцца", „Нягоднік не родзіцца, а робіцца", – сцвярджаюць людзі, значыць спадчыннасць адыгрывае не галоўную ролю ў фарміраванні асобы.

Народная педагогіка надае вялікае значэнне навакольнаму свету, або, іначай, сацыяльнаму фактару ў развіцці чалавека: „На добрай зямлі дзіця пасадзі, і тое вырасце". У больш канкрэтных выпадках беларуская народная педагогіка пра ўплыў грамадства, сацыяльнага асяроддзя на фарміраванне асобы кажа наступнае: „З якім пазнаешся, такім сам будзеш", „У лесе людзі дзічэюць, а ў людзях людпеюць".

Галоўнае ж у фарміраванні чалавека, на думку беларускага народа, – выхаванне: „Ізвера людзі навучаць, не тое што чалавека", „Не кручаны – не рамень, не вучоны – не чалавек". У такім выпадку навучанне варта разглядаць як выхаванне ў шырокім сэнсе слова.

Ідэю пераемнай сувязі пакаленняў найбольш яскрава можна прасачыць на прыкладзе сям'і – структурнай адзінкі і асобнага звяна ў адзіным ланцугу пераемнай сувязі пакаленняў. Паміж старэйшым і малодшым пакаленнямі заўсёды існавала цесная залежнасць. Старэйшае пакаленне бачыць у малодшым сваю будучыню, надзею на шчаслівае і раднае жыццё. Маладым на вяселлі зычаць: „Каб дачакаліся ўнукаў і праўнукаў, з якіх было цешыцца кожны дзень".

Народ вучыць: „Як добрае семя, дык добрае й племя", „Які род, такі плод", „І мой бацька такі маўся, і я ў яго ўдаўся". Усё гэта сведчыць, што асобныя задаткі, схільнасці, здольнасці перадаюцца ў спадчыну, у фарміраванні чалавека актыўна ўдзельнічае біялагічны фактар.

Аднак, як паказвае народная педагагічная практыка, „Аднаго бацькі і аднае маткі не роўныя бываюць дзіцяткі", „Адной маткі ні адныя дзеткі", значыць, галоўнае ўсё ж не спадчыннасць, а канкрэтныя абставіны ў кожнай сям'і („Дзе ў сям'і лад, там і дзеці добра гадуюцца"), усё выхаванне, якое ўбірае разнастайныя выхаваўчыя фактары.

Пэўнасць у заўтрашнім дні залежыць галоўным чынам ад таго, ці добра будзе выхаванае падрастаючае пакаленне, якія маральныя якасці яно набывае: „Што ў дзяцінстве выхаваеш, на тое ў старасці абапрэшся". Правільна наладзіць працэс выхавання можа толькі выхавальнік з высокімі маральнымі якасцямі. „Які павядач, такое і яго апавяданне", таму народ асабліва праніклва і дальнабачна клапоціцца пра падрыхтоўку будучага выхавальніка: „Будзь добрым выслухачам, то будзеш добрым павядачам". Вось непасрэдны і найбольш яркі народны выраз аб пераемнасці пакаленняў.

Пераемнасць у развіцці народнай педагогікі азначае не простае капіраванне, паўтарэнне раз і назаўсёды ўзятага, а свядомае засваенне і ўзбагачэнне сабранага выхаваўчага вопыту, вылучэнне ў ім асноўных поглядаў народа на выхаванне, якія шляхам іх супастаўлення з рэчаіснасцю шліфуюцца і набываюць форму абагульненняў і высноў, пададзеных у выглядзе ідэй. Педагагічная культура народа найбольш выразна адбіваецца ў традыцыйных відах народнай творчасці: у разнастайных відах працоўнай дзейнасці, рамёствах, звычаях, святах, абрадах, гульнях, у прыказках, прымаўках, казках, песнях, былінах, танцах, у народнай музыцы, у творах народнага выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у народнай архітэктуры, народных строях і г. д. Усе віды народнай творчасці могуць быць сродкамі народнай педагогікі.

Такім чынам, народная педагогіка — гэта сукупнасць і ўзаемазалежнасць уяўленняў, поглядаў, меркаванняў, пераканання́ў, ідэй, навыкаў і прыёмаў народа ў галіне выхавання, адлюстраваных у народнай творчасці. Інакш кажучы, народная педагогіка — гэта ўсё з народнай творчасці, што прама або апасродкавана служыць справе выхавання. Пры гэтым народную творчасць варта разглядаць як шырокае і глыбокае паняцце. Шырокае, таму што творчасць гэта ўбірае ў сябе разнастайныя віды працоўнай дзейнасці, рамёствы, традыцыі, звычаі, святы, абрады, вусную народную творчасць, гульні, танцы народа, народнае выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, музыку. Глыбокае, бо, захоўваючы многія спрадвечныя рысы, яно знаходзіцца ў пастаянным развіцці і абнаўленні і, адлюстроўваючы своеасаблівасць кожнага этапа пройдзенага гістарычнага шляху, з'яўляецца нібы люстэркам свайго часу.

У беларускай народнай педагогіцы склаліся наступныя асноўныя рысы (прынцыпы) выхавання: выхаванне ў працы, сувязь з жыццём, з навакольным светам, гуманізм, цэльны і ўсебаковы падыход да выхавання, пераемнасць у выхаванні, заахвочванне ініцыятывы і творчасці дзяцей, непарыўнасць выхаваўчага ўздзеяння.

### Асноўныя сродкі народнай педагогікі

Самым старажытным і апрабаваным сродкам народнай педагогікі выступае праца — абавязковая ўмова і неад'емная частка жыцця чалавека. Гаспадаром ды ўладыкам на зямлі чалавека зрабіла ўсвядомленая і мэтанакіраваная праца. Яна адыграла вызначальную ролю ў фарміраванні і выхаванні чалавека, у перадачы жыццёвага вопыту ад пакалення да пакалення, у развіцці маралі. У працэсе працы адбывалася маральнае, фізічнае, разумовае, эстэтычнае развіццё і выхаван-

не чалавека. Гістарычныя і прыродна-геаграфічныя ўмовы паўплывалі на развіццё характэрных для беларусаў відаў працоўнай дзейнасці, сфарміравалі такія маральныя якасці, як патрыятызм, працавітасць, цярплівасць, настойлівасць у дасягненні пастаўленай мэты, сумленнасць, сціпласць, ашчаднасць, паважлівыя адносіны да людзей працы, да хлеба надзённага. Пад непасрэдным або ўскосным удзелам ва ўсіх відах працоўнай дзейнасці, уласцівых беларускаму народу, ішло фарміраванне беларускага нацыянальнага характару, яго асноўных рыс і прыкмет.

Кажучы пра працу, немагчыма не спыніцца на асаблівай разнастайнасці працоўнай дзейнасці народа – занятках рамёствамі. Рамёствы варта разглядаць як адзін са старажытных сродкаў народнай педагогікі. У першабытным грамадстве былі развіты хатнія рамёствы, якія ўключалі працэс вырабу рэчаў з каменю, косці, дрэва, выраб глінянага посуду, вопраткі. З развіццём грамадства і чалавека, пераходам да аселага ладу жыцця, выдзяленнем земляробства і жывёлагадоўлі ў асобны від працоўнай дзейнасці, развіццё рамёстваў пашыраецца. З'яўляюцца рамёствы на заказ. Развіваюцца кавальская справа, ганчарства, гарбарства, ткацтва, прадзенне, выраб дыванкоў. Гарадскія рамёствы выклікалі з'яўленне новых форм працоўнай дзейнасці, удасканаленне рамесных прылад працы, рост майстэрства рамеснікаў, спецыялізацыю рамеснай вытворчасці, узнікненне новых рамесных спецыяльнасцей. Усё гэта патрабавала перадачы з пакалення ў пакаленне больш складаных, спецыфічных, адпаведных таму ці іншаму віду рамёстваў працоўных навыкаў і, безумоўна, набыцця больш складаных уменняў і навыкаў. Заняткі рамёствамі прывялі да дыферэнцыяцыі працоўнай дзейнасці чалавека, да развіцця больш складаных грамадскіх адносін, а значыць, і да большага развіцця народнай „сістэмы" выхавання.

Разнастайным відам працоўнай дзейнасці чалавек абавязаны з'яўленнем і развіццём мовы. А. М. Горкі з гэтай нагоды пісаў: „Прызнана і даказана, што мастацтва слова нарадзілася ў глыбокай старажытнасці з працэсаў людской працы. Прычынай узнікнення гэтага мастацтва служыла прага людзей да арганізацыі працоўнага вопыту ў слоўных формах, – у формах двухрадкоўяў, „прыказак", „прымавак", працоўных лозунгаў старажытнасці. Мастацтва слова паспявала непасрэдна за працай, у слова ўключаліся пачаткі навукі аб прыёмах барацьбы з варожымі працоўнай дзейнасці людзей супраціўленнямі прыроды (20, 787).

Такім чынам, адным з першых настаўнікаў дзіцяці, найстаражытным і найгалоўным сродкам выхавання, якое ўтварыла шматвяковая выхаваўчая практыка народа, з'яўляецца

роднае слова. Роднае слова – гэта першае, з чым сутыкаецца дзіця ў сваім жыцці. Маці, якая па традыцыі ўводзіць сваё дзіця ў народную мову, не толькі спрыяе развіццю моўнага дара і мыслення маленькага чалавека, але і перадае яму элементы народнай маралі, дапамагае зразумець і засвоіць народную псіхалогію, традыцыі, культуру, духоўныя і маральныя каштоўнасці.

Знаёмства дзіцяці з родным словам найчасцей адбываецца на грунце бытавання вуснай народнай творчасці. Варта адзначыць, што нават ва ўмовах нацыянальна-рэлігійнага ўціску і забароны беларускай мовы просты народ, у асноўным сяляне, быў асноўным захавальнікам беларускага слова, вуснай беларускай паэзіі, ён захаваў асновы беларускай народнасці. Я. К. Карскі пісаў: „Здавалася, мясцовай мове быў пакладзены канец; галоўны сродак праяўлення народнага духу быў адняты... Але... у тыя часы мала звярталі ўвагі на просты народ, які касцеў у цемры невуцтва і жывіў сваё духоўнае жыццё толькі вуснай паэзіяй. А між тым, ён быў і корань, і аснова беларускай народнасці; ён і стаўся галоўным ахоўнікам жывой гаворкі" (31,3).

Вусная народная творчасць – адзін з галоўных сродкаў народнай педагогікі, тая жыватворная крыніца, што сілкуе моцай педагагічную „тэорыю" народных мас. На працягу многіх стагоддзяў яна была своеасаблівым „падручнікам жыцця", перадавала ад старшага пакалення да малодшага вопыт і веды, жыццёвую мудрасць, этыку, погляды на выхаванне і навучанне дзяцей. Акадэмік В. А. Сербента, які даследаваў гісторыю філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі, піша: „У народнай творчасці: у прыказках і прымаўках, казках і песнях працы, загадках і прыпеўках, у міфалогіі, у галашэннях і абрадавых гімнах, казаннях і былінах – ва ўсім тым, што мы сёння адносім да фальклору, варта шукаць першасныя праявы, першыя каліўцы народнай культуры, грамадска-палітычнай, сацыялагічнай, логікавай, эстэтычнай, філасофскай і навуковай думкі" (27, 7).

Адным з найбольш дзейсных сродкаў народнай педагогікі з'яўляюцца прыказкі і прымаўкі. Збіральнік і даследчык беларускага фальклору І. І. Насовіч у „Зборніку беларускіх прыказак" (1874) адзначаў іх велізарную выхаваўчую ролю: „можна дакладна сказаць, што яны складаюць для простага народа маральна-практычную філасофію. Беларусы ўсе факты, усе выпадкі чалавечага жыцця, усе ўчынкі, як добрыя, так і благія, і ўсялякае нават меркаванне пра што-небудзь падводзяць пад мерку прыказак сваіх. Старыя людзі прыказкамі даводзяць моладзі страх Гасподнеў, надзею на Бога і правілы сумленнасці і дабрадзейнасці; навучаюць хатніх быць паважлівымі да старэйшых, быць асцярожнымі ў словах і болей па-

моўкваць, быць ашчаднымі, ахайнымі, працавітымі і цярплівымі да блізкіх. Прыказкі выганяюць забабоны і слабасці, выпраўляюць недахопы" (43, ІІІ).

Прыказкі і прымаўкі выказваюць грамадскую думку з той ці іншай нагоды, у той ці іншай жыццёвай сітуацыі, рэгламентуюць паводзіны чалавека ў межах тых маральных нормаў, што складваліся і фарміраваліся на працягу шматвяковай гісторыі народа. Пра выхаваўчую ролю прыказак і прымавак у жыцці чалавека народ кажа: „Без прымаўкі і прыказкі гаворка, што ежа без солі", „Прымаўкі і прыказкі – мудрай мовы прывязкі".

Як старажытны сродак народнай педагогікі, прыказкі і прымаўкі выконваюць падвойную функцыю: утрымліваюць педагагічныя ідэі і могуць рабіць выхаваўчы ўплыў. Нярэдка гэтыя дзве функцыі супадаюць. Прыказкі і прымаўкі валодаюць велізарнымі выхаваўчымі магчымасцямі.

Ад нараджэння і да смерці спадарожнічаюць чалавеку народныя песні. Ідучы поруч з чалавекам па жыцці, песні адлюстроўваюць асноўныя этапы гэтага жыцця. Народ складае песні, што спрыяюць у працы і радуюць у вольную часіну, мацуюць у шчасці і ў горы. Песня дапамагае скараць ворагаў і прыгнятальнікаў, кліча на барацьбу, надае веры ў перамозе. Песня ўхваляе чалавека, які валодае высокамаральнымі, на погляд працоўнага люду, якасцямі, і высмейвае, а часам нават і праклінае трутняў і здраднікаў. Н. С. Гілевіч пісаў: „Нарадзіўшыся ў глыбокай старажытнасці, у часы яшчэ дагістарычныя, песні суправаджалі жыццё працоўнага чалавека праз стагоддзі, адлюстроўваючы ў паэтычных вобразах і малюнках яго сацыяльнае паходжанне, яго побыт, мараль і светапогляд на кожным этапе гістарычнага развіцця грамадства. ... народныя песні, як і ўся народная паэзія наогул, з'яўляюцца выключна важным сродкам патрыятычнага, сацыяльнага, этычнага і эстэтычнага выхавання моладзі" (19, 6,7).

Беларускія народныя песні маюць у сабе пэўны звод маральных патрабаванняў, выпрацаваных на працягу шматвяковай гісторыі народа. Вельмі дакладна перадае тое прыказка: „Па народнай песні пазнаеш народ".

Сярод іншых сродкаў выхавання не меншае месца займае народная казка. Беларусы кажуць: „Байкі гадуюць дзяцей".

На пачатку дваццатага стагоддзя, гаворачы пра селяніна-беларуса, Я. Ф. Карскі пісаў: „Казкі, як і прыказкі, – гэта свайго роду народная мудрасць, на якую ён спасылаецца ў сваім жыццёвым абыходжанні; па казках ён нават вучыцца маральнасці" (30, 431).

Выхаваўчую вартасць беларускіх народных казак адзначаюць і сучасныя даследчыкі. У прыватнасці, В. В. Казлоў піша:

„Важнасць узнятых у беларускім казачным эпасе сацыяльных і маральных праблем, іх вызначэнне ў духу лепшых вольналюбівых традыцый і прынцыпаў, сціслацць формы і зместу казак, іх эстэтычная і этычная перакананасць ператвараюць беларускія народныя казкі ў своеасаблівы „маральны кодэкс", які сцвярджае перадавыя дэмакратычныя ідэі і погляды" (33, 14).

Яшчэ ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя казкі жылі паўсюдна ў асяроддзі беларусаў. Пад іх уплывам фарміраваўся светапогляд, этычныя ўяўленні. На пачатку нашага стагоддзя даследчык беларускіх народных казак А. К. Сержпутоўскі адзначаў: „Пад уплывам расповедаў, казак, прыказак і іншых прадуктаў вуснай народнай творчасці выпрацоўваецца ці не ўвесь светапогляд: уся жыццёвая мудрасць і ўсе этычныя ўяўленні ... уласцівая чалавеку прага шукаць адказы на жыццёвыя пытанні выпрацавала ў простага чалавека любоў да паданняў, казак і іншых твораў народнай творчасці" (58, II, III).

Аднак нягледзячы на шырокае панаванне казак у штодзённым жыцці беларусаў, лічылася, што не ўсе ўмеюць надаць казцы патрэбнае адценне, узрушыць пачуцці і розум слухачоў, а значыць, зрабіць дастатковы ўплыў на выхаванне. М. Я. Нікіфароўскі наогул сцвярджаў, што „добрая павучальная казка даецца не кожнаму і, каб выслухаць такую, варта пачакаць казачніка" (42, IУ). Казачніка па традыцыі з задавальненнем сустракалі ў кожнай сям'і. Акрамя таго, казачнікі часта знаходзіліся ў дні свят у карчме, дзе спрадвеку любілі беларусы збірацца гуртам і абмяркоўваць найбольш важныя сямейныя і грамадскія пытанні, а таксама хораша, з душою святкаваць народныя святы. У такую „ўстанову" – своеасаблівы клуб – дарослыя бралі дзяцей можа з 5-гадовага ўзросту, а то і значна раней.

Разам з прыказкамі, прымаўкамі, песнямі казкі з'яўляюцца адметным і універсальным маральным кодэксам народа. На працягу многіх стагоддзяў яны з поспехам выкарыстоўваюцца беларусамі ў мэтах выхавання. Беларускія народныя казкі ўвабралі ў сябе ўсю педагагічную „сістэму" беларусаў: у іх знайшлі сваё ўвасабленне ўсе бакі выхавання, разнастайныя педагагічныя ідэі з выхаваўчага вопыту беларускага народа.

Да сродкаў народнай педагогікі належаць і загадкі. Загадкі сціслай і дакладнай слоўнай формай падводзяць вынік назіранням за мноствам жыццёвых праяў, адзначаюць у іх характэрнае і адметнае. Яны належаць да таго жанру фальклору, дзе ў найбольшай ступені праявілася мудрасць народа, яго імкненне да ведаў, цікаўнасць, назіральнасць, кемнасць, дакладнасць і сціслацць выказвання думкі. Каб адгадаць

загадку, трэба добра ведаць вакольны свет, прадметы працы, з'явы прыроды, сямейнае і грамадскае жыццё. Нельга не адзначыць выхаваўчае ўздзеянне загадак. Яны даступныя дзецям, лёгка ўпісваюцца ў разнастайныя гульні, захапляюць і гэтым спрыяюць разумоваму і маральнаму развіццю.

Значнае месца ў выхаванні беларусаў займаюць прыкметы. Нездарма народ кажа: „Без прыкмет ходу нет". М. Я. Нікіфароўскі ў канцы XIX стагоддзя адзначаў шырокае распаўсюджванне народных прыкмет на Беларусі: „Прыкметы, павер'і і ўсе казанні гэтага тыпу не меней каштоўныя, чым казкі, песні, прыказкі, загадкі; але, будучы традыцыйнымі, прыкметы і павер'і больш паўсядзённыя і звыклыя, чым, напрыклад, казкі і песні" (42, ІУ).

Акрамя выхаваўчай каштоўнасці, Нікіфароўскі звяртаў увагу на тое, што прыкметы выклікаюць „прытчавае павучанне, перадачу ўласнага або чужога назірання" (42, ІУ–У). Ён запыняўся на дзейснасці выкарыстання прыкмет як сродку выхавання: „без боязі зняважыць пачуццё годнасці, выйсці з меж прыстойнасці, стары і малы захалуснік знаходзіць шмат матэрыялу і для перадачы, і для слухання, не толькі ва ўрочны час, а ў любы іншы, – можа абмяняцца думкамі і ўражаннямі без пагоні за рыфмаванаю моваю, за гумарам і гладкасцю аповяду" (42, У).

Да старажытных і важных сродкаў народнай педагогікі можна далучыць і гульні – ці не гэта найлепшая зарука для спазнання маленькім чалавекам навакольнага свету? Гульня – школа жыцця. Гуляючы, дзіця знаёміцца з цацкамі, якія даюць яму першыя ўяўленні пра наваколле, колер, памер, пругкасць, вагу. Гэта першая школа вопыту. У гульні дзіця рэалізуе свае жыццёвыя назіранні, капіруе паводзіны людзей, узнаўляе бачаныя ім сітуацыі, сямейны побыт, працоўныя заняткі. Няма ніводнае гульні, якая б не знаходзіла свайго вобразу ў нейкіх сур'ёзных занятках, вобразу, які б не папярэднічаў гульні. Гульні развіваюць памяць, спрыт, фантазію. Усё жыццё беларусаў суправаджаюць народныя гульні, у якіх бяруць удзел і старыя, і малыя. Прастата, даступнасць беларускіх народных гульняў робяць іх незаменнымі памочнікамі ў выхаванні. Яны аднаўляюць лепшыя народныя традыцыі, звычаі, святы, абрады.

Традыцыя – вось той масток, што лучыць пакаленні, своеасаблівы ключ перадачы ад дзядоў-прадзедаў да бацькоў і ўнукаў пэўных устояў, нормаў і правіл паводзін і ўзаемаадносін людзей. Народныя традыцыі – гэта гістарычна сфармаваная і дынамічная катэгорыя, акт творчасці народа ў шырокім сэнсе слова, які ўбірае элементы сацыяльнай і культурнай спадчыны. Традыцыі маюць гістарычны і класавы характар, могуць

быць станоўчымі (прагрэсіўнымі) і адмоўнымі (састарэлымі або рэакцыйнымі). Выхаванне новага чалавека немагчыма без крытычнага ўспрыняцця традыцыйнага выхаваўчага вопыту, назапашанага чалавецтвам.

Звычай – спадчынны стэрэатыпны спосаб паводзін, адзін з рэгулятараў адносін між людзьмі, сродак далучэння да пэўнага сацыяльнага і культурнага вопыту, які перадаецца з пакалення ў пакаленне і рэгламентуе паводзіны людзей. Звычаі захоўваюцца ў побытавай сферы, маралі, грамадзянскіх звычаях. Іх роля вызначаецца сістэмай грамадскіх адносін. Гэтак жа, як і традыцыі, звычаі дзеляцца на станоўчыя і адмоўныя.

Цесна звязаны са звычаем і іншы сродак народнай педагогікі – абрад. Абрад варта разглядаць як пэўныя сімвалічныя дзеянні, абумоўленыя тым ці іншым звычаем. На пачатку XX стагоддзя этнограф М. Доўнар-Запольскі пісаў: „Беларус з вялікаю пашанотаю ставіцца да абраду, для яго абрад – гэта акт свяшчэннадзейства, заснаваны продкамі, асвечаны вякамі, таму і патрабуе да сябе павагі і бездакорнага выканання" (22, 294).

Традыцыі, звычаі, абрады працінаюць усё жыццё чалавека, робяць вялікі выхаваўчы ўплыў на развіццё і фарміраванне падрастаючага пакалення і выконваюць вядучую ролю ў выпрацоўцы светапогляду, вызначаюць паводзіны ў штодзённым жыцці. Асаблівае значэнне ў выхаванні маюць звычаі і традыцыі, звязаныя з сямейным і працоўным жыццём чалавека.

Дзейсным сродкам народнай педагогікі з'яўляецца традыцыя павагі да старэйшых („Паважай старых, бо сам стары будзеш", „Што скажа стары на глум – бяры, малады, на вум", „Бацькоў любі, старых паважай"). Гэтая традыцыя настолькі значная, што можна выдзеліць шэраг поглядаў беларускага народа на ролю старэйшага ў выхаванні і звязаныя з гэтым звычаі і традыцыі: павага да бацькоў; гонар за справы папярэднікаў; легенды і ўспаміны аб продках, што перадаюцца ад старэйшых да малодшых; шанаванне продкаў і адпаведна з гэтым захоўванне сямейных партрэтаў, рэліквій (прадметаў хатняга ўжытку, інструментаў, прылад працы, выробленых роднымі); абрады пахавання і наведванне магіл; выхаванне пачуцця глыбокай удзячнасці бацькам, пачуцці сямейнага, роднаснага гонару (адзінства і непарыўнасць пераемнай сувязі дзядоў – бацькоў – унукаў, выхаванне ў адпаведнасці з запаветамі і пажаданнямі старэйшых, адпаведна канонам маральна-этычных норм, выпрацаваных народам).

Да сродкаў народнай педагогікі належаць і святы. Развіццё матэрыяльна-тэхнічнай дзейнасці чалавека цесна звязана з

развіццём яго духоўнага свету. Чалавек не мог жыць толькі матэрыяльнымі інтарэсамі, ён імкнуўся ўпрыгожыць сваё жыццё: урачыста адзначыць вынікі працоўнай дзейнасці, найбольш важныя падзеі ў грамадскім і сямейным жыцці. Святы з самага пачатку існавання неслі ў сабе адбітак той этнічнай супольнасці, у рамках якой яны фарміраваліся і функцыяніравалі, і вызначаліся асаблівасцямі гістарычнага развіцця народа, яго ладам жыцця, характарам працоўнай дзейнасці, прыроднымі ўмовамі. Народныя каляндарна-аграрныя, сямейныя, рэлігійныя святы адлюстроўваюць своеасаблівасць побыту і культуры народа і ў яскравай эмацыянальнай форме далучаюць да яго ідэалаў. Так, у беларускага народа існуе шмат сямейных свят і абрадаў, звязаных з нараджэннем чалавека, узяццем шлюбу і г. д.; ёсць гадавы цыкл свят і абрадаў земляробчага і жывёлагадоўчага характару (першы выган статка на луг, зажынкі і дажынкі, зімовыя святы і абрады, ад якіх, на думку людзей, залежыць ураджай і прыплод скаціны). Рэлігійныя святы адзначаюць з нагоды нейкай значнай царкоўнай падзеі або ў памяць святых.

Урачыстасць, хараство святочных абрадаў, чысціня адзення і цела, святочна прыбраныя хаты і людзі, песні, музыка – усё гэта стварае прыўзняты, радасны настрой, спрыяльныя ўмовы дзеля маральна-эстэтычнага выхавання, абуджае патрыятычнае пачуццё. На многіх народных святах адбываюцца спаборніцтвы ў майстэрстве, розуме, спрыце, фізічнай моцы. Да гэтага трэба загадзя рыхтавацца. Такім чынам, і падрыхтоўка да свята мае вялікае выхаваўчае значэнне.

**Танец** гэтак жа з'яўляецца адным са старажытных сродкаў народнай педагогікі. Яго з'яўленне звязана з падрыхтоўкай чалавека да разнастайных відаў працоўнай дзейнасці, з імкненнем упрыгожыць свой побыт, выказаць свае адносіны да навакольнага свету. Гісторыя, быт, культура народа знаходзяць свой адбітак у народных танцах. У іх жа ўвасабляюцца асобныя нацыянальныя рысы характару народа, раскрываюцца такія асаблівасці беларуса, як абавязковае валоданне нейкай справай, уменнем, кемнасцю, знаходлівасцю, смеласцю. Танцы вучаць назіраць за з'явамі прыроды і выхоўваюць любоў да роднай зямлі. Жыццярадаснасць, цнатлівасць, імкненне да хараства (арнаментальнае багацце танца), сюжэтнасць, калектыўны характар выканання, мяккі гумар – характэрныя рысы беларускага народнага танца.

Народная педагогіка, такім чынам, мае вялікі арсенал апрабаваных на працягу многіх стагоддзяў эфектыўных сродкаў выхавання і навучання. Мы разгледзелі толькі невялікую колькасць значных, на наш погляд, педагагічных сродкаў.

## Спосабы і прыёмы выхавання ў народнай педагогіцы

Народ выпрацаваў для бацькоў мноства парад-павучанняў па выхаванню дзяцей, сутнасць якіх вызначаецца гэтак: „Умеў дзіця радзіць, умей і вучыць". Ёсць і больш канкрэтныя ўказанні. Так, у народнай педагогіцы існуе сцвярджэнне пра неабходнасць як мага раней пачынаць выхаванне дзяцей: „Хто да чаго прывыкне замаладу, то й на старасці не пакіне", „Не навучыш слухаць маленькім, не паслухае, калі барада вырасце". Больш дакладна пра важкасць уліку ўзроставых асаблівасцей дзяцей у іх выхаванні, пра сутнасць выхавання ў розным узросце народная педагогіка кажа: „Тады дзяцей вучаць, як каля лаўкі ходзяць", „Да пяці год пястуй, як яечка, з сямі – пасі, як авечку, тады выйдзе на чалавечка", „Вучы дзіця, пакуль яно ўпоперак кравацi, а не ўздоўж".

Для беларускага народа характэрны мяккія, і ў той жа час патрабавальныя адносіны да дзяцей. Гэта ўвайшло ў традыцыю. Яшчэ ў дарэвалюцыйныя часіны этнографы адзначалі, што „У беларускай сям'і жорсткае стаўленне мужа да жонкі – з'ява вельмі рэдкая, нават больш за тое – выключная... Гэткія ж мяккія адносіны беларуса да сваіх дзяцей. Бацька і маці любяць сваіх дзяцей, і ў вялікай сям'і праца дзяцей па магчымасці аблягчаецца. Калі вы спытаецеся ў селяніна, як дзеці павінны ставіцца да бацькоў і да старэйшых наогул, ён вам растлумачыць, што дзеці мусяць слухацца бацькоў, дзяцей няможна „распускаць" і інш., але ўсе гэтыя правілы побытавай маралі не праяўляюцца ў адносінах да дзяцей у суровай форме" (22, 20, 21). Такое ж сцвярджэнне мы сустракаем у фальклоры. Вось такімі сродкамі і метадамі раіць народ карыстацца бацькам у выхаванні і навучанні дзяцей: „Не біце дубцамі, навучайце слаўцамі", „Не біце вяроўкамі, навучайце гаворкамі", „Не дзяржы дзяцей пры сабе, бо спесцяцца, разлянуюцца, а аддай іх лепей у навуку; каля людзей патруцца, рабоце навучацца".

Народ вучыць бацькоў выхоўваць дзіця ў строгасці, не пеставаць яго: „З пестуна нічога не будзе", „Хто дзяцей балуець, вяроўку ім на шыю гатуець", „Лепш даглядзі, а за руку не вадзі", „Малому не патурай, а што трэба дай", „Дзе многа нянек, там дзіця без носу".

У выхаванні, як лічыць народ, галоўнае – перакананне: „Куляй пацэліш у аднаго, двух, а трапным словам – у тысячу". Ён супраць кары рэменем: „Не знаець маленькі, адкуль ногі растуць". Калі ж перакананне не дапамагае, раіцца ў выключных выпадках і скарыстаць гэты сродак: „Не слухае ківа, паслухае кія", бо бацькоўскае пакаранне часам нават

вельмі карыснае: „Матка калі б'е, то вучыць". Важным лічыць народная педагогіка і асуджэнне нядобрых дзіцячых учынкаў: „Няшчасныя тыя дзеткі, якіх не жураць ні бацькі, ні маткі". Дзіця мусіць гартавацца ў маральных учынках: „Дзіця, не ўпаўшы, не вырасце".

У той жа час, на думку народа, справа выхавання – вельмі няпростая і цяжкая праца: „Пускаць на свет лёгка, ды на ногі ставіць цяжка", „Дзетак узгадаваць – не курак пасклікаць", „Разумным дзіця не родзіцца". Выхаванне дзяцей – творчая, далікатная, вельмі тонкая справа, дзеля вырашэння якой варта ўлічваць самыя тонкія нюансы: „Калі тонкага дрэва не сагнеш, то тоўстага не адужаеш", „Не слухаў малы, не паслухае і вялікі", „Сваё дзіця бі – шкадуй, на чужое крычы – думай".

Каб дасягнуць поспехаў у выхаванні, людзі па-рознаму ўздзейнічаюць на выхаванне ў залежнасці ад сітуацыі, выбіраючы кожны раз той ці іншы спосаб, свой метад выхавання. У народнай педагогіцы можна вылучыць шмат метадаў выхавання: праца, прыклад і аўтарытэт, назіранне, гульня, наказ, пераконанне, парада, прывучванне, унушэнне, тлумачэнне, расповед, гутарка, іспыт, спаборніцтва, практыкаванне, грамадская думка, ушчуванне, заахвочванне і ўхваленне, благаславенне, асуджэнне, пакаранне, вымова, пагроза, праклён і інш.

Асноўным метадам народнай педагогікі выступае праца. У маленстве гэта ўдзел у працоўных гульнях, у пасільнай працы. У часе працоўнай дзейнасці старэйшае пакаленне перадае малодшаму свой вопыт, майстэрства, звычку працаваць. Падрастаючы, чалавек назапашвае веды, набывае працоўныя навыкі, умельства. Пры гэтым нараджаюцца добрыя працоўныя традыцыі, фарміруецца падмурак маральнасці: працавітасць, патрыятызм, дысцыплінаванасць, пачуццё калектывізму, таварыскасць, ашчаднасць, стaранне, прага да ведаў і інш.

Праца ўзмацняе свой выхаваўчы ўплыў праз прыцягненне розных сродкаў і метадаў народнай педагогікі (прыклад і аўтарытэт старэйшых і вопытных працаўнікоў, грамадская думка, пераконанне, традыцыі, звычаі, разнастайныя віды працоўнай дзейнасці, вусная народная творчасць, прывучванне, спаборніцтва). Асаблівы плён ад працы, калі яна набывае свядомы і творчы характар. Праца адначасова і сродак, і метад выхавання, чым і тлумачыцца яе велізарны выхаваўчы патэнцыял.

Не менш каштоўны метад народнай педагогікі – прыклад і аўтарытэт. Галоўную ролю ў беларускай сям'і традыцыйна выконваў найбольш вопытны член сям'і. Вось як пісаў пра тое этнограф М. В. Доўнар-Запольскі на пачатку нашага стагоддзя:

„Воля бацькі, маці або старэйшага дзядзькі, увогуле самага старэйшага ў сям'і члена, святая для ўсіх хатніх; без яго волі нішто важнае не адбываецца ў сем'ях, пры спрэчках хатнія звяртаюцца па яго парады" (22, 10). Гаспадар дома абкружаны знакамі пашаноты і павагі. Ён „прадстаўнік і ахоўнік дамашняе дабрачыннасці" (22, 10). Пяршынства народжана народнай традыцыяй і побытам. Звычайна гаспадар у сям'і той, хто мае добры практычны вопыт, прыстойны, справядлівы, хто можа служыць прыкладам. Кіруючая сіла старэйшага ў сям'і (главы) найперш вызначаецца яго маральнымі якасцямі.

У народзе існуюць своеасаблівыя эталоны маралі, якія і аказваюць выхаваўчы ўплыў дзякуючы сваёй эмацыянальнай вабнасці, чалавечай дасканаласці. Адлюстраванне людскіх уяўленняў пра якасці дасканалага чалавека можна сустрэць у творах народнай паэзіі, у песнях, казках, прыказках і прымаўках. Аўтарытэтам і прыкладам з'яўляюцца не толькі героі народнай творчасці, але найперш людзі, з якімі сутыкаецца дзіця штодзень. Дзейсным з'яўляецца выхаванне на прыкладзе геройскіх народных подзвігаў, што застаюцца ў памяці людзей і перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

Старажытным метадам народнай педагогікі з поўным правам можна лічыць гульню. У гульні дзеці вучацца разумець навакольны свет, мацуюцца духоўна і фізічна. На самым пачатку выхаванне дзіцяці ідзе шляхам пераймання дарослых. Маленькая асоба спрабуе ўзнавіць убачанае і пачутае ў час сваіх гульняў. Нібы паўтараючы перадгісторыю сучаснага чалавека, які ў далёкім мінулым, каб спазнаць навакольны свет, ішоў ад простага да складанага, ад эмпірычнага вопыту да ўсвядомленых дзеянняў, сучаснае чалавечае дзіця свой першы жыццёвы вопыт пераносіць у гульнявую дзейнасць. У гульнях дзіця ў неназойлівай нязмушанай абстаноўцы замацоўвае свае жыццёвыя назіранні, спазнае навакольны свет, набывае ўменні і навыкі, якія так спатрэбяцца яму потым, у дарослым жыцці. Такое простае і ўсё ж няпростае ўзаемадзеянне дзіцяці з жыццём, што праходзіць цераз гульню, можна вызначыць наступным чынам: найпросты эмпірычны вопыт – гульня – усвядомленае дзеянне.

Вялікае месца ў жыцці дзіцяці займаюць сюжэтныя і ролевыя гульні. У іх адбіваецца гісторыя, традыцыі, звычаі народа, яго працоўная дзейнасць, побыт, культура. Шырока выкарыстоўваецца вусная народная творчасць (казкі, прыказкі, прымаўкі, загадкі, песні, лічылкі). У такіх гульнях дзіця набывае першыя простыя веды па працы, уменні і навыкі, атрымлівае пэўнае маральнае і інтэлектуальнае развіццё.

Гульнявая дзейнасць дзяцей – першыя азы азбукі чалавечых зносін. Беларускі этнограф і педагог Е. Р. Раманаў у свой

час адзначаў: „Гуляючы з аднагодкамі, дзеці вельмі рана і міжволі навучаюцца суадносіць свае паводзіны з паводзінамі іншых, што, у сваю чаргу, мае вартасць у сэнсе ранняга разумення кожным сваіх грамадскіх адносін да іншых” (55).

Увабраўшы ў сябе жыццёвыя сітуацыі са штодзённага жыцця, гульні шляхам шматразовага паўтору гэтых сітуацый развіваюць разумовыя здольнасці, даюць пэўныя веды, прывіваюць працоўнае ўменне, знаёмяць з правіламі і нормамі паводзін, развіваюць фізічна, вучаць разумець цудоўнае.

Выпрабаваным народным метадам выхавання з'яўляецца **ўнушэнне.** Ім шырока карыстаюцца ў сям'і, асабліва ў першыя гады жыцця дзіцяці (калыханкі, прыказкі і прымаўкі, забаўлянкі, казкі). Дзейнічае гэты метад шляхам прамога слоўнага ўздзеяння выхавальніка на выхаванца, калі ўсё, што ўнушаецца, бярэцца на веру. Пры гэтым вызначальную сілу мае аўтарытэт выхавальніка (бацькоў, старэйшых, аднагодкаў). Напрыклад, забаўлянкамі дарослыя перадаюць паняцці маралі. „Сарока-варона” адмаўляецца даць кашы малому за тое, што ён „круп не драў, вады не насіў, дзяжы не мясіў”. Вусная народная творчасць выступае тут у якасці пачатковай формы практычнага ўздзеяння народнай педагогікі.

Адначасова з метадам унушэння па меры таго як расце інтэлектуальны ўзровень дзіцяці ўсё часцей пачынае ўжывацца метад **пераканання** („Куляю пацэліш у аднаго, у двух, а трапным словам – у тысячу”). Тут галоўнае – растлумачыць неабходнасць прытрымлівацца правіл і норм паводзін, замацаваных у маральным кодэксе народа. Перакананне фарміруе маральную свядомасць, якая скіроўвае паводзіны чалавека ў пэўнае рэчышча практычных дзеянняў. Перакананне дапамагае свядома вызначыць сваё месца ў грамадстве і вучыць „узгадняць” свае ўчынкі з грамадскімі інтарэсамі.

Павышае дзейснасць метаду пераканання выкарыстанне народнай творчасці, прыклад аўтарытэтных і вопытных людзей (апошняе – самы моцны аргумент пераканання). Змест і форма пераканання змяняюцца ў залежнасці ад узросту выхаванцаў: калі ў першыя гады жыцця істотны плён даюць прыказкі, прымаўкі, казкі, песні, уласны прыклад бацькоў, то ў больш сталым узросце бацькі звяртаюцца да мацнейшых лагічных доказаў – выхоўваюць на прыкладзе людзей паважаных, на канкрэтных выпадках з жыцця грамадства.

Пэўнае месца ў агульнай сістэме метадаў народнага выхавання займае **парада.** Калі цяжка прыняць нейкае рашэнне, у складанай сітуацыі дзеці звычайна звяртаюцца за парадай да бацькоў, да паважаных, вопытных старэйшых людзей. Парада, падтрымка, умелы накірунак з боку сталага, вопытнага чалавека дае добры вынік у задуманай справе, а меркаванні

некалькіх чалавек адносна аднаго і таго ж пытання дазваляюць выбраць найлепшае рашэнне („Парады патрэбны і мудраму", „Адна галава – добра, а дзве – лепш").

Благаславенне – гэта значыць наказ на дарогу, пажаданне поспехаў, шчасця ў нейкай справе, – таксама метад народнай педагогікі. Благаслаўляюць на працу, на подзвіг, на шчаслівае сямейнае жыццё. Гэтак жа цесна благаславенне лучыцца з наказам, у ім пэўнае настаўленне, просьба, павучанне, нават распараджэнне і загад.

Існуе ў народнай практыцы і такі метад выхавання, як прывучванне. Ён звязаны з выпрацоўкай пэўных звычак, уменняў. Прывучаюць да працы, да выканання норм і правіл паводзін. У прывучванні вельмі важна зацікавіць выхаванцаў прагай да набыцця розных ведаў, навыкаў, майстэрства. Прывучванне адбываецца па-рознаму: у адным выпадку адразу ж ставіцца задача авалодаць пэўнымі ведамі, уменнямі, навыкамі, нормамі паводзін, у іншым робіцца гэта ўскосна.

У народнай педагогіцы ёсць метад практыкавання („Да ўсяго трэба практыка"). Выкарыстоўваецца ён галоўным чынам для замацавання і ўдасканалення набытых ведаў, дзеля ўстойлівых навыкаў і ўменняў і дазваляе мэтанакіравана ўплываць на выхаванне чалавека. Дзеянне метаду практыкавання можна назіраць, калі дзіця выхоўваюць фізічна, вучаць гаварыць, прывучаюць захоўваць распарадак дня, далучаюць да пасільнай працы, замацоўваюць неабходныя веды, уменні, навыкі, правілы паводзін. Метад практыкавання абуджае прывычку да разумовай працы, фарміруе працоўныя навыкі, падштурхоўвае да маральнага самаўдасканалення.

Народныя педагагічныя метады – гэта і слоўныя метады: расповед і гутарка („Не біце дубцамі, навучайце слаўцамі", „Не біце вяроўкамі, навучайце гаворкамі"). Да рэвалюцыі гэтыя метады былі шырока распаўсюджаны. Вось што пісаў беларускі этнограф А. К. Сержпутоўскі: „Тут вусныя аповеды замяняюць усю літаратуру, якою карыстаюцца пісьменныя людзі, і таму маюць велізарнае значэнне ў жыцці простага непісьменнага люду" (58, II).

Слухаючы дарослых, дзіця спазнае прыродныя і грамадскія з'явы, знаёміцца з гісторыяй, з маральнымі патрабаваннямі народа, з народнай творчасцю, з асноўнымі відамі працоўнай дзейнасці людзей, са сваім радаводам. Усё гэта садзейнічае фарміраванню светапогляду, разумоваму развіццю, засваенню маральна-этычных норм і патрабаванняў да паводзін чалавека, выхоўвае найгалоўныя маральныя якасці, дапамагае развіць эстэтычнае пачуццё і густ.

У гутарках, дзе мяркуецца больш актыўны і свядомы ўдзел выхаванца ў пазнанні рэальнага свету, фарміруецца

здольнасць аналізаваць, рабіць высновы і абагульненні, выпрацоўваецца ўстойлівы светапогляд.

Метад назірання таксама вельмі дзейсны ў народнай педагогіцы („Каб не спатыкацца, трэба пад ногі прыглядацца"). Яго развіццё адбывалася раўналежна з развіццём „разумнага чалавека" і такога сродку і метаду народнай педагогікі, як праца. Чалавек фарміраваўся, назіраючы за навакольным светам. Метад назірання назапасіў пэўныя нормы і правілы паводзін, набыткі ў пераўтварэнні прыроды, у фарміраванні светапогляду. Вынікі дзеяння такога метаду знайшлі сваё ўвасабленне ў разнастайных жанрах народнай творчасці – у танцах, песнях, прыкметах, прыказках і прымаўках, загадках, святах, звычаях. Узаемадзеянне і ўзаемапранікненне сродкаў і метадаў народнай педагогікі дазваляе шляхам дамінанты ўзмацніць поспехі педагагічнага ўздзеяння.

Не апошняе месца ў выхаванні мае метад выпрабавання – метад вопытнай праверкі падрыхтоўкі да жыцця. Выпрабаванні надараюцца як і ў паўсядзённым жыцці, так і ў часе правядзення свят, калі наладжваюцца спаборніцтвы, гульні, якія дазваляюць высветліць фізічную вынослівасць, падрыхтоўку да працоўнай дзейнасці, разумовыя здольнасці, спрыт, сілу, веданне маральнага кодэкса народа, звычку рабіць так, як патрабуюць выпрацаваныя народам маральна-этычныя нормы. Выпрабаванні маюць на мэце шырокае выкарыстанне гульняў, загадак, народных песень, танцаў, іншых сродкаў народнай педагогікі. Слова людское тут таксама шмат чаго значыць!

Спаборніцтва – таксама народны метад выхавання. Патрэба ў спаборніцтве закладзена ў чалавеку ад прыроды, з'яўляецца неад'емнай часткай яго паводзін. Гэта праяўляецца ў імкненні перавысіць адзін аднаго ў дасягненні мэты, у майстэрстве, працы, мастацтве. Спаборніцтва ахоплівае ўсе бакі жыцця чалавека, аднак найбольш яскрава назіраецца ў працы. Вельмі важна не забывацца тут на добрае слова, пахвалу, падтрымку – на маладых людзей яны ўплываюць асабліва дабратворна!

Факты і падзеі жыцця асобнага чалавека становяцца здабыткам грамадзян, прадметам абмеркавання, у выніку якога фарміруецца пэўная грамадская думка. Грамадская думка – і сродак, і метад народнай педагогікі, бо, з аднаго боку, яна – сродак духоўнага ўздзеяння грамадства на паводзіны чалавека, а з другога – служыць рэгулятарам паводзін людзей у грамадстве і ўплывае на гэтыя паводзіны.

Дзеянне грамадскай думкі ў кожным канкрэтным выпадку рознае, залежыць ад сітуацыі, ад якасці або рысы характару, якія імкнецца выпрацаваць або заглушыць выхавальнік. Грамадская думка можа падключаць да дзеяння іншыя метады і сродкі выхавання.

Нярэдка, ацэньваючы тую ці іншую з'яву ў жыцці чалавека, народ бярэ гатовыя, усеабдымныя па зместу і форме характарыстыкі (выслоўі, прыказкі, прымаўкі, афарызмы). Гэта, дарэчы, дазволіла выдзеліць вусную народную творчасць у своеасаблівы інструмент рэгуляцыі паводзін чалавека. Чалавек „узгадняе" свае паводзіны з адпаведнай грамадскай думкай.

Сталы метад народнага выхавання – клятва, урачыстае абяцанне, запэўніванне ў чым-небудзь. У змест клятвы звычайна ўкладаюць самае вялікае, самае дарагое для чалавека, тое, што ў ніякім разе нельга згубіць: „Каб я бацькі-маткі не бачыў", „Ды каб маё селішча запуставала", „Ну, каб я так аглядаў жонку, дзяцей сваіх, калі гэта няпраўда (праўда)!", „Клянуся табе дзеткамі сваімі". Той, хто дае клятву, нясе вялікую маральную адказнасць не толькі перад людзьмі, але найперш перад сваім сумленнем. Клятваадступнікі лічацца амаральнымі асобамі. Усё гэта дысцыплінуе і выхоўвае пачуццё абавязку і гонару.

Каштоўны народна-педагагічны метад – метад заахвочвання. Ён выкарыстоўваецца людзьмі даволі часта. Беларускаму народу ўласцівы і такі прыём: бацькі пры чужых людзях стараюцца хваліць дзіця, а не ўшчуваць ды лаяць яго. Гэта, па-першае, выхоўвае пачуццё ўласнай годнасці, а па-другое, жаданне рабіць згодна маральна-этычных канонаў: быць добрым, паслухмяным, старанным, уважлівым і паважлівым да людзей. Заахвочванне назіраецца ў самых розных формах.

У народнай педагогіцы беларусаў утрымліваецца сцвярджэнне пра неабходнасць не песціць дзяцей, а выхоўваць іх у строгасці („З пестуна нічога не будзе", „Хто дзяцей балуець, вяроўку ім на шыю гатуець", „Лепш даглядзі, а за руку не вадзі").

Да народных метадаў выхавання варта аднесці метад асуджэння („Толькі званне, што чалавек", „Было рамясло, ды хмелем парасло"). Гэта – няўхвала чаго-небудзь або каго-небудзь, вымова, ганьба. Народ асуджае, напрыклад, розныя адхіленні ад трывалых норм і правіл паводзін, маральныя заганы.

Нельга абысці моўчкі і такі метад народнага выхавання, як пакаранне. Народ за разумнае пакаранне („Не крычы, а лепей навучы"), ён супраць цялеснага пакарання („Розга – не навука"), але ў неабходным выпадку не асуджае і цялеснае пакаранне („Не слухае ківа, паслухае кія").

Калі іншымі метадамі нічога ў паводзінах змяніць нельга, застаецца такі моцны сродак, як засароміць чалавека. Народ сароміць выпівохаў („залівахa", „апівашына", „майша"), гультаёў („лежань", „валяч", „байбас", „завала"), няўмекаў („нізграбоце", „недалэнга", „мамай").

Рэдка народ звяртаецца да такога выхаваўчага метаду, як праклён, да выказвання найбольшага раздражнення, злосці, і – у выключных выпадках – да асуджэння з поўнай адмовай ад далейшых зносін.

У сістэме народнага выхавання беларусаў на працягу стагоддзяў значнае месца займалі „супрадкі", якія адбываліся на Беларусі ўсюды, пачынаючы з канца лістапада. Асноўныя сельскагаспадарчыя працы на той час былі закончаны, жанчыны і дзяўчаты збіраліся разам. У час „супрадак", вячорак спявалі песні, распавядалі казкі, былі, небылічкі, загадвалі загадкі, гулялі ў розныя гульні.

Да народнай педагогікі належаць і метады запалохвання, пагроз, якія часам набываюць дзівосную фантастычную форму, што звязана са старажытнымі паганскімі забабонамі і прымхамі народа. Так, у сярэдзіне XIX стагоддзя даследчык жыцця беларускага народа П. М. Шпілеўскі, апісваючы народныя павер'і, адзначаў станоўчы выхаваўчы ўплыў на дзяцей і дарослых павер'я пра падпечніка-дамавіка: „Калі нікога няма дома, акрамя дзяцей, ён высоўвае сваю чырвоную галаву і, паварочваючы ёю, бліскаючы вочкамі, страшыць дзяцей, што надта расхадзіліся без бацькоў; да таго ж, ён нічога благога ім не робіць. Затое ўначы падпечнік не дае спакою людзям кепскім, заганным, несумленным, увогуле тым, што зрабілі нейкае злачынства" (65, 29). Ён жа падае прыклад пагрозы: „Разамара б цябе задушыў – які крыкса, каб цябе задушыў Разамара! Які крыкун!" (65, 31). (Разамара – нядобры дух.)

Акрамя пералічаных метадаў, у беларускай народнай педагогіцы ёсць і іншыя: абзыванне, вымова.

## АСНОЎНЫЯ ІДЭІ ВЫХАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ

### Працоўнае выхаванне

ГАЛОЎНЫМ крытэрыем маральнасці ў беларускага народа было і ёсць стаўленне чалавека да працы, яго стараннасць, умельства: „Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш", „Праца не паганіць чалавека, а корміць, поіць і вучыць", „Не той харош, хто прыгож, а той харош, хто для дзела гож", „Праца робіць чалавека разумным".

Дабрабыт сям'і найперш залежыць ад умення працаваць, ад якасці падрыхтоўкі да працы. Гэта асабліва паўплывала на фарміраванне беларускай народнай педагогікі, дзе галоўны прынцып – працоўны, падрыхтоўка да самастойнага працоўнага жыцця, выхаванне ў працы. Праца – ядро беларускай

народнай педагогікі, грунт сямейнага выхавання: „Праца ўсяму галава". Беларускі педагог, этнограф і фалькларыст А. Я. Багдановіч пісаў: „Усе павінны працаваць – вось асноўны пастулат у сялянскіх поглядах на працу" (13).

Клопат народа аб працавітасці маладога пакалення назіраецца задоўга да нараджэння дзіцяці. У радзінных песнях бабка-павітуха павучае мужа парадзіхі:

„Унучак ты мой, галубочак мой,
Не журыся ты, каго божа дасць:
Калі дачушку – швачкаю будзе,
А калі сынка – пісарам будзе" (48, 313).

Такім чынам, хто б ні нарадзіўся, будзе працаздольным, працавітым чалавекам. Гэта галоўная ідэя народа, бо працалюбства – яго вышэйшая маральная сіла.

Першыя працоўныя навыкі, адносіны да працы закладваюцца і фарміруюцца вельмі рана: „Змоладу прывучаць трэба", „Няма чаго глядзець у зубы, а пара прымушаць да работы", „Дзетачка, спі, а дзела помні".

У беларусаў працоўнае выхаванне пачыналася ледзьве не з калыскі. Малое, якое толькі што нарадзілася, маці мусіла браць з сабою ў поле, дзе ў прамежку між работай карміла яго і спявала калыханкі. Дзіця, пачынаючы ўспрымаць, засвойваць навакольны свет, бачыла, як працуюць бацькі, чула песні, якія суправаджалі іх працу, і разам з малаком маці засвойвала працоўныя традыцыі народа, усведамляла сваё асноўнае месца на зямлі – яно ў працы. Выхавальнікамі тут выступалі не толькі маці, непасрэдныя ўласныя назіранні, але і старэйшыя браты і сёстры, якія глядзелі малога па даручэнню бацькоў, былі яго нянькамі.

Першыя цацкі дзяцей ужо арыентавалі на працу і рыхтавалі да працы. Вось як пісаў пра гэта даследчык Е. Р. Раманаў: „Маленькім дзецям робяць каровак. Дзеля гэтага бяруць доўгенькую бульбіну, маленькі малады гарбуз, агурок і да т. п. Унізе ў яе ўтыкаюць пару палачак спераду і пару ззаду. Гэта ногі. Над пярэднімі нагамі зверху ўтыкаюць дзве кароткія палачкі – рогі, а там, дзе заднія ногі, утыкаюць доўгую палачку – хвост. Такіх каровак гоняць у поле, пасуць, кормяць травою..." (54, 587).

Падрастаючы, дзіця ўзнаўляла працоўныя аперацыі дарослых у гульнях (імправізаваныя пераймальныя гульні і народныя гульні „У проса", „У мак"), выхоўвалася, абавязкова дапамагаючы, наколькі магло, бацькам, дзеду з бабай. Яно засвойвала маральны кодэкс працоўнага народа, характэрныя нацыянальныя якасці: працавітасць, ашчаднасць, паважлівае стаўленне да людзей працы, да хлеба, уменне пераадольваць цяжкасці.

З ранніх гадоў хлопчыкі рабіліся памочнікамі мужчын, вучыліся мужна і годна несці цяжар сельскагаспадарчай працы. Яны даглядалі коней, вучыліся кіраваць быкамі ў вупражы, вырабляць нескладаныя прылады працы, асабліва земляробчыя, а таксама санкі, вазы, колы. Дзяўчынкі станавіліся памочніцамі маткам. Побач з дарослымі дзеці старанна рыхтавалі глебу пад пасевы, збіралі ўраджай. М. В. Доўнар-Запольскі пісаў: „Дзеці з малых год выконваюць тыя або іншыя абавязкі па дому, і чым сям'я меншая, тым раней падлетак з сялянскае сям'і знаёміцца з нялёгкай працай. З пяці гадоў дзіця даглядае сваіх маленькіх братоў і сясцёр, з 7–8 – ён ужо пастух, ідзе за возам, з 12 гадоў для хлопчыка пачынаюцца першыя практыкаванні ў земляробстве, ён зграбае сена, барануе, з пятнаццаці гадоў бярэцца за цэп, касу, а яшчэ гады праз два і за саху, так што к 20 гадам ён ужо хлебароб, які прайшоў усе акадэмічныя курсы сялянскай гаспадаркі. Дзяўчына да 16–17 гадоў ведае жаночыя работы. Вядома, інтэнсіўнасць працы падлеткаў цалкам залежыць ад складу і эканамічнага дабрабыту сям'і" (22, 17).

Прывучалі да працы старэйшыя, больш вопытныя, умелыя, мудрэйшыя, звычайна дзяды, бабкі, бацькі, старэйшыя браты і сёстры. Так было на Беларусі заўсёды, са старажытных часоў, пра што сведчаць народныя паданні, казкі, прыказкі, песні, а таксама пахавальныя плачы і галашэнні.

У многіх беларускіх сем'ях працоўнае выхаванне адбывалася мэтазгодна педагагічнай навукі. Дзеці па меры сіл бралі ўдзел у працы дарослых. „Што ў маленстве выхаваеш, на тое ў старасці абапрэшся", – вучыць народ. Грамадская думка заўсёды была на варце працоўнага выхавання дзяцей у сям'і, станоўча ацэньвала дасягнутыя поспехі і асуджала кепска арганізаванае працоўнае выхаванне.

За свой немалы гістарычны шлях беларусы выпрацавалі шэраг звычаяў і абрадаў, якія спрыялі працоўнаму выхаванню дзяцей, мелі пэўны педагагічны зарад. Нягледзячы на тое што большасць з іх страціла сваё ранейшае значэнне, з-за сваёй гістарычнай абмежаванасці амаль не выкарыстоўваецца цяпер на практыцы, тым не менш яны даюць уяўленне аб фарміраванні поглядаў, ідэй, самой сістэмы працоўнага выхавання беларускага народа.

З глыбокай старажытнасці аж да 1917 года пупавіну навародку абразалі на тым прадмеце, які, па павер'і, мусіў бы стаць прыладай працоўнай дзейнасці чалавека ў яго дарослым жыцці. Так, напрыклад, беларускі даследчык М. Я. Нікіфароўскі пісаў напрыканцы XIX стагоддзя: „Пупавіну хлопчыка бабка звычайна абразае на дубовай плашцы, каб ён быў моцны, або на падкладзенай сякеры, каб дзіця потым добра валодала

сякераю, або на кнізе, каб было пісьменнае; пупавіну ж дзяўчынкі абразаюць на альховай плашцы, або на „праніку", „вірцяну", „чаўну", або іншых прадметах, якія ўжываюцца пры „жаноцкіх" работах, каб потым дзяўчынка была „ахвоча да іх" (42, 13). Ён жа апісаў і такі звычай: „Перад другім купаннем наваpодку даецца ў рукі кніга, або кавалак друкаванага аркуша, і пяро, каб дзіця потым было „пісьменнае і разумнае" (1878 г.) (42, 15). Перад хрышчэннем „ля парога хаты, з унутранага боку, кладзецца сякера, піла, долато, кніга і іншыя прадметы, праз якія „кумы" мусяць пераступіць пры выхадзе; па дасягненні сталага ўзросту дзіця па-майстэрску будзе валодаць гэтымі прадметамі" (1877 г.) (42, 19). Пасля „Ката" „калі кума не раз хадзіла „па кумах" і прытым яна – сталая кабета, то ўслед за гэтым яна кладзе на некалькі імгненняў – хлопчыка на „гаспадарскае месца" (на кут), а дзяўчынку – на „загнет", бліжэй да „каня", каб яна потым любіла кухарыць" (1881 г.) (42, 22).

Традыцыйным для беларускага народа было строгае размеркаванне хатніх абавязкаў паміж сямейнікамі, улік індывідуальных і ўзроставых асаблівасцей. Этнографы адзначалі ў пачатку XX стагоддзя: „У сям'і падтрымліваецца самае строгае размеркаванне працы на мужчынскія і жаночыя работы. Мужчынскімі заняткамі лічацца: ворыва, пасеў, баранаванне, касьба, прывоз сена і снапоў з луга і поля, малацьба, догляд жывёлы ўзімку, нарыхтоўка дроў, нарэшце з вырабу адзення – пляценне лапцяў. Жанчыны абавязаны гатаваць ежу для ўсяе сям'і, насіць ваду, пасеяць агарод, зрабіць на ім грады, палоць яго, палоць лён, бульбу, капаць бульбу, рваць лён на полі, прыбіраць каноплі, жаць жыта; ткаць сукно і палатно, шыць бялізну для ўсяе сям'і, глядзець за малочнымі прадуктамі. У завядзёнцы жанчын знаходзіцца выраб бялізны, увогуле вопраткі. Акрамя таго, у вялікіх сем'ях існуе яшчэ больш дробнае размеркаванне працы, адпаведна ўзросту і ўменню членаў. І гэты падзел назіраецца яскрава, асабліва ў вялікіх сем'ях і абшчынах. Але ў малых сем'ях праца мужа, жонкі і дачок часта перамяжоўваецца, і нярэдка сустрэнеш дзяўчыну, якая цудоўна косіць, малоціць, арэ. Ва ўсякім разе гэта выклікана толькі настойлівай патрэбай і без неабходнасці ніхто не ўмешваецца ў працу іншага" (22, 12–13).

У фальклоры беларускага народа таксама адзначаецца падзел працоўных абавязкаў паміж асобнымі пакаленнямі ў сям'і:

„Ой, вясна, дый весёнка, дый весенка,
Што ты нам прынеселка, прынеселка?

– Маладым малодкам – па бердзячку, па бердзячку,
А дзевачкам – па пранічку, па пранічку,
А малым дзеткам – па яечку, па яечку,
А старым дзядкам – па кіёчку, па кіёчку,
Маладым мужчынкам – па плужочку, па плужочку,
А хлопчыкам – па пужачцы, па пужачцы.
Маладым малодкам – красёнцы ткаць,
А дзевачкам – дый палотны бяліць,
Маладым дзеткам з яечкамі гуляць,
Старым дзядкам – на мураўцы сядзець,
Маладым мужчынкам – поле араць,
А хлопчыкам – на пастку гнаць" (48, 71).

Аднак нярэдка правільнаму падзелу працы паміж бацькамі і дзецьмі, а таксама маці і бацькам перашкаджаў погляд, які бытаваў у народнай педагогіцы, але меў негатыўны характар, на размеркаванне працы паміж мужчынамі і жанчынамі: „Рабіць для мужчыны жаночую работу лічыцца нават „непрыстойным" (22, 13).

Старажытным сродкам і метадам працоўнага выхавання беларускага народа лічацца гульні. Яшчэ ў далёкім мінулым ва ўжытку славян шырока былі разнастайныя гульні. Яны давалі веды, прывівалі працоўныя ўменні і навыкі, знаёмілі з грамадска-побытавым ладам, з асаблівасцямі асноўных відаў працоўнай дзейнасці людзей, у прыватнасці з народным сельскагаспадарчым календаром, навучалі маралі працоўных людзей. Беларускія народныя гульні былі цесна звязаны з земляробствам і жывёлагадоўляй – асноўным заняткам беларусаў. Гульні былі неад'емнай часткай жыцця і дарослых, і дзяцей.

З развіццём грамадства гульні паступова выходзяць з побыту дарослых і к канцу XIX – пачатку XX стагоддзя робяцца галоўным чынам заняткам дзяцей і падлеткаў. Аднак асноўная выхаваўчая сутнасць гульняў застаецца тою ж – яны рыхтуюць маладых да працы, гэта своеасаблівая школа працы для дзяцей. Гэта ж адзначалі беларускія этнографы: „Не можа быць спрэчным тое, што большая частка мясцовых гульняў ёсць пераймание і ўзнаўленне сельскагаспадарчых і хатніх прац дарослых, вольнымі ці нявольнымі сведкамі якіх дзеці становяцца з ранніх год" (40, 23–24).

З развіццём грамадства адбываецца колькасная і якасная трансфармацыя гульняў народа. Адны з іх, што адпавядаюць культурным і маральным запатрабаванням, застаюцца ў непахісным стане, іншыя праходзяць творчую перапрацоўку, трэція, што не знаходзяць сабе грунту, знікаюць з шырокага ўжытку, і на змену ім прыходзяць іншыя, яны адпавядаюць духу свайго часу, гістарычнаму моманту.



Многія са старажытных народных гульняў выкарыстоўваюцца ў выхаванні і цяпер, але страцілі сваю асноўную функцыю, функцыю падрыхтоўкі да працы, і служаць мэтай дзіцячых забаў. Іншыя дайшлі да нас у сувязі з іх празрыстасцю і дакладнасцю сюжэта, іх нястратнай прыкладной вартасцю. Гэта, напрыклад, такія народныя гульні, як „Авечачка", „Проса", „Шчупак", „Пацяг", „Гуські". У большасці з іх узнаўляюцца пэўныя працоўныя заняткі (у сімвалічнай форме) і капіруюцца звычкі жывёл. Пра паслядоўнасць працоўных дзеянняў і аперацый у сельскагаспадарчых работах расказваюць гульні „Мак", „У мак", „Шостак", „Рэдзька", „У рэпку", „Садзім бульбу", пра заняткі пастуха – „Воўк", „Воўк і авечкі", „Авечкі", „Пастух і авечкі", „У коршуна", „Арол", „Гусі". Галоўная ж вартасць народных гульняў у тым, што яны ўяўлялі сабой прасцейшую азбуку працоўных уменняў і садзейнічалі фізічнаму і маральнаму развіццю дзяцей.

Многія спрадвечна народныя гульні беларусаў (агульнамасавыя і карагодныя) суправаджаюцца прыпеўкамі, прыказкамі, прымаўкамі, якія выконваюць яе ўдзельнікі. І вядома ж, змест такой народнай паэтычнай творчасці звязаны з якой-небудзь сферай працоўнай дзейнасці. Напрыклад, ёсць у беларусаў такі цікавы звычай – у пэўны дзень наладжваць гульню „Жаніцьба Цярэшкі". Гульня суправаджаецца вясёлай песняй, дзе ў жартоўнай форме пяецца пра суджанага. Разам з тым гэтая гульня спрыяе выхаванню ў маладых людзей правільных адносін да працы, маральна рыхтуе да яе, выхоўвае працалюбства. У песні шмат увагі надаецца разнастайным працоўным заняткам, уменню дзяўчыны:

„Пайду я прасны глядзець,
Як мая міла прадзець
Тоненька-танюсенька,
З пальчыкам раўнюсенька...
Пайду я кароў даіць...
Пасядзі, дзедка, у кутку,
Пакуль я кросенцы вытку.
Выткаўшы, бяліць буду,
Выбеліўшы, шыць буду...
Пастаі, мой мілы, у кутку,
Пакуль я кашульку вытку
Белу-бяленькую,
Тонкую-таненькую" (7, 596–597, 560).

Вызначальны момант у выбары ролевых і сюжэтных гульняў, гульняў-перайманняў, імітацый мае прыклад і аўтарытэт бацькоў. Дзеці, назіраючы за жыццём і працай старэйшых,

прыдумляюць сабе гульні на грунце набытага вопыту Усё, што прыкмецілі ў жыцці, усё, што іх цікавіць, праходзіць праз прызму яшчэ няўстойлівай дзіцячай свядомасці, дзе найбольшы аўтарытэт – гэта аўтарытэт бацькоў, старэйшых, – усё гэта знаходзіць сваё непасрэднае ўвасабленне ў гульнях. Праз іх набываюцца і замацоўваюцца пэўныя працоўныя веды, уменні і навыкі, любоў да творчасці, да справы, якую робіш, фарміруюцца паважлівыя добрыя адносіны да людзей-працаўнікоў, да чалавека наогул. Вось як адзначаў такі факт на пачатку нашага стагоддзя беларускі этнограф і педагог М. Ануфрыеў, які шмат увагі надаваў вывучэнню беларускіх народных гульняў, іх апісанню, выкарыстанню на практыцы: „Як па прадмету і зместу, так і па знешніх абставінах вясковыя гульні блізка сутыкаюцца са знешнім побытам сельскіх жыхароў і з іх хатняй абстаноўкай... Малыя дзеці, ад двух да сямі гадоў, у сваіх забавах імітуюць старэйшых, па-свойму ўзнаўляюць іх прылады працы і саму працу Хлопчыкі імітуюць мужчын, дзяўчынкі – жанчын” (45, 88).

Велізарны ўплыў на фарміраванне асобы робіць прыклад і аўтарытэт бацькоў. Пра гэта сведчыць увесь шматвяковы вопыт народа: „Якая матка, такое й яе дзіцятка”, „Калі бацька рыбалка, дык і дзеткі глядзяць у ваду” „Што робіць воўк, тое і ваўчаня”

Адна са значных педагагічных традыцый беларускага народа навучанне рамяству: „З рамяством дружыць – у жыцці не тужыць”. Да рамесніцкай працы пачыналі рыхтаваць з малых год. Гэтая традыцыя даволі шырока распаўсюджана ў шэрагу раёнаў Беларусі, асабліва ў месцах, дзе гістарычна склаліся цэнтры асобных рамёстваў і промыслаў Да прыкладу, з даўніх часоў паўсюды існуе ганчарства. У тых сем'ях, дзе ведаюць ганчарную справу, абавязкова перадаюць гэтае майстэрства з пакалення ў пакаленне. Навучаць дзіця ганчарнаму рамяству пачынаюць рана, звычайна з вырабу традыцыйнай гліррянай цацкі. Тут навідавоку адзін з сакрэтаў народнай педагогікі. Для дзіцяці выраб цацкі – гульня, для выхавальніка – спосаб, метад і сродак навучання. Нават само з'яўленне гліняная цацкі невыпадковае. Магчыма, спачатку яна служыла таму каб прывучыць моладзь любіць ганчарную справу знайсці спосаб зацікавіць дзіця рамяством. Пра гэта сведчыць той факт, што выраб гліняная цацкі на Беларусі не зрабіўся самастойным промыслам, а толькі спадарожнічае ганчарству.

Непасрэднае далучэнне да народнай творчасці, цяга ствараць цудоўныя і карысныя рэчы ўласнымі рукамі выхоўваюць працавітасць, любоў да хараства, да родных мясцін і роднага краю, павагу да людзей сваёй зямлі, да прыроды. Спасцігаючы асновы мастацкага рамяства, дзеці далучаюцца да багатых

народных традыцый, засвойваюць сапраўдную школу працы і творчасці. Нават нарыхтоўка сыравіны для працы мае вялікі выхаваўчы сэнс – вучыць быць ашчадным і дбайным гаспадаром, клапатліва, умела ставіцца да прыродных багаццяў.

Значнае месца ў працоўным выхаванні людзей належыць фальклору. На пачэсным пасадзе тут, вядома, – прыказкі і прымаўкі. У іх сканцэнтраваліся асноўныя педагагічныя ідэі і вопыт народа, а таксама велізарныя патэнцыяльныя выхаваўчыя магчымасці.

Цікава прасачыць, як беларускі народ у прыказках і прымаўках выказвае свае адносіны да працоўнага выхавання. На думку беларусаў, праца – гэта грунт, неабходная ўмова для развіцця асобы: „Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш". Вялікая ўвага надаецца падрыхтоўцы да фізічнай і разумовай працы. Беларуская народная педагогіка лічыць фізічнае развіццё чалавека ці не важнейшым фактарам выхавання добрага працаўніка („Абы здароўе, работа будзе"), разглядае фізічную працу ва ўзаемасувязі з працай разумовай („Рукі – да работы, ногі – да ахвоты, галава – да ўсяго", „Работа і корміць, і поіць, і вучыць").

Поспехі ў працоўным выхаванні залежаць ад таго, наколькі рана дзяцей прывучаюць да працы („Дзетачка, спі, а дзельца помні", „Хто змоладу не працуе, той на старасці жабруе"), ад таго, якая цікавасць да працы („Дзе няма ахвоты, там няма работы", „Жаданая праца, як сонца ўзыход"), ад разумення простай народнай мудрасці: праца – аснова шчасця і заможнасці („Хочаш быць шчаслівы, не будзь лянівы", „Хто з работай дружыць, той жыве і не тужыць", „Хто работаю не даражыць, той не будзе шчасліва жыць", „Без працы не будзе шчасця", „Паносіш мазалёў – пад'ясі хлеба").

У працы засвойваюцца прынцыпы маральных уяўленняў народа: „Дзе ні жыві, а працаваць трэба", „Ад работы ўцякаць – дабра не ведаць", „Для чалавека работа – найлепшы лекар", „Не на адну хваробу праца – найлепшыя лекі".

У народнай педагогіцы сфарміраваліся пэўныя маральныя патрабаванні, звязаныя з падрыхтоўкай юнага пакалення да працоўнага жыцця. Напрыклад, беларускі народ патрабуе строга захоўваць распарадак дня, дысцыпліну: „Да ўсякага дзела заўчасна гатоўся", „Кожную справу трэба разжаваць", „Кожная работа сваю пару мае", „Не марнуй часу дарэмна: вясна пройдзе, не вернеш", „Думай з вечара, а рабі з рання", „Рана ўстанеш – многа зробіш", „Хто любіць працаваць, той не стане позна спаць", „Назаўтра не адкладай", „Сон на заўтра адлажы, а работу сёння зрабі", „Што зробіш сёння, не трэба будзе рабіць заўтра", „Спех – людзям на смех", „Што скора, то і не спора", „Дзве работы зараз не зробіш", „Кончыў дзела, гуляй смела".

У прыказках і прымаўках адлюстраваны дэмакратычныя і гуманістычныя ідэалы народа, на грунце якіх вядзецца падрыхтоўка, выхаванне чалавека працай, здольнага стаць адзіным звяном у пераемнай сувязі пакаленняў. Так, народ вучыць, што „Праца і рукі – моцныя зарукі", „Работа нікога не ганьбіць", „Праца чалавека корміць, а лянота псуе", „Дрэва славіцца пладамі, а чалавек працаю".

У працы нараджаецца пачуццё калектывізму, таварыскасці: „Адзін у полі не воін", „Адна пчала многа мёду не наносіць", „Адным пальцам вузла не завяжаш". Сіла людзей у гурце: „Дружна і горы раўняюць", „У калектыве чыстая ніва і багатае жніва".

Беларускаму народу ўласцівыя такія спецыфічныя маральныя якасці, як добрасумленнасць, упартасць у пераадоленні цяжкасцей, асаблівая акуратнасць. Такія маральныя якасці фарміраваліся пад уплывам адпаведных гістарычных умоў працоўнага жыцця народа (заняткі земляробствам, жывёлагадоўляй, рамяством, „лясным промыслам"). У цяперашні час яны сталі ўсеабдымнымі, гэта значыць уласцівыя ўсім бакам маральнага жыцця чалавека. Аднак па-ранейшаму асноўны іх маральны бок непарыўна звязаны з працай, з працоўным выхаваннем, што знаходзіць сваё адлюстраванне ў прыказках: „Цярплівасць і праца ўсё перамагаюць", „Акуратная работа акуратных людзей любіць", „Рабі так, каб сабак не дражніць і людзей не смяшыць", „Сон назаўтра адкладзі, а работу сягонння зрабі", „Не глядзі, каб скора, а глядзі, каб добра".

Народная педагогіка вучыць вызначаць працавітасць па выніках („Якая кудзеля, такая прадзеля"), пераконвае, што пры жаданні кожны можа навучыцца любой справе („Не святыя гаршкі лепяць"). Такі падыход вельмі важны ў працоўным выхаванні, бо дае магчымасць паверыць у свае сілы, надае ўпэўненасці ў сабе. Народная педагогіка сцвярджае, што не трэба баяцца ніякай работы („Вачам страшна, а рукі возьмуцца і зробяць"), працу трэба ўмела спалучаць з вольным часам („Гуляй, ды работу знай").

Дзеля таго каб авалодаць якім майстэрствам, трэба не сядзець склаўшы рукі, а дзейнічаць: „Хто рабіць бярэцца, той і вучыцца". Каб праца давала станоўчыя вынікі, адных ведаў недастаткова, а неабходныя яшчэ розум, кемнасць, уменне: „Добра даць спосаб за жывою галавою", „Дзе сілаю не зробіш, то спосабам", „Не сілаю, то спосабам чалавек усяму на свеце зарадзіць", „Трэба розумам надтачыць, дзе сіла не возьме", „Не сілай ухапі, а розумам".

У форме прыказак і прымавак народ дае веды, якія датычаць асобных відаў працоўнай дзейнасці, напрыклад вядзення сельскагаспадарчых прац: „Днём раней пасееш – тыднем

раней сажнеш", „Землю ўгноіш – добры ўраджай збярэш", „Касі, каса, пакуль раса: раса далоў – каса дамоў", „Прыйшоў Мікола – сей наўкола", „Скаціна не дзівіцца на бога, а дзівіцца на стога", „Выходзь на поле з расой, дык будзеш з ядой". У фальклоры ёсць сцвярджэнне неабходнасці авалодваць прыладамі працы: „Адны́мі рукамі нямнога зробіш" „Без інструмента і лапця не спляцеш", „Без сякеры не цесля, без лапаты не агароднік"

Нярэдка ў часе навучання якому-небудзь рамяству ўжывалі прыказкі і прымаўкі, якія абагульнялі народны вопыт. Яны дапамагалі пры навучанні ткацтву, вырабу дываноў, вышыўцы: „Лішняя нітка палатну завада", „Якая пража, такое і палатно ляжа", „На тонку сарочку трэба доўга пасядзець, а на белу – трэба доўга пастаяць", „Не завязаўшы вузла, першы штрых прапаў". Гэтыя простыя павучанні былі не залішнія, бо ў даступнай, недакучлівай, запамінальнай форме знаёмілі з самымі простымі працоўнымі аперацыямі.

Народная педагогіка арыентуе маладых людзей на правільны выбар прафесіі („Не за сваю справу не бярыся, а за сваёю не ляніся"), вучыць авалодваць прафесійным майстэрствам („Рамясло піць і есці не просіць, а само корміць", „Чалавек без рамяства, як дзеўка без хараства").

Прыказкі і прымаўкі не толькі адлюстроўваюць пэўную педагагічную ідэю, погляд народа на выхаванне, але служаць сродкам і метадам працоўнага выхавання. Велізарнае значэнне ў працоўным выхаванні мае грамадская думка. Народ вучыць: „Не таму слава, хто на язык лёгкі, а таму слава, хто ў справе стойкі", „Добра працуеш – павагу маеш", „Якая справа – такая і слава"

Метад грамадскай думкі цесна звязаны з метадам заахвочвання, пахвалы. Грамадская думка сфарміравала шэраг заахвочвальна-пахвальных параўнанняў у адносінах да працавітага чалавека: „Працавіты, як мурашачка", „Працуе, як машына", „Працуе як вол", „Майстар на ўсе рукі". Так своеасабліва народ не толькі дае адзнаку працоўнай дзейнасці чалавека, але адначасова і стымулюе: выхоўвае працавітасць, жаданне працаваць як мага лепей, каб заслужыць добрае слова. Хаця, бясспрэчна, самае моцнае ўздзеянне, самы большы стымул – гэта прамая ацэнка людзьмі чалавечай працы, прыклад у працы.

Істотныя ў працоўным выхаванні, на думку народа, метад асуджэння, ушчуванне, ганьба тым, хто кепска ставіцца да сваіх працоўных абавязкаў. Вось некаторыя прыклады народнага асуджэння: „На языку – хоць куды, а на працы нікуды", „Працы як з таннага пастуха", „Работы многа, а карысці мала" „Працуе ні за ім, ні перад ім", „Як робіш як

то й выйдзе так", „Абы з рук збыць", „Хутка робіць, але перарабляе доўга", „За сто работ бярэцца, а ні адна не ўдаецца", „Было рамясло, ды хмелем парасло", „Хто ўмее ўсяк, а хто ніяк", „Рана ўстала, ды мала напрала", „Нітку ў іголку не ўвядзе, а ў танцы хораша ідзе". Часта асуджэнне пераходзіць у такую форму, калі народ кляймуе недахопы чалавека: „Лянота жуе чалавека, як іржа жалеза", „Дзе гультай ходзіць, там зямля не родзіць", „Праца чалавека трымае і ўздымае, а гультайства псуе".

Вялікае месца ў працоўным выхаванні беларусаў займаюць народныя песні, асабліва песні каляндарна-абрадавага цыкла, якія ахопліваюць усе бакі гаспадарчай дзейнасці земляроба. Раней яны суправаджалі ўсё яго жыццё. Праца абумовіла з'яўленне народных працоўных песень („Дзе праца, там і песня", „З песняй і работа спорыцца") і зрабіла іх галоўным і неад'емным сродкам працоўнага выхавання. У песнях каляндарна-абрадавага цыкла народ вучыць маладых назіраць за з'явамі прыроды – развіццём расліннага і жывёльнага свету, за тым, як працуюць людзі, як узаемадзейнічаюць з навакольным светам, перадаюць жыццёвы вопыт дзядоў-прадзедаў – земляробаў, арыентуюць на набыццё неабходных працоўных умельстваў і навыкаў, даюць парады, наказы, зычаць дабра і спору ў працы, папярэджваюць, а часам і асуджаюць.

Сярод такіх песень вылучаюцца валачобныя, надзвычай адметныя, яскравыя, змястоўныя – сапраўдны, своеасаблівы нацыянальны здабытак беларусаў. У валачобных песнях ухваляецца чалавек працы, у сціслай і канцэнтраванай форме падае сфарміраваныя ўяўленні аб прыродзе і чалавеку, заснаваныя на шматгадовых назіраннях і вопыце. Праз песні адбываецца знаёмства моладзі з асноўнымі датамі сельскагаспадарчага календара, прыкметамі, што паказваюць на час вядзення гаспадарчай працы:

„Аўдакею – саху ладзіць.
Аляксею – каня гладзіць.
Дабравешчанне заарала
Новай сахой, вараным канём...
Радаўніца сады садзіць,
А другая – памінаець.
Святы Юр'я, сядлай каня,
Сядлай каня варанога,
Едзь у поле, атамкні зямлю,
Пусці расу на ўсю вясну.
Святы Барыс ляды паліць,
Ляды паліць – ячмень сеіць,
А Мікола па межах ходзіць,
Па межах ходзіць, жыта правіць.



2 Зак. 77

Дзе высахла — там падмочыць,
Дзе вымакла — там падсушыць.
Святы шоснік — стаўкі ставіць,
Свята троіца маі ставіць.
А дзевятнік раі ловіць,
Дзесятуха краску даець.
Святы Іван — слаўны каваль:
Аж да Пятра косы точыць.
Пятра, Паўла сена косіць,
У пунькі возіць, стагі ставіць.
А Пеценька сярпы зубіць.
Свята Ілля — стара жняя —
Жыта ў полі зажынаець,
А святы Спас жыта свенціць.
Прачыстая жыта сеіць,
Жыта сеіць, пчолак ладзіць,
Кадкі мёдам наліваець" (48, 95—96).

У валачобных песнях, як нідзе, праявілася педагагічная мудрасць народа, які разнастайныя прыкметы прымяркоўвае да каляндарных дат. Народныя прыкметы звязаны з імем пэўнага святога. Вызначэнне свят сялянамі вялося па царкоўных святцах, звязвалася з рэлігіяй, але ў аснове сваёй зыходзіла з гаспадарчых патрэб чалавека. У песнях падрабязна адлюстраваны ўсе галоўныя этапы сельскагаспадарчай працы, тэрміны іх правядзення. Міфалагічныя персанажы ў песнях (Юр'я, Мікола, Ілля) служаць для вызначэння дат правядзення розных работ, а таксама, каб паказаць, пра што мусіць дбаць у той ці іншы час каляндарнага года добры гаспадар. Змест валачобных песень скіраваны, па-першае, на тое, каб узбагаціць чалавека ведамі, навучыць таму, калі, што і як неабходна рабіць селяніну, а па-другое, паказаць, што адбываецца наяву або апасродкавана, на тое, каб выхаваць чалавека працы.

Валачобныя песні дапамагаюць выхоўваць працавітасць, паважлівыя адносіны да няпроста здабытага ў працы кавалка хлеба. Народ услаўляе старанных дбайных гаспадароў, зычыць ім добрага ўраджаю, распавядае пра паслядоўнасць сельскагаспадарчых прац.

У песнях выкарыстоўваюцца такія педагагічныя метады, як вітанне, услаўленне, пахвала, заахвочванне, ушанаванне добрых працаўнікоў і добрых гаспадароў, наказ, парада выканаць тую або іншую сельскагаспадарчую работу ў пэўны каляндарны тэрмін; заклікаецца быць працавітымі, сумленна ставіцца да кожнай справы, быць дысцыплінаванымі.

Беларускай сістэме працоўнага выхавання здаўна ўласцівы такі метад, як талака – своеасаблівая форма арганізацыі калектыўнай працы, узаемадапамога. Этнографы пісалі: „У гарачыя дні жніва сяляне часам склікаюць „талаку", гэта значыць запрашаюць суседак дапамагчы ў працы... На дажынкі да кожнага гаспадара збіраецца талака, бо ўсе дзяўчаты, якія закончылі жаць у сябе, ідуць дапамагаць суседзям" (22, 311). На талаку звычайна збіраліся сваякі, добрыя знаёмыя, сябры, аднавяскоўцы. Дапамагалі садзіць бульбу, збіраць ураджай, апрацоўваць зямлю, рамантаваць дах, будаваць і паднаўляць хаты. Па традыцыі талака суправаджалася песнямі. Вось прыклад такой песні:

„Талака, талака
Талачылася,
Увесь дзень на полі
Валачылася.
Мы ўвесь гнаёчак
Павыносілі,
На падводачках
Павывозілі,
Да ўвесь гнаёчак
Раскалацілі,
На ручках гнаёчак
Перадзяржалі,
Ножкамі зямельку
Перамералі" (7, 220).

Нягледзячы на цяжар талакоўскіх работ, праца ў гурце суправаджалася жартамі і песнямі, весялосцю, вабіла да сябе моладзь (Глядзі песню „Пусці, пусці мяне, маці, у талаку жыта жаці").

Пэўнае месца ў сістэме працоўнага выхавання беларускага народа аддаецца песням-настаўленням:

„Уставайце, сынкі маладыя,
Ды бярыце павады шаўкавыя,
Залычайце валы, валы палавыя,
Запрагайце ў ярмы, у ярмы залатыя,
Ды арыце зямлю на вяліку сям'ю" (7, 124).

Выхоўваць працавітасць дапамагаюць таксама традыцыйныя беларускія калядныя, шчадроўныя, у якіх праслаўляецца гаспадарлівасць, любоў да працы. Праслаўленне – своеасаблівы метад выхавання, ён з даўніх часоў у пашане і карыстанні беларусаў.

Народ па-майстэрску ўзмацняе выхаваўчы эфект песень, заклікаючы на падмогу такія сродкі, як пахвала, праслаўлен-

не, заахвочванне, што падаюцца ў выглядзе гіпербалізацыі, перабольшання маральна-этычных якасцей, і, найперш, працавітасці, якую маюць гаспадар дома і члены яго сям'і. Асаблівая выхаваўчая сіла песень ад таго, што ў іх спалучаюцца самыя разнастайныя метады народнага выхавання: парада, пажаданне, наказ, заклік, аб'яднаныя адзінай грамадскай думкай як усеабдымным сродкам і метадам выхавання. Выхаваўчы эфект такіх песень яшчэ і ў тым, што ў іх бачыцца залежнасць працоўных поспехаў ад дысцыплінаванасці, добрасумленнасці, старання ды ўмення ўсіх членаў сям'і.

Песні выхоўвалі дзяцей, як кажуць, з пялёнак. Загадкі ў выхаванні выкарыстоўваліся пазней, калі дзеці трохі падрасталі. У беларусаў шмат загадак, у якіх адлюстравана гаспадарчая і працоўная дзейнасць чалавека, яго працоўны і жыццёвы вопыт. Загадкі – як вынік назіранняў, у тым ліку і ў сферы працоўнай. Гэта дазваляе выкарыстоўваць загадкі ў тым узросце, калі ў маленькай істоты ўжо з'явіліся першыя ўяўленні пра навакольны свет і іх трэба развіць і замацаваць. Загадкі вымагаюць ведання найпростых відаў сельскагаспадарчых работ, элементаў працоўнай дзейнасці, простых працоўных аперацый. Трэба ведаць пра ўзаемаадносіны між людзьмі, якія складваюцца ў часе працы.

„Па полі і лузе ходзіць у кажусе" *(Авечка)*,
„Ляцяць гускі, дубовыя наскі, ляцяць і гавораць:
То-То-я! То-То-я!" *(Малацьба цапамі)*,
„Рота няма, а зубы маюцца" *(Граблі)*,
„Гарбаты дзядок усё поле аббегаў" *(Серп)*.

Загадкі вучаць дзяцей назіраць з'явы прыроды і чалавечага побыту, заняткі людзей, прыкмячаць і выдзяляць у іх галоўнае, а праз гэта, безумоўна, спрыяюць выхаванню паважлівых адносін да працы і да людзей-працаўнікоў.

У працоўным выхаванні маладой змены здаўна не апошняе месца належыць народным танцам. У беларусаў ёсць цэлая група танцаў, што заснаваны на працоўных рухах і сельскагаспадарчых работах, а таксама на нацыянальных рамёствах і промыслах („Мельнік", „Бульба", „Таўкачыкі", „Кросны", „Лянок", „Бондар", „Касцы", „Веялка", „Шаўцы", „Чобаты", „Малацілачка"). Гэтыя танцы вельмі ўдалыя з пункту погляду даступнасці, нагляднасці, выразнасці, дакладнасці перадачы працоўных уменняў. Як жа многа цудоўных педагагічных зярнятак у народным танцы „Лянок"! У форме гульні дзеці знаёмяцца з працэсам апрацоўкі льну: сеюць, полюць, рвуць, рассцілаюць, сушаць, абіваюць, прадуць.

Танцы часта суправаджаюцца працоўнымі песнямі, што ўзмацняе іх педагагічную накіраванасць.

Танец „Кросны", напрыклад, спрыяе творчаму авалодванню такім рамяством, як ткацтва, выхоўвае любоў, працавітасць, павагу да гэтага найстаражытнага занятку беларускай вёскі. У ім узнаўляюцца рухі, звязаныя з наладжваннем красён і самім ткацтвам. Мэта танца – заахвоціць маладых да рамяства, азнаёміць з асноўнымі этапамі работы.

Асаблівае месца ў агульнай сістэме працоўнага выхавання беларускага народа займаюць **працоўныя святы**. Па традыцыі народнае свята – важная вяха працоўнага жыцця народа, падсумоўванне вынікаў працоўных дасягненняў. Святы адзначаюцца ад старажытных часоў, маюць асаблівы выхаваўчы эфект у сувязі з тым, што арганічна ўключаюць у сябе ўсемагчымыя метады і сродкі народнай педагогікі. Традыцыйныя працоўныя святы беларускага народа: кірмаш, свята Вясны, зажынкі, дажынкі, свята пасвячэння ў земляробы і іншыя абавязкова маюць элементы народнай абраднасці (дарагіх гасцей, як правіла, вітаюць хлебам-соллю, лепшаму працаўніку даецца права ўзараць першую баразну, зжаць першы сноп, той жа сноп завіваюць і г. д.), гучаць песні, танцы, адбываюцца спаборніцтвы, выпрабаванні на годнасць лепшага майстра сваёй справы, ушанаванне працоўных дынастый і шмат што яшчэ.

## Разумовае выхаванне

У беларускай народнай педагогіцы не апошняе месца адводзіцца разумоваму выхаванню, што з'яўляецца неабходнай умовай фарміравання асобы: „Не кручаны – не рэмень, не вучаны – не чалавек", „Чалавек невучоны, што тапор нетачоны".

Розум – найбольшая чалавечая вартасць: „Па адзежы сустракаюць, а па розуме праважаюць". Такія адносіны да разумовых здольнасцей сфарміраваліся найперш таму, што разумны чалавек, як правіла, добры працаўнік: „У разумнага разумныя і рукі", „У разумнай галавы сто рук". З той жа прычыны страта розуму ўспрымаецца людзьмі як найвялікшае няшчасце: „Без розуму горш, чым без здароўя", „Грошы згубіў – нічога не згубіў, здароўе згубіў – палавіну згубіў, розум згубіў – усё згубіў", „Няма розуму – лічы калека".

У народнай педагогіцы ёсць сцвярджэнне, што разумным дзіця не родзіцца, розум – індывідуальная ўласцівасць асобы, якая фарміруецца ў выніку выхавання і навучання: „Сын мой, ды розум у яго свой", „Бацькоўскім розумам хваліцца няма як", „Хто чаго не дазнаў, той не разумее", „Хто ўсяго дазнаў, той усё пазнаў".

Народная педагогіка вучыць, што разумовае выхаванне – абавязак сям'і: „Хто народзіць дзяцей, той і выхадзіць". Розум

чалавека выступае прадметам сямейнага і родавага гонару, добрай умовай шчаслівага сямейнага жыцця. У фальклоры мы знаходзім пацвярджэнне гэтаму:

„— Ды я ж бы была не таткава доч,
Не таткава доч і не мамкава,
Каб не адгадала гэтых загадак" (48, 117),

„На харошага глядзець хораша, а з разумным жыць лёгка". Пра разумовае выхаванне чалавека клопат пачынаецца ад дзён нараджэння. Сведчанне таму — традыцыйныя зычанні наваротку: „Здароўя яму, быць вумнаму, разумнаму, шчасліваму, багатаму, радзіцелям пацехай ва маладосці, кармільцам іх старасці", „Каб свой розум і навукі далі сыну сілу ў рукі", „Каб табе ў маладосці розуму прыдбала, а ў старасці вочы свяцілі".

Народная мудрасць кажа: „Каб маяму дзіцяці той розум наперадзе, што ў мужыка назадзе, то быў бы чалавек". Прыказка вучыць, што на станаўленне асобы вялікі ўплыў робяць веды, набытыя на працягу жыцця ды вопыту.

Заўважана, што розум, веды неабходныя заўсёды і ўсюды, а найперш у працоўнай дзейнасці: „Без навукі і лапця не сплячеш", „Праца робіць чалавека разумным".

Веды набываюцца ў працэсе навучання, разумовай працы: „Як навучышся, так і ведаць будзеш", „Гуляючы розуму не прыдбаеш". У навучанні вялікая роля адводзіцца тым людзям, ад каго залежыць дзейснасць навучання: „І звяра людзі навучаць, не то чалавека". У навучанні маюць значэнне асабістыя якасці настаўнікаў: „Не навучыўся, не вучы", „Не навучыўся выконваць каманду, не здолееш камандаваць сам", „Сам не ўмееш слухаць, другога не прымусіш", „Сам нічога не знае, а іншых вучыць хоча".

Народная педагогіка вучыць ісці ў навучанні ад простага да складанага („Усе веды з азбукі пачынаюцца"). Вельмі важнай, педагагічна мэтазгоднай і гуманнай з'яўляецца думка народа пра тое, што дзецям неабходна прывіць жаданне вучыцца, зацікавіць іх: „Добра вучыць таго, хто хоча ўсё знаць", „Б'юць таго, хто плача, вучаць таго, хто слухае", „Добра вучыць паслухмянага".

Розум, веды — неабходная ўмова спазнання навакольнага свету: „Навука вочы адчыняе", „Невучоны, што сляпы", „Бачыць вока далёка, а розум яшчэ далей".

У народнай педагогіцы маюцца каштоўныя ўказанні адносна не толькі набыцця ведаў, але і выкарыстання гэтых ведаў на практыцы. У форме прыказкі-прымаўкі гаворка ідзе пра адзінства эмпірычнага і тэарэтычнага пазнання навакольнага свету, пра неабходнасць цеснай сувязі навучання з

жыццём: „Чалавек без практыкі – пчала без мёду", „Адзін добры вопыт важней сямі мудрых павучанняў", „Чаго не можна ўзяць рукамі, хапай галавой", „Дзе розумам не дайду, дык у кніжцы знайду".

У беларускай народнай педагогіцы склаўся пэўны крытэрый ацэнкі разумовага развіцця чалавека. У такой якасці выступае ўменне крытычна ставіцца да ўласных разумовых здольнасцей („Разумны ведамі не выхваляецца") і магчымасць даказаць наяўнасць розуму („Калі ты мудры – перамажы мяне доказам").

У фальклоры паказаны прынцыпы авалодання ведамі: „Век жыві, век вучыся", „Не той многа ведае, хто доўга жыў, а той, хто многа вучыўся", „Не шукаючы – не знойдзеш" (бясконцасць пазнання, актыўнасць у навучанні, удасканальванне ведаў), „Хто пытае, той не блудзіць", „Не саромейся пытаць: болей спытаеш – болей спазнаеш" (цікаўнасць, імкненне да дасканаласці), „Добра таго вучыць, хто хоча ўсё ведаць" (свядомасць, дапытлівасць, прага да набыцця ведаў), „Вучоны без практыкі – пчала без мёду" (сувязь тэорыі з практыкай, вучобы з жыццём), „Не кажы „вучыўся", а кажы, што пазнаў" (трываласць набытых ведаў), „Гады і самі сабой ідуць, а розуму сам набірайся", „На падказку не спадзявайся, а сам добра вучыцца старайся" (самастойнасць), „У людзей пытай, ды свой розум май" (крытычныя адносіны да рэчаіснасці).

У народнай педагогіцы сцвердзілася думка пра неабходнасць перадачы атрыманых ведаў: „Навучыўся сам – навучы іншага". Яна сфарміравалася пад уплывам гістарычных умоў жыцця беларускага народа і сыходзіла з практычнай мэтазгоднасці: у гістарычным мінулым на працягу стагоддзяў беларусы былі ў асноўным пазбаўлены школы, і перадача набытага вопыту, ведаў, умення і навыкаў здзяйснялася галоўным чынам ад старэйшага, больш сталага і вопытнага пакалення да малодшага. З часам гэтая думка набыла новы філасофскі сэнс, узнялася да ўзроўню тэарэтычнага абгрунтавання пераемнай сувязі пакаленняў.

У народнай педагогіцы існуе шэраг сродкаў і метадаў разумовага выхавання на ўсе выпадкі жыцця і на кожны ўзрост. Сярод іх варта вылучыць вусную народную творчасць, якая на працягу стагоддзяў заставалася для працоўных адзінай скарбніцай ведаў пра навакольны свет. Вусная народная творчасць, асабліва прыказкі, прымаўкі, песні, казкі, прыкметы, загадкі – гэта бясцэнная скарбонка народнай мудрасці і ведаў жыцця, той своеасаблівы „падручнік жыцця", цудоўны дыдактычны матэрыял, сродак авалодання і развіцця мовы.

Мова фальклору, зразумелая і блізкая дзецям сваёй простасцю, лаканічнасцю і дакладнасцю, найбольш уплывае на дзіця і складае яго першапачатковую адукацыю. Яна – незаменны матэрыял у авалоданні маўленнем (тут на першым часе асаблівую ролю адыгрываюць пацешкі-забаўлянкі, скорагаворкі, лічылачкі, калыханкі).

Праз вусную народную творчасць дзеці могуць атрымоўваць элементарныя веды, якія тычацца побыту (сямейныя ўзаемаадносіны, абавязкі людзей, асноўныя віды працы па дому, заняткі ў вольны час), звесткі аб культуры (традыцыі, звычаі, веравызнанні, святы), метэаралогіі (розныя прыкметы і з'явы прыроды), сельскай гаспадаркі (знаёмства з сельскагаспадарчымі прыладамі працы, з асноўнымі сельскагаспадарчымі культурамі, часам іх пасадкі, апрацоўкі, збору ўраджаю, з'явамі, якія ўплываюць на правядзенне сельскагаспадарчых прац, астраноміі (нябесныя свяціла, часалічэнне, паняцце года, дня, ночы), геаметрыі (разнастайныя геаметрычныя формы, фігуры). Напрыклад, у прыказках утрымліваюцца веды, якія датычаць земляробства і раслінаводства: „Асот ды лебяда – для палетку бяда", „Без палівання і капуста не расце", „Зямлю не ўгноіш, хлеба не намалоціш", „Калі хоч хлеб меці, то трэба зямліцы глядзеці", „Як скажа зязюля „ку-ку", тады сей на цэлу руку"; гісторыі народа: „Грэўся француз у Маскве, а замярзаў на Бярозе"; біялогіі: „Вясною лісток, увосень сучок"; метэаралогіі: „Зіма снежная – лета дажджлівае"; медыцыны: „Хто пад'еўшы спаць кладзецца, у таго сала завядзецца".

А найпершы сродак пазнання навакольнага свету – песні. У простых і зразумелых дзецям вобразах песні-калыханкі знаёмяць з рознымі з'явамі рэчаіснасці, з простымі правіламі чалавечых адносін, з побытам, з працоўным жыццём людзей, з адносінамі ў сям'і, з правамі і абавязкамі кожнага члена сям'і.

Народныя песні вучаць маральнаму кодэксу беларусаў, рыхтуюць да працы, даюць звесткі пра асноўныя віды працоўнай дзейнасці людзей і пра самыя простыя прылады працы, знаёмяць з асноўнымі правіламі працоўных узаемадачыненняў.

У песнях утрымліваюцца некаторыя звесткі па гісторыі народа, пра яго традыцыі і звычаі.

Пазнаваць з'явы прыроды дапамагаюць песні каляндарнаабрадавага цыкла. Асаблівая роля тут належыць валачобным песням.

Сямейным узаемаадносінам вучаць песні сямейна-абрадавага цыкла, песні радзінныя, вясельныя, пахавальныя. У іх пададзена жыццё чалавека ад нараджэння да смерці. Кожная жыццёвая з'ява знаходзіць свой адбітак і ацэнку ў песнях,

развівае ўяўленні пра навакольны свет. Песні абуджаюць пачуцці, свядомасць, фарміруюць светапогляд.

Велізарную ролю ў разумовым выхаванні іграюць казкі. Гераічны эпас беларускага народа пададзены шматлікімі казкамі пра герояў-асілкаў, ёсць казкі пра жывёл, яшчэ больш чароўных казак. Асобную групу складаюць сацыяльна-побытавыя казкі. І ўсе яны – сведчанне развітой фантазіі народа, яго даволі высокага інтэлектуальнага ўзроўню. Казкі робяць істотны ўплыў на фарміраванне светапогляду, на паводзіны і ўчынкі чалавека. Невыпадкова, мусіць, яшчэ ў пачатку XX стагоддзя этнографы пісалі: „Пры адсутнасці прадпрымальнасці беларус, аднак, вызначаецца моцным развіццём уяўлення і ўражлівасцю... Гэта свет фантазіі, [ён] адбіўся ва ўяўленні беларуса, у яго казках, песнях, абрадах” (22, 279–280).

Казкі пра жывёл вельмі часта ў зразумелых дзецям вобразах даюць уяўленне пра жыццё і ўзаемаадносіны людзей, абагульняюць сацыяльны і працоўны вопыт, назіранні за з'явамі прыроды. У іх на першы план выступаюць праблемы сацыяльнага і маральна-этычнага зместу.

Чароўныя казкі пераносяць у свет фантазіі, дзе героі-асілкі змагаюцца з усялякім злом і гвалтам, увасобленых у непрывабнай форме ў вобразы Цмока, Цуда-Юда, ведзьмы Барабахі, чартоў-злодзеяў. Дужыя, смелыя, сумленныя і бескарысныя, адданыя свайму народу і роднаму краю, героі казак адольваюць зло, гэтым самым фарміруюць у чытачоў і слухачоў вобраз пра чалавека-ідэала, узор для пераймання. Той жа мэце спрыяюць сацыяльна-побытавыя казкі, дзе шмат увагі надаецца жыццю простых людзей, барацьбе з маральнымі заганамі.

Казкі вучаць дапытлівасці, цікаўнасці, будзяць прагу да ведаў, высвечваюць думку пра тое, што розум гартуецца ў самых розных жыццёвых стасунках, праслаўляюць любоў да працы, іншыя высокамаральныя якасці, высмейваюць ляноту, гультайства, дурасць. Асноўны лейтматыў большасці з іх: розумам можна дасягнуць нават больш, чым сілаю! Казкі развіваюць лагічнае мысленне, фантазію, уменне правільна ўспрымаць і ацэньваць учынкі людзей, вучаць сачыць за ходам чалавечай думкі, аналізаваць і абагульняць пачутае і ўбачанае.

Каштоўнасць казак і ў тым, што ў іх створаны жыццёва важныя праблемныя сітуацыі, якія падахвочваюць чалавека да іх развязвання, абуджаюць пазнавальную актыўнасць. Нярэдка ў казках ад адказу на пастаўленае пытанне залежыць жыццё герояў, іх спакой, дабрабыт. Гэта вымушае іх шукаць выйсце са становішча, а заадно развівае душу і думкі таго, хто знаёміцца з казкай.

У народнай педагогіцы ёсць сродкі разумовага выхавання, якія вымагаюць максімальнай напругі розуму, умення арыентавацца ў складанай сітуацыі, вызначыць прычынна-выніковыя сувязі паміж асобнымі фактамі і з'явамі рэчаіснасці і даць правільны адказ. Гэта – загадкі, яны адказваюць на пытанні што, дзе, калі, чаму. У загадках асабліва адбілася мудрасць беларускага народа, яго імкненне да ведаў, цікаўнасць, назіральнасць, кемлівасць, дасціпнасць, выразнасць і сціслась у выказванні думак..

Загадкі загадваюць у тым узросце, калі дзіця ўжо набыло пэўны запас ведаў пра навакольны свет і мае пэўны светапогляд.

Каб адгадаць загадку, трэба ўмець назіраць і ведаць навакольнае жыццё, з'явы прыроды і грамадства, пазнаваць іх у інакш сказанай, загадкавай форме.

Беларускі народ выкарыстоўвае загадкі і ў якасці выпрабавання, вопытнай праверкі разумовых здольнасцей маладых людзей у час правядзення разнастайных народных свят і абрадаў, напрыклад, на „супрадках", на вячорках, падчас вяселля. Пра гэта вельмі яскрава сведчаць народныя вясельныя песні, якія беларусы шчодра аздабляюць загадкамі.

Гульня... Без яе немагчыма ўявіць дзяцінства! Гэта неад'емны спадарожнік жыцця хлопчыкаў і дзяўчынак, гэта гімнастыка розуму. У першыя гады жыцця дзіцяці яна складае аснову ўсёй яго дзейнасці. Гульня маленькай істоты – гэта праца, праз якую яна спазнае навакольны свет, адлюстраваную рэчаіснасць, адносіны да ўсяго, што бачыць, успрымае. Гульні ўплываюць на развіццё мыслення і мовы дзяцей, садзейнічаюць фарміраванню правільнага разумення навакольнага свету, пашыраюць кругагляд, развіваюць уяўленні, памяць. Гуляючы, дзіця робіць першыя разумовыя намаганні, праяўляе свае здольнасці і вынаходлівасць.

У беларусаў ёсць гульні на кожны ўзрост, якія спрыяюць развіццю разумовых здольнасцей. Гэта ўсе ролевыя і сюжэтныя гульні, гульні з правіламі, гульні-перайманні. Многія з іх, як правіла, уключаюць у сябе загадкі, прыказкі, прымаўкі, скорагаворкі. Усе гульні развіваюць назіральнасць, кемнасць, уменне лагічна мысліць, аналізаваць і абагульняць жыццёвыя з'явы, развіваюць памяць, уяўленні. Дарэчы нагадаць, што Е. Р. Раманаў увогуле прапаноўваў у свой час падзяліць усе беларускія народныя гульні на інтэлектуальныя і фізічныя.

Гульні рэалізуюць на практыцы асноўны прынцып народнай педагогікі – прынцып нагляднасці. У іх знаходзіць адлюстраванне прынцып актыўнасці, паслядоўнасці, свядомасці, самастойнасці ў набыцці ведаў

Па меры сталення дзіцяці ў яго разумовым развіцці ўсё большае месца пачынае займаць праца, традыцыі, звычаі, абрады, святы ды іншыя сродкі народнай педагогікі.

У выхаванні разумовых здольнасцей дзяцей выкарыстоўваюцца такія метады, як **назіранне, прыклад і аўтарытэт, гульня, прывучванне, практыкаванне.** Метад назірання, бадай, галоўны: „Адзін добры вопыт важней сямі мудрых павучанняў”, „Каб не спатыкацца, трэба пад ногі прыглядацца”. Назіранне вучыць чытаць кнігу прыроды, разумець прыродныя і грамадскія з'явы, дае веды з галіны працоўнай дзейнасці народа. Тут звычайна дзейнічае абавязковае для народнай педагогікі правіла: нічога не навязваць дзецям сілай, а выхоўваць на аснове прынцыпу ўзроставай мэтазгоднасці, абуджаць у іх цікавасць да атрымання ведаў.

Народная педагогіка, клапоцячыся пра тое, каб паспяхова ўздзейнічаць на выхаванне і фарміраванне падрастаючага пакалення, эмпірычна выкарыстоўвае самыя розныя сродкі і метады выхавання і навучання, творча іх камбінуючы. Гэта дапамагае ўзмацніць – шляхам стварэння дамінанты – вынік выхаваўчага ўздзеяння. У сувязі з гэтым варта адзначыць, што выхаваўчы эфект метаду назірання народ узмацняе з дапамогай выкарыстання народных прыкмет. Навучаючы дзіця назіраць за з'явамі прыроды, народ-выхавальнік абавязкова знаёміць яго з народнымі прыкметамі, заснаванымі на шматгадовых назіраннях і вопыце. Гэта тым больш важна, бо адначасова выхоўвае ў дзецях паважлівыя адносіны да старэйшых, тых, хто стварыў апрабаваныя і дакладныя прыкметы, засцерагае ад сляпой веры ў звышнатуральныя сілы, вучыць любіць і глыбей разумець рэчаіснасць, усведамляць сваю непарыўную повязь з роднай зямлёй, з бацькаўшчынаю.

Гаворачы пра арсенал сродкаў і метадаў разумовага выхавання, нельга не сказаць пра метады разумовага навучання. Народная педагогіка выступае супраць муштры, палачнай дысцыпліны: „Не крычы, а лепш навучы”, „Не біце вяроўкамі – навучайце гаворкамі”.

У больш сталым узросце да разумовага выхавання падключаюцца іншыя **метады: праца, унушэнне, перакананне, тлумачэнне, гутарка.** Усё большую вагу набывае **грамадская думка:** „Заўсёды людзі кажуць: старайся, вучыся, а то дурнем памрэш”. На падмогу спяшаюцца **наказы, парады:** „Вучыся замаладу, то на старасць як знойдзеш”, „Век жыві, век вучыся”, „Парады патрэбны і мудраму”, „Не саромейся пытаць – больш спытаеш, больш пазнаеш”. Нельга не згадаць метад **заахвочвання, пахвалы** („Хоць малады лятамі, ды стары розумам”), **перасцярогі** або **папярэджання** („Не ганарыся званнем, а ганарыся ведамі”, „Калі не навучан, то правучан”).

Важны метад разумовага выхавання – метад асуджэння: „Ні чытаць, ні пісаць, а толькі з гаршкоў хапаць", „Ні бэ, ні чэ не раскажа, нічога не знае", „Век пражыў, а розуму не нажыў", „Барада вырасла, а вума не вынесла".

Аналізуючы разнастайныя метады разумовага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы, нельга не сказаць хаця б у агульных рысах пра тыя веды, што здаўна перадаюцца з пакалення ў пакаленне і належаць да народнай дыдактыкі, якая пачынае дзейнічаць з моманту нараджэння дзіцяці. З дапамогай органаў пачуццяў дзіця ўспрымае навакольны свет. Дарослыя актыўна дапамагаюць развіццю слыху, зроку, пачуццю дотыку (адчування), нюху, смаку. Правяраюць, ці бачыць дзіця, ці чуе, вучаць назіраць за прадметамі, вызначаць іх форму, колер, цвёрдасць, пругкасць, развіваюць смакавыя якасці і да т. п. Вялікую ролю ў гэты час іграе паказванне, прыклад, назіранне. Разам з пазнаннем навакольнага свету развіваецца мова дзіцяці. Дзеці засвойваюць працейшыя правілы паводзін, пачынаюць увасабляць свае жыццёвыя назіранні ў гульні.

Назіраючы за працай дарослых, увасабляючы яе ў гульнях, выконваючы абавязкі па сілах, у тым ліку працоўныя, дзеці назапашваюць першыя ўяўленні і элементарныя паняцці пра навакольны свет. Даючы дзецям працу па сілах, дарослыя тым самым спрыяюць іх разумоваму развіццю, бо менавіта ў працэсе працы дзеці вучацца гаварыць, даведваюцца пра назвы розных прадметаў, дзеянняў, навучаюцца паслядоўнасці працоўных аперацый. Пастулова пашыраецца кола набытых ведаў. Хлопчыкі і дзяўчынкі знаёмяцца са шматстайнасцю відаў працоўнай дзейнасці, вучацца аналізаваць, абагульняць, рабіць дакладныя і правільныя высновы, выкарыстоўваць набытыя веды на практыцы.

Шмат звестак пра розныя віды працоўнай дзейнасці людзей назбірана ў вуснай народнай творчасці. Напрыклад, звесткі па народнай аграноміі ў сціслай і выразнай форме знайшлі сваё адлюстраванне ў народным сельскагаспадарчым календары, у каляндарна-абрадавай паэзіі ў выглядзе разнастайных прыкмет, падказак наконт тэрмінаў вядзення сельскагаспадарчых прац.

Разумоваму выхаванню дапамагае перадача з пакалення ў пакаленне сакрэтаў рамеснага майстэрства. Дагэтуль у некаторых раёнах Беларусі па старой і добрай традыцыі займаюцца разьбою па дрэве, вырабам глінянага посуду, ткацтвам, пляценнем, вышываннем, стварэннем беларускіх нацыянальных строяў. Ёсць цудоўныя майстры, якія ведаюць усе тонкасці

традыцыйных відаў рамёстваў і перадаюць іх маладым. Асаблівая годнасць добрай ткаллі, вышывальніцы, швачкі нацыянальных убораў у тым, што яны не толькі выдатна валодаюць тэхнікай ткацтва, вышыўкі, пашыву адзення, але ўмеюць уласнымі рукамі рабіць усе працоўныя аперацыі, пачынаючы ад пасеву льну, стрыжкі воўны да атрымання гатовых вырабаў.

Дзеля таго каб выхаваць добрых майстрых, дзяўчынак з ранніх гадоў вучылі, як вырошчваць лён, апрацоўваць яго, адбельваць у росах, прасці ніткі, ткаць палатно, фарбаваць яго ў патрэбны колер, як правільна ў адпаведнасці з нацыянальнымі традыцыямі стварыць на тканіне ўзор, зрабіць вышыўку. Прычым падчас фарбавання тканіны або нітак стараюцца карыстацца даўнейшымі рэцэптамі натуральных фарбавальнікаў. Пра тое, што веды гэтыя традыцыйныя для беларусаў, сведчыць хаця б апісанне этнографаў хатніх сродкаў афарбоўкі адзення: „Тутэйшыя майстрыхі даволі добра знаёмыя з фарбаваннем і ўмеюць рабіць гэта дастаткова трывала. Так, рэшткі яечнай фарбы з сандала могуць служыць для атрымання ружовай фарбы; з настою шалупіння з цыбулі атрымліваецца карычневая фарба; кара крушынніка або колер „дыванны" даюць пяшчотна-канарэйкавую афарбоўку, адвар маладых лісцяў бярозы – зялёную і інш. Якая фарба найлепш прыстае да лёну, якая да воўны, як папярэдзіць так званую выцвіласць – складае сакрэт вясковых фарбавальніц" (41, 170).

У агульнай сістэме разумовага выхавання беларусаў ёсць і такі метад, які называецца „лясною навукай". Сюды можна аднесці сабраныя народам і перадаваемыя з пакалення ў пакаленне звесткі пра царства раслін, жывёл, грыбоў, пра арыенціроўку на мясцовасці з дапамогай розных прыкмет і асаблівасцей, уменне правільна вызначыць час па біялагічным „гадзінніку". Раней гэтай навукай валодалі літаральна ўсе сельскія жыхары ад малога да вялікага. Е. Р. Раманаў распавядаў, што перадача ведаў ад старэйшых да малых праходзіла падчас сумесных паходаў у лес, у поле (54, 32).

На аснове шматвяковага вопыту народ ведае, калі трэба пачынаць збіраць грыбы, як адрозніць ядомы грыб ад неядомага, якія грыбы можна выкарыстоўваць як лекі пры розных хваробах. Сельскія жыхары ведаюць усе сакрэты лесу і ніколі не бяруць несапраўдных, атрутных грыбоў. Ніколі не стануць ужываць у ежу белыя паганкі, мухаморы, несапраўдныя апенькі, жоўцевыя або пераспелыя грыбы. У той жа час да некаторых неядомых грыбоў у беларусаў добрае стаўленне. Яны беражліва ставяцца да мухамораў, лічаць іх не толькі спадарожнікамі баравікоў, але і сродкам ад многіх хвароб: хвароб скуры, раўматызму, пухлін, прастуды.

Па традыцыі маладым перадаюцца розныя веды пра жывёльны і раслінны свет, у тым ліку пра ядомыя расліны і жывёлы. Пра шырокую распаўсюджанасць такіх ведаў сярод насельніцтва сведчыць наступны запіс Е. Р. Раманава: „У ежу ў сырым выглядзе, акрамя шчаўя, якое ядуць дзеці, ужываецца яшчэ цыбулька лугавая і часнок палявы, ад першага бярэцца сцябло, а ў другога цыбуліна; потым зайцава капуста (карані) і зайцава шчаўе, – лісты і сцёблы: у аера з'ядаецца сарцавіна ля кораня, сцёблы букавіцы (баранчыкі) і свінух; маладыя атожылкі сасны і кветкі яе, названыя ў народзе шышкамі... Усе пароды дзікарослых ягад ужываюцца як ласункі... траў, ужываных замест чаю, няшмат: іван-чай, або капорскі чай, чай-букавіца, чабор, лісты глогу, кветкі ліпы. Некаторыя з названых раслін ужываюцца ў адвары і як лекавы сродак..." (54, 31).

Народная дыдактыка ўбірае ў сябе і вопыт народнай медыцыны. Веды ў галіне лекавання чалавека і жывёл перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Спрадвеку чалавеку ўласціва імкненне засцерагчы сябе, сваіх родных і блізкіх, а таксама хатніх жывёл ад розных хвароб. Пра гэта яскрава сведчаць замовы, якія дайшлі і да нашых часоў. Вельмі рана ў гісторыі чалавечага быцця людзі навучыліся пазнаваць лекавыя расліны, карыстацца імі. Вопыт народнай медыцыны атрымаў шырокае распаўсюджанне ў асяроддзі простага народа. Мёд, воск, мята, крапіва, палын, бяроза здаўна выкарыстоўваліся беларусамі як дзейсны добры сродак у лячэнні хворых. Не адно стагоддзе беларусы выкарыстоўваюць чагу (наросты на дрэве) для лячэння захворванняў печані і капшучка (жоўцевага пузыра), брусніцы (настой з лісцяў) – для лячэння печані, раўматызму, сухотаў, ад кашлю, пры гастрытах, як мачагонны сродак. Вадзяніку ўжываюць пры галаўным болі,ператамленні, нервовых захворваннях, захворваннях печані і нырак, ад цынгі, дзеля прамывання ран і ўмацавання валасоў. Дурніцы (буякі, галубіцы) – ад цынгі, пры захворванні страўніка, ліхаманцы. Ажына – пры лячэнні кішэчніка, як супрацьгліставы сродак. Суніцы – пры лячэнні печані, нырак, страўніка, прастуды, малакроўі, агульным упадку сіл, пры захворваннях скуры, падагры, павышаным крывяным ціску. Журавіны – як падмацунак арганізму, супрацьцынготны і гарачкапаніжальны сродак, пры ангіне. Пры раўматызме, бранхітах, болях у сэрцы ўжываюць маліну, яна дае добры вынік пры высокай тэмпературы.

Кожная расліна знаходзіла і знаходзіць свой ужытак у народнай медыцыне. Людзі заўсёды ведалі не толькі тое, якія расліны пры якіх хваробах трэба браць, але і ў якім выглядзе іх варта ўжываць, а менавіта якую частку расліны (лісце,

кветкі, плады, трава, корань, насенне, пупышкі, кара), у якой форме (свежыя, адвары, настоі, настойкі, мазі, парашкі), якім часам іх лепш збіраць і апрацоўваць, як захоўваць.

У народнай дыдактыцы маюцца звесткі, што датычаць касметыкі. Яшчэ Е. Р. Раманаў пісаў: „Дзеля знішчэння рабацiння і загару ўжываюць некаторыя сродкі, як, напрыклад, абмыванне твару сырадоем, сыроваткай, агурочным расолам" (54, 26). З касметычнымі мэтамі выкарыстоўваюцца адвары розных траў, сокі ягад, мёд, вяршок (смятанка), агурочны сок

У народнай педагогіцы існуюць элементарныя веды ў галіне хіміі, якія нярэдка звязаны з прыгатаваннем беларускіх нацыянальных страў. М. Я. Нікіфароўскі, апісваючы звычайны для беларусаў спосаб прыгатавання квасу, адзначаў: „Найбольш распаўсюджаным з'яўляецца хлебны квас, які бывае просты і „з-пад-крука". Для першага і другога квасу папярэдне гатуюцца „квасіны" – печыва з вотруб'я, просты адвар апошніх, пацвілы хлеб, або хлебныя скарынкі, недаедкі. „Квасіны" змяшчаюць у кваснік і прапарцыянальна (як 5:1) заліваюць цёплай вадой. Астатняе аддаецца часу... Саламяныя маты на дне квасніка ўтрымліваюць „квасіны" і ў значнай ступені дыстылююць квас" (41, 67).

Народная дыдактыка ўбірае ў сябе веды ў галіне астраноміі, арыфметыкі, геаметрыі, гісторыі, геаграфіі, веданне беларускай нацыянальнай кухні, народнай псіхалогіі, педагогікі. Беларусам увогуле характэрна імкненне да ведаў, адукацыі, нездарма народ лічыць. „Навука вочы адчыняе", „Невучоны, што сляпы", „Хто без навукі, той – як бязрукі", „У каго веды – у таго і сіла"

У 1909 годзе М. В. Доўнар-Запольскі з гэтай нагоды пісаў: „Сяляне, нягледзячы на мноства перашкод, так рупна імкнуліся да адукацыі, што працэнт навучэнцаў сярод іх вышэйшы за працэнтныя адносіны іншых саслоўяў. З'ява гэта невыпадковая; яна падтрымліваецца народам з году ў год" (22, 436).

Народная педагогіка вучыць спалучаць навуковыя веды з эмпірычнымі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне: „І чужому навучайся, ды свайго не цурайся"

### Маральнае выхаванне

У беларускай народнай педагогіцы сфарміравалася сваё паняцце аб ідэале чалавека. Яно адпавядае характару, псіхіцы беларускага народа і вызначаецца асаблівасцямі яго гістарычнага развіцця, прыродна-геаграфічнымі і сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі жыцця. Уяўленні беларусаў аб ідэальным чалавеку зафіксаваны ў шматлікіх прымаўках, прыказках, казках, песнях, што складае ў цэлым маральны кодэкс

народа. Выпрацаваны ідэал чалавека беларускі народ стараецца ўзнаўляць у сваіх нашчадках.

Асноўнай мэтай беларускай народнай педагогікі з'яўляецца выхаванне чалавека, здольнага да актыўнага працоўнага жыцця. Маральная яго прыгажосць праяўляецца ў адносінах да людзей і да працы: „Не цані чалавека па твары, а цані па душы", „Не той харош, хто прыгож, а той харош, хто для дзела гож".

Адной з найважнейшых асобасных якасцей беларускі народ лічыць высокі гуманізм, дабрыню да людзей: „На свет лепш не радзіцца, ніж ліхім чалавекам быць", „А людзям трэба людзьмі жыць". Чалавек павінен быць выхаваным („Не краса чалавека красіць, а характар"), працавітым („Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш"), праўдзівым, сумленным („Не той чалавек, што грошы мае, а той чалавек, што няпраўды не мае"), добрым сябрам („Птушка моцная крыламі, а чалавек дружбаю"", „Чалавек без друга, што яда без солі"), паважлівым да старэйшых („Хто бацькоў шануе, той сабе неба гатуе").

Народны ідэал чалавека знаходзіць сваё адлюстраванне ў шматлікіх песнях. Напрыклад, у каляндарна- і сямейна-абрадавых песнях дзяўчына паўстае перад намі сумленнай, гаспадарлівай, працавітай, гасціннай, прыветлівай, сціплай, добразычлівай, паважлівай да людзей. Жанчына, да таго ж, – добрая гаспадыня, жонка, маці, выхавальніца дзяцей. Гэтыя маральныя якасці складаюць аснову жаноцкасці, жаночай прыгажосці ў вачах беларускага народа.

Юнаку, мужчыну прыпісваюцца такія якасці, як сумленнасць, працалюбства, гаспадарлівасць, стойкасць у пераадоленні цяжкасцей, мужнасць, сіла, смеласць, гасціннасць, паважлівыя адносіны да старэйшых. Мужчына – галава дома, гаспадар, добры муж і клапатлівы бацька. Усе гэтыя якасці кладуць пачатак паняццю мужчынскай маральнай прыгажосці.

Адлюстроўваюцца ўяўленні народа аб якасцях ідэальнага чалавека і ў народных казках, героі якіх працалюбівыя, сумленныя, праўдзівыя, паважаюць родных і старэйшых, валодаюць пачуццём сапраўднай чалавечай годнасці і прыгажосці. Яны бясстрашныя, справядлівыя, уступаюць у адкрытую барацьбу з сіламі зла. Найвышэйшая ўзнагарода для іх – чалавечая ўдзячнасць, памяць і слава ў сэрцах добрых людзей. Асновай асноў маральнасці казачных герояў з'яўляецца беззапаветная любоў да сваёй радзімы, народа. У беларускіх народных казках ёсць узоры як станоўчых герояў (асілкі Іван, Пакацігарошак, удовін сын), вартых павагі і пераймання, так і павучальныя адмоўныя вобразы (Кашчэй Бессмяротны, паганы Цмок, жорсткі і хцівы пан, распусны поп). І тыя, і другія

садзейнічаюць фарміраванню правільнага ўяўлення аб ідэале чалавека. Маральная сіла народных герояў у тым, што яны ўплываюць на эмацыянальную сферу выхаванца, а праз яе – на яго розум, характар, волю і, нарэшце, паводзіны. Таму ў беларускай народнай педагогіцы казкі – гэта адзін з кампанентаў маральнага кодэксу працоўнага народа і дзейсны, эфектыўны сродак выхавання.

Ва ўсіх жанрах вуснай народнай творчасці мы сустракаемся з высокай ацэнкай беларускім народам такой маральнай якасці, як патрыятызм. Патрыятызм, прычым патрыятызм дзейсны, з'яўляецца абавязковай асобаснай якасцю ідэальнага чалавека: „Чалавек без радзімы, што салавей без песні".

У аснове маральнага кодэкса беларускага народа і сістэмы маральнага выхавання ляжаць гуманістычныя ідэалы: вера ў магчымасць маральнага ўдасканалення чалавека, патрабаванне павагі да чалавека і стварэнне ўмоў, неабходных для развіцця асобы. У паўсядзённых узаемаадносінах людзей гуманізм знаходзіць сваё выяўленне ў чалавечнасці. Беларускі народ лічыць чалавечнасць галоўнай маральнай якасцю асобы, разглядае яе шырока, уключае ў паняцце чалавечнасці іншыя маральныя якасці – паважлівыя адносіны да людзей („Бацькоў любі, старых паважай", „Шануй людзей, то і цябе пашануюць", „Старэйшых і ў пекле шануюць"), добразычлівасць і чуласць („Чаго сабе не хочаш, таго і другому не зыч", „Шчыраму сэрцу чужая болька баліць"), самаахвяраванне і любоў („Любі другога, як сябе самога", „Пажыві для людзей, пажывуць і для цябе"), дабрыню („Хто добрага чалавека мінае, той шчасця не мае", „У добрага чалавека заўсёды многа добрых сяброў", „Хто людзям жадае дабра, той палучыць сам сабе заўсягда"), сумленнасць і праўдзівасць („Гаварылі за вочы – гаварыце і ў вочы", „Праўда грубая, ды людзям любая", „Не той чалавек, што грошы мае, а той чалавек, што няпраўды не мае"), гасціннасць („Прымі падарожнага – сам будзеш у дарозе").

Для выпрацоўкі ў падрастаючага пакалення правільнай маральна-каштоўнай арыентацыі і выхавання гуманізму народ карыстаецца разнастайнымі сродкамі і метадамі. Найбольш дзейснае і эфектыўнае – асуджэнне бесчалавечнасці: „Чалавечына! Адна душа ў боце, другая ў жывоце, а трэцця па свеце ходзіць да людзей зводзіць", „На свет лепш не радзіцца, ніж ліхім чалавекам быць".

Этнограф П. В. Шэйн, апісваючы быт беларускага народа ў дарэвалюцыйны час, гаварыў: „Да старэйшых гадамі, як да суседзяў, сяляне нашы як раней, так і цяпер заўсёды ставіліся і ставяцца з павагаю" (64, 92).

На думку народа, павага – да бацькоў, старэйшых, да ўсіх людзей – неабходная маральная якасць чалавека: „Хто бацькоў шануе, той сабе неба гатуе", „Хто бацьку, маці зневажае, той дабра не знае", „Як ты да народа, так і народ да цябе".

Метады, сродкі, прыёмы, якія фарміруюць патрэбу і прывіваюць устойлівы навык паважлівых адносін да старэйшых, вельмі разнастайныя.

З маленства, ад першых год жыцця гэтаму дапамагаюць казкі, песні, прымаўкі, прыказкі і іншыя жанры вуснай народнай творчасці. Пра вялікую павагу да старасці, прыклад і аўтарытэт бацькі дзеда гаворыцца ў казцы „Стары бацька" „А сыны, ужо барадатыя, часта прыходзяць к старэнькаму бацьку пажупіць пра хаджайства ды папытаць старога: калі і дзе што сеяць, як лепш абрабляць поле, як даглядаць цялятак ды ягнят Старэнькі ўсё ім скажа, усяму навучыць".

Бацькі могуць параіць – сцвярджае народ – у любой важнай справе. Напрыклад, у выбары жаніха або нявесты:

„Скажы, татулька, што мне рабіці:
Ці замуж ісці, ці дома быці?
Замуж не ішоўшы – людзям гаворка,
А замуж пайшоўшы – баліць галоўка" (48, 288),
„А пытаўся Колечка
У родненькай мамачкі:
„А мамачка родная,
Ці пара мне жаніцца?
– Пагадзі, не жаніся,
Розуму набярыся,
Розуму айцецкага" (48, 256).

У выхаванні дзяцей:

„Парадзь, айчынка, парадзь,
Як мне гора гараваць,
Дробных дзетак гадаваць?" (48, 226)

Па тым, ці прыслухоўваюцца маладыя да бацькоўскай думкі, ці паважліва яны ставяцца да бацькоў, мяркуюць пра яго выхаванасць. Народ гаворыць: „Добрае дзіця бацькоў мыслі адгадвае".

Выхаванасць дзяцей – лічыць народ – і ва ўменні выказваць падзяку, павагу. Пра тое, што ў беларускага народа развіта пачуццё ўдзячнасці і павагі да старэйшых, сведчаць шматлікія фальклорныя жанры, напрыклад песні, у якіх дзеці дзякуюць сваім бацькам за клопат, за выхаванне:

„Дзякуй, мамачка,
Дзякуй, родная,
за тваё гадаванне" (48, 389).

„Дзякуй, татачка, дзякуй, родненькі,
За тваё гадаванне" (48, 393).

У песні „Ой, пад лесам ды пад высокім" сын адпраўляецца на паляванне, каб здабыць маці каштоўнае футра ў знак падзякі за тое, што:

„Гадавала мяне родна матанька:
Цёмнай ночы не даспаўшы,
Яснай свечы не тушыўшы,
Ачэпак з ножак не спусчаўшы" (" 94).

Паважлівыя адносіны да людзей выхоўвае і грамадская думка. У найвышэйшай ступені яе ўплыў праяўляецца на традыцыйных народных святах. Падчас вяселля маладым спяваюць песню:

„ — А пакланіся, Настасечка, усёй радні,
А пакланіся татку з маткай найніжэй,
Яны ў цябе за ўсю радзімачку даражэй" (48, 362).

Песні і ўвесь вясельны абрад выхоўваюць павагу да родных.

Паважлівыя адносіны да людзей з'яўляюцца зарукай павагі да самога сябе, бо служаць ажыццяўленню пераемнай сувязі пакаленняў: „Хто бацьку шануе, той і дзецям добрую долю гатуе", „Хто бацьку шануе, той сабе неба гатуе", „Паважай старых, бо сам стары будзеш", „Пасадзі на печ дзядулю, цябе ўнукі пасадзяць", „Шануй людзей, то і цябе пашануюць", „Як ты да людзей, так і людзі да цябе".

Напэўна, кожны памятае казку, у якой бацькі кармілі дзядулю асобна ад усіх, з кепскай міскі. Унук, засвоіўшы такія адносіны да старэйшых на канкрэтным прыкладзе, пачаў рыхтаваць старэнькую місачку, каб потым карміць з яе сваіх бацькоў. Мы памятаем заканчэнне казкі: бацькі ўсвядомілі сваю віну і пасадзілі дзядулю разам з усімі за стол, пачалі яго шанаваць. Выхаваўчы эфект відавочны. Прычына заўсёды параджае вынік, асабліва ў выхаванні, пра што і папярэджвае народная педагогіка.

Таго, хто не шануе народную традыцыю паважлівых і клапатлівых адносін да старэйшых і да бацькоў, чакае грамадскае асуджэнне: „Хто бацьку і маці зневажае, той дабра не знае". Народ асуджае тых, хто не клапоціцца аб матэрыяльным дабрабыце бацькоў („Як бацькі кормяць дзетак, то дзеці скачуць, а як бацькі на дзіцячым хлебе, то плачуць"), хто можа фізічна пакрыўдзіць бацькоў („Сохні тая рука, што на бацьку падымаецца"), хто наносіць бацькам маральны ўрон („Хай

таму дзіцятку язык адваліцца, калі на людзях бацьку няславіць").

На выхаванне павагі да старэйшых значна ўплываюць традыцыі і звычаі, звязаныя з пахаваннем, памінаннем, шанаваннем памяці памерлых. Пра добрага і чулага чалавека кажуць: „Добры чалавек быў нябожчык, няхай яму зямля пухам будзе!", пра сумленнага, паважанага ўсімі: „Чэсць яго памяці!", „Чэсць яму ад добрых людзей і ад бацькоўскіх (дзедаўскіх) касцей!". Аб пераемнасці добрых пачынанняў і маральных якасцей памерлага, аб неабходнасці працягу іх у дзецях гаворыцца так: „Няхай яму вечная памяць будзе, але няхай жа і доўга нас чакае", „Няхай ён сваім дзецям сніцца".

Такім чынам, народ выхоўвае любоў і павагу не толькі да чалавека, яго спраў, але і да самога жыцця, вучыць жыць, каб працягвалася справа бацькоў.

Памінанне продкаў у беларусаў прымеркавана да шэрага свят. Яшчэ ў пачатку XX стагоддзя этнографы адзначалі, што па традыцыі гаспадар дома, які карыстаецца асаблівым аўтарытэтам і з'яўляецца захавальнікам дамашняй набожнасці, строга сочыць за выкананнем належных абрадаў і свят. М. В. Доўнар-Запольскі пісаў: „Асабліва важная роля гаспадара там, дзе выказваецца шанаванне душ памерлых продкаў; ён у час „дзядоў" (памінальнага вечара) пасля малітвы кліча душы памерлых „дзядоў, бабак" „на вячэру", адлівае ім частку ежы на стол, ставіць яе за акно на ноч і інш. Падобныя ж абрады адбываюцца і пасля смерці каго-небудзь з членаў сям'і" (22, 10).

Існаваў звычай у гонар памерлага высаджваць дрэва або даваць яго імя нованароджаным.

Народныя галашэнні на памінках, зафіксаваныя ў зборніках фальклору, таксама маюць вялікі выхаваўчы патэнцыял. Вось некалькі ўрыўкаў з пахавальнага плачу жонкі па мужу:

„Мой міленькі дружок,
З кім ты мяне пакідаеш,
Толькі з дробнымі дзеткамі.
Ай, мой жа параднічак,
А мой жа работнічак:
З кім жа астаюся?
Толькі з дробнымі дзеткамі.
З кім жа іх гадаваць буду,
Чым я іх адзяваць буду?
Я ж іх не адзену,
Я ж іх не прыгадую...
Што ж вы, дзеткі, не пытаецесь:
Хто вас будзець гадаваці
І ў салдаты выпраўляці
Без свайго роднага татанькі?

Людскія такі будуць выпраўляць дзетак,
А адна ўдованька, бедная мая галованька,
Нельзя мне і слоўцам нідзе абазвацца
Без свайго дружочка, без вашага татанькі...
Нет майго параднічка, а дзеткам татанькі"
(7, 312).

Тут і смутак жанчыны, што згубіла сябра, дарадчыка і памочніка, і напамінак пра яго працавітасць, і ласка да яго, і клопат маці аб выхаванні дзяцей, і надзея на людзей, якія не пакінуць у бядзе.

У пачатку стагоддзя даследчыкі адзначалі сярод спецыфічных маральных якасцей беларусаў выключную сумленнасць і праўдзівасць. П. В. Шэйн пісаў: „Дадзенае слова сяляне нашы выконваюць дакладна. Яны ў большасці сваёй людзі сумленныя і праўдзівыя" (64, 92).

У беларускіх казках станоўчыя героі – праўдзівыя, сумленныя людзі – заўсёды перамагаюць у барацьбе з сіламі зла і насілля.

Народная педагогіка сцвярджае, што сумленнасць і праўдзівасць – найгалоўныя якасці чалавека: „Не той чалавек, што грошы мае, а той чалавек, што няпраўды не мае". У прымаўках і прыказках – мудрая жыццёвая філасофія народа: „Праўдаю найдалей дойдзеш", „Праўда даражэй за грошы", „На праўдзе свет стаіць". Народ папярэджвае: „Раз няпраўда ці ашука, а сумленню на век мука", „Хлусня, як аліва – выйдзе наверх", „Лгару і праўды не павераць". Вышэйшая маральная адзнака чалавека – у словах: сумленны працаўнік.

Актуальная думка народа і пра тое, што сумленнасць і праўдзівасць павінны праяўляцца ў рэалізацыі слоўных абавязкаў: „Той усягда праў, хто паабяцаў – і даў". У народа ёсць шэраг прымавак і прыказак, якія выхоўваюць гэту маральную якасць: „Будзь смелы не языком, а дзелам", „Больш рабі, а менш гавары", „Не мялі языком, а дзелай дзела", „Работу словам не заменіш", „Не хваліся языком, а хваліся дзелам", „Многа робіць языком, ды мала рукамі", „Хто языком меле, той дурань на дзеле", „Толькі і работы, што піпілу курыць ды батурыць", „Слоў мяшок, а спраў на вяршок", „Слова сказаў – тапаром адсек", „Слова святое".

Самы ж лепшы метад, які народ выхоўвае сумленнасць і праўдзівасць, – гэта прыклад і аўтарытэт, а таксама грамадская думка, якая можа разглядацца і як своеасаблівы сродак выхавання. Народныя казкі, гульні, прымаўкі, прыказкі, быліны, абрады, звычаі, святы выконваюць тут значную ролю.

Беларуская народная педагогіка вялікую ўвагу ўдзяляе выхаванню дабрыні. Дабрыня ўвогуле ўласцівая беларускаму народу. Этнографы з гэтай прычыны кажуць: „Адсутнасць

злапамятнасці ў беларуса рэзка кідаецца ў вочы кожнаму, хто з ім сутыкаецца. Наогул ён валодае лагоднай натурай" (22, 279).

Высока ацэньвае дабрыню народ: „Не шукай красаты, а шукай дабраты", „Хто жонку добру мае, той гора не знае", „Дабро не дакучыць", „Добраму – добрая памяць".

Дабрыня выхоўваецца з дзяцінства. І першае, што закладвае ў дзіцяці аснову дабрыні, – гэта дабрыня маці, яе адносіны да дзіцяці, да навакольнага свету. Добрыя ўзаемаадносіны бацькоў, іх адносіны да дзяцей, да старэйшых, увогуле да людзей – традыцыйныя для беларусаў. У песні беларускі народ спявае:

„Мы старэнькую – шанаваць будзем,
А маленькую – гадаваць будзем" (48, 314).

Прыклад і аўтарытэт бацькоў – неад'емныя ў выхаванні дабрыні, бо „Маладыя ад старых вучацца", добрыя адносіны нараджаюць дабрыню ў адказ. Бацькоўскі прыклад у добрых узаемаадносінах знаходзіць сваё рэальнае ўвасабленне ў дзіцячых гульнях, у адносінах дзяцей да братоў і сясцёр, да бацькоў, равеснікаў, старэйшых, да жывёл і раслін.

Народ заўважыў значнасць добрых узаемаадносін людзей для выхавання падрастаючага пакалення і выпрацаваў асаблівую форму звароту. Беларусы часта звяртаюцца да незнаёмых людзей „сынок", „бацька", „цётачка", „маці". Вось адзін з характэрных прыкладаў, занатаваных у зборніку выказванняў беларускага народа: „Спасіба, табе, сынку, што памог мне".

Для беларускага народа ўвогуле характэрны ласкавыя, добразычлівыя адносіны паміж бацькамі, дзецьмі, сваякамі, суседзямі: „Міла мая дзіцятухна!", „А діцятачка ты маё роднае!", „Мамка, мамынька мая!", „Мамачка, матачка, сахарна губачка!", „Матка мая, кветка, чаго плачаш?", „А татачка ты мой родненькі!", „Бабулька мая, галубка мая!", „Дзядулічка ты мой!", „А мой ты брацічок!", „Сяструлька мая!", „Мая ты цётачка, мая ты залаценька!", „Мая цятунька!", „Родна матачка!", „Суседзька-лебедзька!"

Такі зварот садзейнічае ўсталяванню добрых адносін, фарміруе павагу да старэйшых, сваякоў, бацькоў, выхоўвае найважнейшыя маральныя якасці: дабрыню, добразычлівасць, сардэчнасць, ветлівасць, чуласць, чалавечнасць.

Тая ж мэта і ў народных казак, дзе дабро заўсёды перамагае, у песень, легенд, паданняў, прымавак, прыказак, дзе народ дае ацэнку гэтай маральнай якасці. Павучальныя ў гэтым сэнсе прымаўкі: „Чалавек жыве век, а добрае дзела – два", „Добрага добра і ўспамінаюць", „Калі робіш дрэннае для людзей, то робіш дрэннае для сябе".

Па-рознаму выхоўвае дабрыню народная педагогіка.

Гэтаму служыць ранняе прывучэнне дзяцей да дагляду жывёл і раслін. У сельскай мясцовасці звычайна яшчэ маленькім дзецям даручаюць гадаваць, вырошчваць куранят, ягнят, а старэйшым дзецям – цялят, жарабят. І ў сельскіх, і ў гарадскіх умовах стараюцца, каб у сям'і, дзе ёсць дзіця, жыла якая-небудзь жывёліна – кошка, сабака, птушка. Прычым дзіця абавязана браць пасільны ўдзел у доглядзе.

Выхаванню дабрыні дапамагае і традыцыйнае для беларусаў прыцягненне старэйшых дзяцей да выхавання малодшых. У сем'ях, дзе расце некалькі дзяцей, абавязкова частку клопату аб малых бяруць на сябе старэйшыя браты і сёстры. Гуляючы з малым, забаўляючы яго, расказваючы яму казкі, прывучаючы да працы, аберагаючы яго ад небяспекі, старэйшае дзіця развівае ў сябе самастойнасць, адказнасць за даручаную справу, пачуццё ўласнай годнасці, дабрыню.

Традыцыі беражлівых і паважлівых адносін да бацькоў, старэйшых, традыцыі браць у сям'ю адзінокіх сваякоў, састарэлых, сірот, традыцыі ўзаемадапамогі ў працы служаць той жа мэце – выхаванню дабрыні.

Калі дзеці на бацькоўскім прыкладзе пазнаюць народную традыцыю дабрыні, з іх вырастуць людзі, якія ніколі не пакрыўдзяць чалавека або жывёліну, не зламаюць дрэва.

Літаральна ўсе сродкі і метады народнай педагогікі змяшчаюць у сябе патэнцыяльную магчымасць выхавання дабрыні. Прыцягваючы дзіця да пасадкі дрэва, кустоў, кветак, да пабудовы шпакоўняў, сінічнікаў, да падкормкі птушак і звяроў у зімні час, падбіраючы замёрзлую птушку, кінутае кацяня, бацькі даюць урокі дабрыні, сеюць зерне, якое ў свой час прынясе добрыя ўсходы. У кожнай канкрэтнай сітуацыі разам з іншымі сродкамі выкарыстоўваюцца самыя ўдалыя прымаўкі і прыказкі, прыдатныя ўсюды і заўсёды. У іх ёсць і павучанне („Зробіш людзям дабро – і табе адгодзяць"), і парада, і маральны наказ („Добрае помні, злое забывай"), і адабрэнне („Добрыя людзі на камені і пад камнем, а ліхія каб і на добрай раллі не раслі").

Уважлівая беларуская народная педагогіка і да выхавання дружбы і таварыскіх адносін, бо народ лічыць, што „Чалавек без друга, што яда без солі", „Птушка моцная крыламі, а чалавек дружбаю".

Педагагічныя погляды народа адлюстроўваюцца ў вуснай народнай творчасці. Народныя казкі, песні, прымаўкі, прыказкі, легенды праслаўляюць дружбу. Сімпатыі народа заўсёды на баку тых, хто не здраджвае агульным інтарэсам, хто добразычліва, з павагай і даверліва ставіцца да таварышаў, падтрымліваючы іх. Сапраўдная дружба правяраецца выпрабаваннямі і ўзнагароджваецца. Тыя ж, хто не вытрымаў выпрабаванняў,

прымуць пакаранне. Іх чакае пагарда навакольных, маральная смерць, якая ў вуснай народнай творчасці нярэдка атаясамліваецца са знявагай і фізічным знішчэннем. Вусная народная творчасць — дзейсны сродак выхавання дзяцей у раннім узросце, яна вучыць быць таварышам, згуртоўвае ў калектыў.

На фарміраванне дружбы і таварыскіх адносін уплывае прыклад і аўтарытэт бацькоў, суседзяў, равеснікаў, старэйшых, народных герояў. Калі дзеці бачаць прыклад сапраўднай дружбы, у іх з'яўляецца пільная патрэба мець добрага сябра.

Дзіця атрымлівае першы вопыт узаемаадносін і ў гульнях, і ў сумеснай працы з бацькамі, равеснікамі, старэйшымі дзецьмі. Агульныя інтарэсы, сумесная дзейнасць закладваюць падмурак дружбы. Таму ж служыць прыцягненне старэйшых дзяцей да догляду малых. У адносінах з людзьмі дзіця вучыцца дружыць, пазнае сутнасць сапраўднай і фальшывай дружбы.

Сямейны лад жыцця, сумесная праца, традыцыі, звычаі, абрады, вусная народная творчасць, танцы, святы спрыяюць выхаванню дружбы і таварыскіх адносін паміж старэйшым і малодшым пакаленнямі, паміж равеснікамі, юнакамі і дзяўчатамі.

Педагагічныя ідэі народа аб сутнасці дружбы і таварыскіх адносін найбольш поўна адлюстраваны ў прымаўках і прыказках. З іх дапамогай народ вучыць адрозніваць сапраўдную дружбу ад фальшывай („Не той друг, што мёдам мажа, а той, хто праўду ў вочы кажа"), паказвае сілу і трываласць сапраўднай дружбы („Дружба мацней каменных сцен", „Дружна і горы раўняюць"), асуджае фальшывую дружбу („Той не можа быць другам, хто ў бядзе абыдзе кругам"), пераконвае ў тым, што дружба — зарука перамогі над ворагам („Дзе дружбай даражаць, там ворагі дрыжаць").

Выхаванне калектывізму было важнае ўжо на першых этапах развіцця „разумнага чалавека". Калектывізм — найважнейшы маральны прынцып, сфарміраваны народам: „Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго". Народная педагогіка паслядоўна падводзіць да неабходнасці калектывізму, ідучы ад разумення сутнасці аднаго чалавека да разумення сутнасці аб'яднаных у калектыў людзей: „Адна пчала многа мёду не наносіць", „Аднымі рукамі нямнога зробіш", „Адна галавешка і ў печы не гарыць, а дзве і ў полі не гаснуць", „Там добрая дзея, дзе два арэ, а трэці сее", „У гурце нішто не страшна".

Згуртаванню сям'і, народа дапамагаюць агульныя інтарэсы і жыццёвыя мэты, сумесная праца, а таксама звычаі, абрады, святы, якія падтрымліваюцца сілай народнай традыцыі і грамадскай думкі.

Этнографы адзначалі: „Беларус вызначаецца гасціннасцю" (22, 279). Гасціннасць – спецыфічная маральная якасць беларусаў, высока ацэненая ў народзе: „Госць у дом, бог у дом", „Бліжняга суседа пасадзі ўперад усіх", „Хоць я не багат, а з гасцей рад", „Дарагі не абед, а прывет", „Прымі падарожнага – сам будзеш у дарозе", „Для дарагога госця і вароты насцеж". Змалку фарміруецца гэтая маральная якасць у беларускай сям'і. Дзеці вучацца гасціннасці, назіраючы за ўзаемаадносінамі старэйшых, за іх паводзінамі, знаёмяцца з традыцыямі, звычаямі народа.

Адной з самых неабходных маральных якасцей беларуская народная педагогіка лічыць смеласць: „Смелы і разумны два вякі жывуць", „Хто смел, той і ўмел", „Ад баязні мала прыязні". Фарміруецца гэтая якасць у барацьбе з жыццёвымі непарадкамі („Адважны не баіцца няпраўды"), вучыць быць смелым не на словах, а на справе („Будзь смелы не языком, а дзелам"). Выхаванне смеласці народ цесна звязвае з выхаваннем дзейснай любові да Радзімы, гатоўнасці ўстаць на яе абарону: „Смелага страх не возьме і вораг не паб'е", „Ад смелага смерць бяжыць", „Адвага (смеласць) гарады бярэць".

Беларуская народная педагогіка ўважлівая і да выхавання гонару. Яна вучыць: кожны чалавек мае ўласную годнасць („Кожны свой гонар мае"), якая вызначаецца яго ўчынкамі: „Што заслужыш, то і палучыш", „Як аб табе чуваць, так цябе судзяць".

Пачуццё ўласнай годнасці выхоўваецца з маленства і перш за ўсё праяўляецца ў традыцыйных для беларуса беражлівых і клапатлівых адносінах да дзяцей. Напрыклад, характэрная для беларуса адмова ад цялеснага пакарання дзяцей. Народ вучыць: „Не біце дубцамі – навучайце слаўцамі", „Не біце вяроўкамі – навучайце гаворкамі", „Сваё дзіця бі – шкадуй, на чужое крычы – думай", „Узяў дзіця за руку, матку бярэш за сэрца". Ва ўсіх жыццёвых сітуацыях прынята паважаць натуральнае права кожнага чалавека на ўсведамленне сваёй годнасці. Дзяцей не папракаюць без патрэбы: „Не крычы, а лепш навучы". Пры чужых людзях наогул не асуджаюць і не караюць дзяцей нават словам. Наадварот, нярэдка можна назіраць сітуацыі, калі маці ў прысутнасці староннiх людзей імкнецца пахваліць дзіця. Дарэчы, пры дзецях стараюцца не абмяркоўваць і не асуджаць маральныя заганы блізкіх ім людзей, асабліва бацькоў. Асуджаюць тых, хто непаважліва ставіцца да бацькоў, старэйшых: „Хай у таго дзіцяці язык адваліцца, калі на людзях бацьку няславіць".

З маленства дзіця прывучаецца да думкі, што яно – непарыўная частка сям'і. З ранняга ўзросту яму адводзяць месца за агульным сталом, прывучаюць да пасільнай працы, выхоўваюць у строгасці, прыцягваюць да ўдзелу ў абмерка-

ванні надзённых праблем, звязаных з вядзеннем хатняй гаспадаркі, з паводзінамі астатніх членаў сям'і. Дзякуючы такому выхаванню дзеці рана ўсведамляюць свае правы і абавязкі, разумеюць, што павінны стаць апорай бацькоў у старасці. Пачуццё ўласнай годнасці дапамагае дзіцяці лепш асвоіцца ў навакольным свеце, знайсці сваё месца і асэнсаваць асноўнае прызначэнне ў жыцці, вучыць яго ўзгадняць свае паводзіны з грамадскай думкай, зафіксаванай у маральным кодэксе народа.

Вялікую сілу ў выхаванні годнасці маюць прыклад і аўтарытэт старэйшых, народных герояў, расказы і гутаркі пра высокамаральных людзей, грамадская думка, адабрэнне-заахвочванне і, наадварот, асуджэнне.

Асноўныя ідэі народа, зарыентаваныя на маральную сутнасць годнасці, адлюстроўваюцца ў прымаўках: „У добрай славы шырокія крылы", „Чалавека цэняць па яго рабоце", „Птушку пазнаюць у палёце, а чалавека – па рабоце", „У каго ў пашане не словы, а справы, той заслугоўвае ўсенароднай славы", „Хто аб грамадскім дбае, той і пашану мае".

Выхаванне годнасці заўсёды побач з выхаваннем гонару, бо гонар – больш канкрэтнае выяўленне годнасці, звязанае з грамадскім становішчам, родам дзейнасці і маральнымі заслугамі чалавека. Народ кажа: „Гонар даражэй за грошы", „Беражы адзенне знову, а чэсць змоладу". Выхаванне гонару пачынаецца змалку. Перш за ўсё беларусы клапоцяцца пра фамільны гонар, гонар сваёй сям'і. Гэтаму служаць павага, любоў да сям'і, прызнанне заслуг родных і блізкіх перад сваёй сям'ёй, народам, Радзімай, знаёмства з генеалагічным дрэвам роду – радаводам, прыклад і аўтарытэт сваякоў, варты пераймання, захаванне сямейных архіваў і рэліквій, расказы, гутаркі, успаміны старэйшых пра сямейныя традыцыі і звычаі, уплыў грамадскай думкі, выпрабаванні і спаборніцтвы, у якіх маладое пакаленне павінна не згубіць сямейнага гонару.

Вельмі рана пачынае народ клапаціцца і пра дзявочы гонар. Народ вучыць: „Чэсць дзявочае шчасце беражэ". У паняцце дзявочага гонару народ уключае і нявіннасць, і працавітасць, і павагу да старэйшых, і сціпласць, і пачуццё ўласнай годнасці, і ветлівасць, і чуласць да людзей.

Ёсць у народа і паняцце жаночага гонару. Гонар жанчыны – у тым, каб трымаць сябе строга („Чым кабета стражэй, тым яна даражэй і прыгажэй"), быць працавітай, добрай гаспадыняй, жонкай, маці, выхавальніцай дзяцей.

У паняцце мужчынскага гонару народ уключае працавітасць, гаспадарлівасць, уменне пераадольваць цяжкасці, абараніць свой род, сям'ю, народ, родную зямлю ад ворага, здольнасць узяць на сябе цяжар і нягоды, быць узорным мужам, добрым бацькам.

Прызнае народ і паняцце працоўнага гонару. Народ кажа: „Чэсць яго працы!", калі размова ідзе пра добрага работніка. Працавітасць увогуле ўваходзіць у паняцце гонару для любога чалавека: „Работа не бясчэсціць чалавека, а корміць і поіць", „З работай дружыць будзеш – гонар і славу набудзеш". Пра добрага майстра сваёй справы кажуць: „Майстар на ўсе рукі".

Выхаванне годнасці і гонару, на думку народа, звязана з выхаваннем гордасці – за сваю сям'ю, за сваю працу, за сваіх таварышаў і калектыў, за свой народ, за праяўленне каштоўнай маральнай якасці, за высокамаральны ўчынак, – напрыклад, подзвіг у імя шчасця людзей або міру на зямлі. Народ вучыць: „Каб у пашане быць, трэба працу любіць", „Каб цябе людзі хвалілі, не шкадуй у рабоце сілы", „З работай дружыць будзеш – гонар і славу здабудзеш", „Чужымі поспехамі не ганарыся, сам за справу бярыся".

Гордасць у народным разуменні – гэта вернасць выпрацаванаму маральнаму самаўсведамленню, узгодненаму з маральна-этычнымі ўяўленнямі народа пра „дасканалага" чалавека, г. зн. чалавека з пачуццём уласнай годнасці і гонару. Гордая дзяўчына або жанчына, горды мужчына або юнак – у гэтых словах вышэйшая ацэнка народам маральных якасцей сумленнага чалавека, які не здраджвае сваім маральным устаноўкам ні ў якой сітуацыі. Гордасць, на думку народа, патрабуе сціпласці („Не хваліся сам, хай людзі пахваляць"), яна несумяшчальная з празмерным самаўзвышэннем і змяншэннем заслуг іншых.

Высока цэніць беларускі народ сумленнасць („Абы сумленне чыстае"), бо лічыць, што сумленне – найважнейшы рэгулятар маральных паводзін чалавека („Ад людзей схаваешся, ад сумлення – не"). Народ сцвярджае, што людзі павінны быць сумленнымі згодна з выпрацаванымі для сябе маральнымі ўстаноўкамі, аднолькавымі з інтарэсамі грамадства: „У люстэрку бачыш свой твар, а ў сумленні – учынкі". Сумленне праяўляецца ў шчырасці, у працавітасці, у дысцыплінаванасці, у чалавечнасці, ва ўменні падпарадкаваць уласныя інтарэсы інтарэсам калектыву, у дзейснай любові да Радзімы, у чыстых адносінах паміж юнакамі і дзяўчатамі, у клопаце бацькоў пра дзяцей і ў адказнасці дзяцей за маральны і матэрыяльны дабрабыт састарэлых бацькоў. Кожны ўчынак чалавека можа быць разгледжаны перш за ўсё праз прызму яго сумлення. Народ вучыць: „Хоць кашуля чорная, але сумленне чыстае", „Хто сумленне мае, той чужое не хапае", „Чужое не тучыць, бо сумленне мучыць". Этнографы адзначалі, што беларускі народ – вельмі сарамяжлівы, ён ніколі і нікога не пакрыўдзіць, падзеліцца апошнім.

Вяршыняю ўсіх вартасцей беларускі народ лічыць сціпласць, павагу да людзей, прастату і прыстойнасць. Праслаўляюць сціпласць чалавека народныя песні, казкі, прыказкі і прымаўкі.

Сціпласць, на думку беларусаў, – ва ўменні крытычна падысці да ацэнкі ўласных вартасцей: „Хваляць – заткні вуха, крытыкуюць – слухай". Народ папярэджвае, перасцерагае ад самахвальства („Сам сябе не хвалі, няхай людзі пахваляць", „Не кажы гоп, не перайшоўшы цераз брод"), асуджае тых, хто займаецца самахвальствам („Хто сам сябе хваліць, няхай пярун таго спаліць"), вучыць правільным адносінам да заахвочвання і пахвалы („Чужа пахвальба як гром грыміць, а самахвальства смярдзіць"), раіць („Не хваліся ўперад, не перайшоўшы цераз брод"), павучае („Пахвальба – малайцу пагуба").

Нацыянальнай рысай беларускага народа з'яўляецца выключная беражлівасць. М. В. Доўнар-Запольскі пісаў: „Беларус вызначаецца беражлівасцю, амаль скупасцю, разважлівым вядзеннем гаспадаркі" (22, 279). Пра гэта ж гаварыў М. Я. Нікіфароўскі: „ ... і першапрацаўнік „насучныго" ўмее цаніць тое, над чым ён патраціў час і сілы. Не дзіўна таму, што на таку, у клеці, пры мліве, часта адзінкавае зерне ўзнімаецца і кідаецца ў кучу, у мяшок, у рукаў жарна, – што пралітая на зямлю кропелька забітай жывёлы выклікае некаторы жаль – што кавалачак сала або мяса, якія адпалі пры „чвартоўцы", лічацца „згубаю" і тэрмінова падбіраюцца. Тая ж надзвычайная беражлівасць у адносінах да харчовых прадуктаў бачная і ў кулінарыі" (41, 43–44). Ён жа падкрэсліваў, што ўсё гэта межавала б зневераголнай скнарлівасцю, калі б той, хто падбірае асобнае зерне або крупінку, у выпадку неабходнасці шчодра не дзяліўся б усім, што мае" (41, 44).

Беражлівасць сфарміравалася пад уплывам гістарычных умоў жыцця. На працягу многіх стагоддзяў беларускі народ знаходзіўся пад нацыянальным, сацыяльным і рэлігійным прыгнётам, жыў у беднасці, на невялікіх зямельных участках, карыстаўся прымітыўнымі сельскагаспадарчымі прыладамі працы, адчуваў нястачу сельскагаспадарчых жывёл, пакутаваў ад няўроду, які прыводзіў да голаду і вялікай смяротнасці. Усё гэта прымушала беларуса быць вельмі ашчадным і паступова ўвайшло ў жыццё народа. Актуальная дагэтуль прымаўка: „Хто жыве без запасу, той згіне без часу".

Тут дарэчы нагадаць, што адзін з істотных элементаў традыцыйнага выхавання беларусаў – выхаванне беражлівых і паважлівых адносін да хлеба. М. Я. Нікіфароўскі пісаў: „ ... заўсёды і ўсюды паважлівыя адносіны прасталюдзіна да хлеба-кармільца выключаюць усялякую магчымасць шпур-

ляць яго або ляпіць хлебныя „катэлкі". Да гэтага ж у маленстве прывучаюцца і дзеці" (41, 43).

Пра значэнне хлеба ў жыцці беларуса гавораць і такія прыказкі і прымаўкі: „Хлеб усяму галава", „Хлеб над усім пануе", „Хлеб у доме – гаспадар, на працы – друг, у дарозе – таварыш". У беларусаў па наяўнасці хлеба ў сям'і меркавалі пра яе дабрабыт і працаздольнасць. Хлеб – сімвал матэрыяльнага дастатку, працягу роду, павагі да людзей. З ім сустракаюць дарагіх гасцей, ідуць на „радзіны", „у сваты", „на вяселле", адзначаюць іншыя ўрачыстыя падзеі.

Усемагчымымі сродкамі і метадамі выхоўвае народ беражлівыя адносіны да хлеба. Гэта традыцыі, звычаі, абрады, прыклад і аўтарытэт старэйшых, прыказкі, прымаўкі, казкі, працоўныя песні, традыцыйныя народныя святы.

Выхаванне беражлівасці народ непарыўна звязвае з выхаваннем гаспадарлівасці: „У добрага гаспадара і саломінка не прападзе", „Без гаспадара гумно плача, без гаспадыні – хата". У ідэале народ кожнага сталага чалавека бачыць гаспадаром, гаспадарлівасць разглядае як найважнейшую маральную якасць асобы. Сведчаць пра гэта шматлікія этнаграфічныя звесткі, якія знаёмяць з гісторыяй развіцця беларусаў, і сучасная рэчаіснасць.

Нярэдка ў народнай педагогіцы сцвярджэнне станоўчых маральных якасцей адбываецца шляхам асуджэння маральных заганаў. Страта маральных прынцыпаў расцэньваецца народам як найвялікшае няшчасце: „Рукі пабрудзіш – і вадой памыеш, а душу забрудзіш – і мылам не адмыеш", „Руку, ногу пераломіш – зжывецца, а душу пераломіш – не зжывецца".

Недапушчальным лічыць беларускі народ адступленне ад норм і правіл, замацаваных у яго маральным кодэксе. У сувязі з гэтым у народнай педагогіцы сфарміравалася цэласная сістэма рэагавання на маральныя заганы, на адступленне ад маральных асноў, якая развілася пад уплывам грамадскай думкі і найбольш поўна і выразна выявілася ў форме прымавак і прыказак. Аналіз прыказак і прымавак дазваляе зрабіць выснову, што для барацьбы з маральнымі заганамі народ выкарыстоўвае розныя педагагічныя прыёмы. Усеабдымнымі педагагічнымі спосабамі ўплыву на любыя непрыгожыя ўчынкі, на любыя маральныя заганы, у цэлым на адступленне ад маральных канонаў працоўнага народа з'яўляюцца грамадская думка, выказаная ў выглядзе асуджэння: „Толькі званне, што чалавек", „Зжыў век не так, як чалавек", „Твар белы, а душа чорная", „Хоць ты яму кол на галаве чашы", а таксама пераканание, павучанне, наказ, парада, папярэджанне, асуджэнне.

Перакананне і павучанне дапамагаюць выхаваць непрымі-

рымасць да такіх маральных заган, як лянота, тунеядства, няўмельства: „Работу словам не заменіш", „Як робіш як, то й выйдзе так", „Лень жуе чалавека, як іржа жалеза"; марнатраўства: „Хто капейкі не беражэ, той сам яе не стоіць", „Шукаючы расшукаеш скора, а сабіраючы, сабярэш"; хітрасць, крывадушша: „Хто папрасту робіць, таму анёл пасобіць, а хто возьмецца хітрыць, к таму чорт наляціць", „Хітры чалавек гаворыць, як лістам сцеле, а ў кішэні камень трымае"; падхалімства: „Хто ўсім паддакуе, таму ніхто не дзякуе", „Не той бедны, хто грошай не мае, а той, хто душы не мае"; крадзеж, ліхадзейства: „Добрае чуваць далёка, а благое яшчэ далей", „Хоча чалавек прапасці – пачынае красці", „Ліхога нечага шкадаваць", „Ліхая забава – вялікая няслава"; махлярства: „Круцячы (крутней, круцельствам, махлюючы, ашуканствам), свет пройдзеш, ды назад не вернешся"; хлусня: „На абмане далёка не ўедзеш", „Лгарства (хлусня) як аліва – выйдзе наверх", „Раз салгаў – у другі раз не павераць"; зайздрасць: „Няма горай, як завісныя вочы", „Завідкі з сярэдзіны чалавека з'ядаюць"; балбатлівасць, плёткі: „Слова – серабро, а маўчанне – золата", „Лепш памаўчаць, ніж гаварыць невядома што", „Хто маўчыць, двох наўчыць", „Болей слухай, меней гавары", „Курыца не птушка, гультай не чалавек, баўтун не гаспадар", „Слова не кідай на вецер", „Нячуйка і нябачка – то лепшы чалавек"; самахвальства: „Чужа пахвала як гром грыміць, а самахвальства смярдзіць", „Хто хоча, каб яго хваліць, то сам сабе ганіць"; зазнайства: „Не чванься, гарох, – не лепш бабоў", „Пусты колас заўсёды нос кверху дзярэць"; фанабэрыстасць: „Хто набок з дарогі з'язджае, той хвален, а хто носіць набок шапку, той смяшон".

З перакананнем і павучаннем звязаны наказ і парада, якія таксама могуць служыць мэтам рэагавання на асобныя маральныя заганы і папярэджанне іх. Вось канкрэтны ўплыў парады і наказу на ляноту, тунеядства, няўмельства: „Перш папрацуй, а тады і патанцуй", „Гуляй, ды працу знай", „Не бярыся не за сваё дзела", „Калі ўлез у дугу, не кажы „не магу"; марнатраўства: „Блюдзі бацькіну капейку і сваю дабудзеш"; хітрасць, крывадушша: „Аўдзей, не будзь ты хітрэй за людзей: хітрэй, знаць, цялёнка не будзеш", „Сваю хітрасць раскрый – чужая перад табой раскрыецца"; балбатлівасць, плёткі: „Трэба ведаць, калі сказаць, а калі памаўчаць", „Не судзі нікога – не будзеш сам суджаны", „Ой, не ляпай пустое, то як з цапа сарвецца, то й дастанецца", „Плётку ў адно вуха ўпусці, а ў другое выпусці", „Другіх не судзі, на сябе паглядзі"; задзірыстасць: „Біцца не гадзіцца, лаяцца не палагаецца", „Спор да слёз, а ў драку не лезь"; самахвальства: „Не хваліся тым, што ведаеш, хай людзі пахваляць", „Сам сябе не хвалі, няхай людзі пахваляць"

Значнае месца ў народнай педагогіцы займае папярэджанне або перасцярога. Метадам папярэджання або перасцярогі фарміруюцца правільныя адносіны да такіх маральных заган, як лянота, тунеядства, паразітства: „Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш", „Праца чалавека корміць, а лянота порціць", „Лень горш хваробы", „Гультай горш калекі", „Хто замоладу не працуе, той на старасці журбуе", „Бяздзельна жыць – толькі неба капціць", „Гультай і лянота – два сябры: адзін без аднаго жыць не могуць", „Лень зробіць чалавека на пень"; скупасць: „Скупы два разы траціць", хітрасць. „Хітрасцю доўга не нажывеш"; крадзеж, махлярства: „Красці, як упасці – не на дабро", „Злодзею няма веры, хоць зямлю есць", „Ад зладзейства не разжывешся", „Колькі, злодзей, не круці – ад суда не ўйсці", „Красць вольна, ды б'юць больна", „Не за тое ваўка б'юць, што шэр, а за тое, што авечку з'еў", „Раз украў – навек сабе славу замараў", „Пасябраваўшы з злодзеямі, сам станеш злодзеем", „Пабратайся з злодзеямі, то й цябе так уважаць будуць", „Не той злодзей, што краў, а той, што хаваў", „З валачашчага карысці не будзе", „Хто круціць, той скруціцца"; зайздрасць: „Завісць не пойдзе ў карысць"; хлусня: „Брахнёй (абманствам, лгарствам, няпраўдай) свет пройдзеш, назад не вернешся", „Хто зняверыўся, таму не даюць веры"; балбатлівасць, плёткі: „Хто язык доўгі маець, таму дрэнна бываець", „Няслаўка – аслаўка, а гаршэй біцця"; трусасць: „Ад баязні мала прыязні"; самахвальства: „Пахвала – малайцу пагуба"; зазнайства: „Жаба дулася, дулася – ды лопнула", „Не лятай высока, бо нізка сядзеш".

Як бачым, мноства прыведзеных прымавак і прыказак могуць выступаць у якасці і пераканання, і парады, і наказу, і перасцярогі, і папярэджання нейкай маральнай заганы. У гэтым дыялектычнае адзінства і своеасаблівасць сродкаў і метадаў народнай педагогікі.

Народная педагогіка – гэта не штосьці застылае, раз і назаўсёды ўзятае, а вельмі мабільная педагагічная з'ява, дзе галоўнае – дзейснасць і эфектыўнасць выхаваўчага ўплыву, што нярэдка дасягаецца ўмелым спалучэннем і ўзаемадзеяннем, узаемапранікненнем сродкаў і метадаў.

Найбольш цэласна пададзены ў народнай педагогіцы метад асуджэння. Гэта звязана з тым, што асуджэнне ў найвышэйшай ступені адлюстроўвае адпаведную грамадскую думку і таму з'яўляецца вельмі дзейсным і эфектыўным пры папярэджанні і выкараненні маральных заган. Вось некаторыя прыклады ўздзеяння асуджэння на такія маральныя заганы, як лянота, тунеядства, паразітства, няўмельства: „Палец аб палец не ўдарыць", „Смачна есці, хораша хадзіці і нічога не рабіці – вот добра жыці", „На рабоце ой ды ох, а за сталом

адзін за трох", „Як да чаркі – скоры, як да працы – хворы", „Больш мовы, чым справы", „З языком і туды, і сюды, а на справе нікуды", „Слоў мяшок, а спраў на вяршок", „Гультай і сядзець стамляецца", „Адна прывычка гультаёў: рабіць чужымі бакамі, а ляжаць на сваіх", „Хто работу робіць, а хто варон ловіць", „Зрабіць і сам зробіць, толькі перарабляць просіць", „За сто работ бярэцца, а ні адна не ўдаецца", „Ні ў тын, ні ў плот, ні ў добрыя людзі", „Работы многа, а карысці мала", „Ні пітук, ні ядак, ні вялікі работнік", „Працуе: ні за ім, ні перад ім", „Так-сяк накасяк, абы не па-людску", „Што зробіць, то ўсё паўтара людскага"; марнатраўства: „Не чалавек, а с[illegible] рублёў убытку", „Што ў яго рукі папала, то й прапала", „С[illegible] страціць, а другіх вінаваціць"; хцівасць, скупасць, прагнас[illegible] „Адной рукой дае, а другой адбірае", „І знайшоўшы не падзеліцца", „І сам не гам, і другому не дам", „Чай выпіў, а цукар у кішэню схаваў", „Хоць жыватом пакачацца, абы дабру не валяцца", „Што твае, то і мае, а што мае, то табе ані", „Ён цябе прадасць і грошы пры табе палічыць", „Чужымі блінамі, сваякоў памінае", „За капейку і бацьку роднага прадасць"; хітрасць, крывадушша, падхалімства: „Не на весь рот гаворыць, а ў палавінку", „Чалавечына! Адна душа ў чабоце, другая ў жывоце, а трэцяя па свету ходзіць ды людзей зводзіць", „Есць і п'е, а ліха мысліць", „Адно на ўме, а другое на языцэ", „І ногі цалуе, а за сэрца кусае", „Як табе добра, то й ногі лізне, а як табе невыходна, то ў яму капсане", „Вуснамі мёд разлівае, а за пазухай камень трымае", „Чорную душу і залаты язык не схавае", „Перад богам кленчыць, а людзей енчыць", „Мякка сцеліць, ды мулка спаць", „У вочы з мілым тварам, а за вочы крутым варам", „З твару – яйка, а ўнутры – баўтун", „Маўчыць, а ліха робіць", „Глядзіць людзям у вочы, пазычыўшы вачэй у сабакі", „Падліза падлізаю і застанецца"; крадзеж, махлярства: „І не ўгледзіш, як яму к руцэ прыліпне", „Чалавек не чалавек, а так сабе валачуга", „Добры і слова паслухае, а ліхі і кія не "; зайздрасць: „Завіснае вока нічым не наталіш"; няўдзячнасць: „Дзевяноста дзевяць раз угодзіш, раз не ўгодзіш – і ты паганы"; хлусня, падман: „Што ступіць, то салжэць"; балбатня, плёткі: „Баіш, як поп, а слухаць нечага", „Язык ідзе наперад вума", „Язычa, язычa, сабе дабро не пазыча", „Што на язык узбрыдзець, то і пляцець", „На адной нядзелі сем пятніц", „Што гаў, што ты сказаў – то ўсё роўна", „Другіх мые, а сваіх саплей пад носам не бачыць"; абыякавасць: „Няхай – нядобры чалавек", „І хоча, і не хоча, і сам не ведае, што рабіць"; упартасць, зацятасць: „Не ўпросіш яго ні просьбаю, ні грозьбаю", „Хоць яго парэж на кавалкі, ён не хоча", „Што не гавары яму, ён усё ў вугал лезе", „На чым стану – не адстану", „Ні бога не баіцца, ні людзей не слухаецца"; ратазей-

ства: „Адным вухам слухае, а другім выпускае"; самахвальства: „Хто сябе хваліць, няхай таго агонь спаліць", „Сваё" хваліць, а чужое пад плот валіць", „Выхваляўся пустак, ды не зрабіў ніяк", „Гаварыла свіння, што даўно б каралём была, ды лыч не пускае", „На капейку ўпіўся, на рубель пахваліўся"; зазнайства: „Кожны жук хоча паказаць рогі", „Шостам галавы не дастаць", „Цаны-меры сабе не ставіць"; фанабэрыстасць: „Відаць птушку па яе палёту", „Хораша ішла, да не пакланілася", „Сколькі, вутка, не мудрысь, а лебедзем не быць"; нахабства: „Выпхнуць яго дзверыма, то ён акном улезе"; бессаромнасць: „Бессаромнаму плюй у вочы, а ён кажа: „Дождж ідзе", „Ні бога не баіцца, ні людзей не стыдзіцца"; неакуратнасць: „У нашай акуратніцы відаць сераду за пад пятніцы", „Зарос, хоць рэпу сей"; індывідуалізм: „Ён любіць толькі самаго сябе і то адзін раз у год", „Што твае, то й мае, а што майго, то табе не да таго", „Наша дзела чужое", „Мая хата з краю"; непаслухмянасць: „Не слухаў бацькі і маці, церы, няхай людзі вучаць"; легкадумства і павярхоўнасць: „Ні чытаць, ні пісаць, а толькі з гаршкоў хапаць".

Трэба адзначыць, што такой шматграннасці і шырыні выкарыстання метаду асуджэння садзейнічаў не толькі эмпірычны вопыт народа, але і прызнанне важнасці асуджэння ў маральным выхаванні, у фарміраванні чалавека. Так, у народнай педагогіцы ёсць сцвярджэнне, што бацькі павінны браць у выхаванні дзяцей самы актыўны ўдзел, выкарыстоўваючы для гэтага асуджэнне: „Няшчасныя тыя дзіцяткі, якіх не жураць ні бацькі, ні маткі". Дарэчы, побач з метадам асуджэння народ ставіць метад кантролю, кіравання: „Дзяцей гадаваць – волі не даваць".

Своеасаблівы метад маральнага выхавання ў народнай педагогіцы – абзыванне і знеслаўленне. Гэта спецыфічная форма грамадскай думкі пра адмоўныя рысы характару, пра маральныя заганы і ўчынкі, несумяшчальныя з народнай мараллю. Вось як гэта праяўляецца ў адносінах да гультая („лежань", „валяч", „блында", „байбас", „лябіх", „завала"), п'яніцы („заліваха", „пінцюх", „апівашына", „макша"), няўмекі („нізграбоце", „недалэнга", „згарода", „мамай" „парацька"), ілгуна („брэхман", „манькут", „манцэль", „ляйда"), скупога („жлоб", „жмінда", „склют", „сызма"), зацятага („убоіна", „нагула"), зазнайкі („абдулейка"), нелюдзімы („бязлюднік") і да т. п.

Высмейванне, насмешка, жарт – гэта таксама перавыхаванне, таксама фарміраванне правільных адносін да маральных заган. Напрыклад, у купальскіх і „жартоўных" песнях народ высмейвае нявернасць у каханні, няшчырасць, прытворства, ляноту, нядбальнасць да працы, халатнасць, неахайнасць.



3 Зак 77

Цікавую ролю ў маральным выхаванні выконваюць народныя анекдоты, у якіх адлюстроўваецца самасвядомасць беларускага народа, яго адносіны да навакольнага асяроддзя. Мараль у анекдотах вынікае з самога зместу твора. Сіла анекдота – як сродку народнай педагогікі – у тым, што ён у яркай, вобразнай і сціслай форме высмейвае маральныя заганы, заўсёды ўключае насмешку як выхаваўчы элемент.

У выпадку ж, калі ўсе іншыя метады не выпраўляюць якую-небудзь маральную загану, народная педагогіка карыстаецца праклёнам. Самы страшны праклён, на думку народа, датычыцца гібелі роду, дзяцей: „Каб на гэты род прыйшоў звод!", „Каб прыйшла пагібель на плод твой, род і вырод!", „Каб твая хата пуставала!", „Каб ты здох і род твой звёўся!", „Каб цябе маці купаючы ўтапіла!", „Не знай свайго роду-племя!". Жанчын праклінаюць бясплоддзем: „Каб ты на свет нікога не радзіла!" Страшным праклёнам лічыцца не мець бацьку і маці: „Каб ты бацькі з маткай не чуў!" Вялікім пакараннем з'яўляецца пажаданне немагчымасці выхоўваць уласных дзяцей: „Каб ён сваіх дзяцей не аглядаў!", „Каб ён так аглядаў жонку сваю і дзетак (і дзеткі)!", „Упарадкавала? Каб ты так сваіх дзетак парадкавала!"

Не менш моцны праклён – пажаданне мець непаслухмяных дзяцей, якія не паважаюць бацькоў: „Каб даў бог твае дзеці тваімі рэбрамі яблыкі абівалі", „Каб свае дзеткі прыждалі на свайго бацьку брахаць!", „Каб цябе так дзеці кармілі!"

Народ праклінае тых, хто не паважае бацькоў: „Адсохні тая рука, што на бацьку падымаецца!", а таксама пасылае праклён на тых бацькоў, якія не выхавалі дзяцей: „Няхай твайго бацькі дзеткі брэшуць!" Калі хтосьці не паважае людзей, не прыслухоўваецца да парад старэйшых, то праклён можа выліцца ў такую форму: „Усё яна знае, каб яе не зналі бацька і маці".

Калі дзеці нявыхаваныя, то праклён падае перш за ўсё на маці: „Трасца тваёй матары!"

За цяжкую правіннасць жадаюць смерці і хвароб: „Каб на цябе здыхота прыйшла", „Каб на цябе слота найшла!", „Каб ты, бог даў, міленькі, хварэў сем рок на адзін бок, сем рок на другі бок!", „Каб ты выхвараў!"

Дзейсным праклёнам, які садзейнічае перавыхаванню чалавека, з'яўляецца пажаданне, каб ад яго адвярнуліся людзі: „Каб твая магілка травой зарасла!"

У народа ёсць праклёны з прычыны кепскай працы: „А няхай ты прыгары (прытані) з еткаю работаю!", „Каб вас агонь пабраў з эткаю работаю!", „Каб яму так свет, які з яго работнік!". Ён праклінае і за нядобры характар, нявыхаванасць: „Каб табе агні высмалілі з тваім характарам!"

Асаблівыя праклёны звязаны з наяўнасцю ў чалавека такіх маральных заган, як крадзеж, п'янства: „Хто ўкраў, каб яго цела з гарачкі пачарнела!", „Каб ты дзе пад плотам здох, п'яніца няшчасны!"

Непрымірымая народная педагогіка да п'янства як да найстрашнейшай маральнай заганы, і тут значная роля адведзена фальклору.

Хаця па традыцыі ніводнае свята ў беларускага народа не абыходзіцца без застолля, галоўнае, на думку народа, – не выпіўка, а весялосць, радасць сяброўскай сустрэчы: „Піццё – смяццё, але дарага пасядзёнка", „Не дорага піва п'яна, а дорага пасядзенейка".

На святых вечарах спявалі песню:

„А ў беседзе людзі добрыя,
Гукаюць яны мускoе,
Усё добрае яны знаюць,
Малайцоў і маладзіц навучаюць:
Як трэба гора гараваць,
Як айца, матку шанаваць,
Як трэба сваіх жонак любіць,
А малых дзетак дай ня глуміць,
Як трэба да царквы хадзіць,
А па карчмах ня блудзіць" (61, 74–76).

Народ асуджае п'янства („Хто гарэлку любіць, той сам сябе губіць", „П'яны, як гразь", „П'яны, як зямля", „П'яны як дурны"), лічыць яго найвялікшым злом („П'янства да дабра не давядзе", „Гарэлачка – не вада, як уп'ешся, дык бяда", „Без чаркі няма хваробы і сваркі"), паказвае яго канчатковы вынік – згублены самакантроль („П'янаму і мора па калена"), хваробу („Гарэлка весяліць, ды ад яе галава баліць", „Піў, як мог, а цяпер ні рук, ні ног", „Ад водкі век кароткі"), разумовае атупенне („Ад гарэлкі будзе розум мелкі", „П'яны і дурны – родныя браты"), несумяшчальнасць з сямейным жыццём („Хто п'яніцу палюбіць – жыццё сабе пагубіць"); народ вучыць прыслухоўвацца да парады старэйшых і папярэджвае аб выніку сумеснага жыцця з п'яніцай:

„Ці я табе, дзяўчынка, не казала,
Не ідзі замуж за ўдовіна сына.
Удовін сын – прагоркая п'яніца:
П'е, гуляе, з карчмы не выходзе,
Дамоў прыйдзе – сям'ю разганяе" (48, 176).

П'яніца губляе ўсялякія маральныя апоры і арыенціры, у яго няма нічога святога, ён нават можа лёгка адрачыся ад жонкі і дзяцей:

„Адступ, жонка нялюбая!
Нялюбая,
Адступ, жонка нялюбая,
А ўжо ты мне знелюбела.
Знелюбела,
А ўжо ты мне знелюбела,
Дзеткі твае апастылелі" (4, 407).

П'янства прыводзіць да поўнай дэградацыі асобы („П'янства – чалавеку паганства") аж да здрады радзіме („П'яніца за гарэлку чорту душу аддаў").

Для выхавання станоўчых маральных якасцей і рыс характару, прыкладных паводзін беларуская народная педагогіка стварыла і выкарыстоўвае апрабаваныя шматвекавым вопытам выхаваўчыя сродкі, прычым яны ўзаемадапаўняюць адзін аднаго, якасна своеасаблівыя ў кожным асобным выпадку, што робіць іх незаменнымі памочнікамі выхавальніка ў любой жыццёвай сітуацыі.

## Рэлігійнае выхаванне

Бяссілле старажытнага чалавека перад грознымі сіламі прыроды парадзіла рэлігійныя вераванні старажытных славян: пакланенне раслінам, жывёлам, сонцу. Чалавек верыў у тагасветнае жыццё, выконваў абрады, звычаі, святы. У гэты час нарадзіліся шматлікія замовы, звязаныя з гаспадарчай дзейнасцю чалавека, замовы супраць хвароб. Старажытныя паганскія гульбішчы былі элементам культу і ў той жа час выхоўвалі. Паганства многія стагоддзі вяршэнствавала сярод рэлігій на тэрыторыі цяперашняй Беларусі і значна ўплывала на наступнае развіццё народа.

З увядзеннем хрысціянства царква прыкладвае вялізныя намаганні, каб прывабіць народ. Хрысціянскае веравучэнне набліжаецца да патрэб народа, каб найбольш задаволіць яго маральна-этычныя густы і ідэалы. Асноўныя даты народнага земляробчага календара прымяркоўваюцца да царкоўных святцаў (напрыклад, валачобныя песні беларускага народа), асобныя народныя абрады асвячаюцца царквою (абрады, звязаныя з нараджэннем дзіцяці, вяселлем, пахаваннем). Царква надае народным абрадам знешнюю хрысціянскую афарбоўку. Змест тэкстаў хрысціянскай бібліі і фальклору сведчыць пра тое, што многія царкоўныя пастулаты бяруць сваю першаснову ў скарбніцах народнай мудрасці.

Хрышчэнне народа поўнасцю не выкараніла ўстойлівыя традыцыі, звычаі, абрады, вусную народную творчасць. Па-ранейшаму народ працягвае самазахоўвацца замовамі, спяваць свае песні, праводзіць абрады, гульні, святы земляробчага календара, якія сфарміраваліся ў часы паганства.

прыводзіла да таго, што плёну ў рэлігійным выхаванні не назіралася, хаця Бог займаў вялікае месца ў маральным станаўленні дзіцяці.

У вуснай народнай творчасці Бог – гэта захавальнік народнай маралі. Дакладна адзначыў І. І. Насовіч, указваючы на адзін з асноўных шляхоў маральнага выхавання: „Старыя прымаўкамі ўнушаюць моладзі страх Боскі, надзею на Бога і правілы сумленнасці і дабрачыннасці” (43, III).

У маральным выхаванні беларускі народ выкарыстоўваў легенды і казкі пра дзеянні Бога і святых апосталаў на зямлі. Такія, напрыклад, як „Бог узнагароджвае працалюбівых і карае лянівых”, „Бог карае зайздрослівых”, „Пётр Хлебапёк”, „Бог, мужык і пан” і інш.

Я. Ф. Карскі пісаў: „У Беларусі вельмі любяць легендарную галіну, дзе галоўным чынам і выявілася народная мараль. Галіна гэтая – хаджэнне Збавіцеля і апосталаў па зямлі, наведанне багатых і бедных, праяўленне боскага правасуддзя, пабрацімства Збавіцеля з добрымі людзьмі. Тут многа арыгінальных падрабязнасцей, ёсць нават цэлыя арыгінальныя аповеды высокага маральнага значэння” (30, 475).

Шматлікія сямейна- і каляндарна-абрадавыя песні славяць Бога як абаронцу і просяць заступніцтва ў справах.

Рэлігійнаму выхаванню служылі валачобныя песні, якія адрозніваліся ад іншых абрадавых песень сваім рэлігійна-бытавым зместам. У іх адлюстроўвалася вера беларускіх сялян ва ўдзел вышэйшых сіл у іх паўсядзённай працы.

Асаблівая роля ў рэлігійным выхаванні належыць духоўным вершам і песням, гэта своеасаблівыя маральныя запаведзі народа:

„А вы люди христиане!
Послушайтя приказанья,
Што вам Сам Богъ приказавъ,
Што вам дѣлать заказавъ...
Четвертое: шануй батьцку,
И паважай сваю матку.
Хто отца, матку шануя,
Таму Богъ вѣку даруя.
Пятые: ни зыбивай,
Людцкія крыви ни разливай,
Крыовь упойства до Бога
Клича: ни калечь никого...
Сядмое: ни вкрадь ничого,
Й ни намовляй никого.
Ня чинь ніякой крадежи
Ни зъ денегъ, ни зъ збожжа, ни зъ одежи.

Як сведчаць этнографы, адносіны беларусаў да хрысціянскай рэлігіі былі супярэчлівыя. З аднаго боку, рэлігія мала цікавіла простых людзей. Сялянская праца патрабавала вялікай затраты сіл, таму выконваць усе царкоўныя абрады, хадзіць пастаянна ў царкву не было часу.

Нездарма з'явілася прымаўка „Калі бог прыстане, то і хлеба не стане", г. зн. калі будзеш выконваць усе царкоўныя абрады, то няма калі будзе працаваць. Хрысцілі дзяцей, вянчаліся ў царкве таму толькі, што так было прынята. Напрыклад, шлюб, асвячоны царквою, не прызнаваўся законным без выканання ўсіх рытуалаў народнага вясельнага абраду. З другога боку, несвядома, нябачна Бог прысутнічаў ва ўсім жыцці чалавека, не дазваляючы яму рабіць нядобрае: „Без бога не да парога".

Існавала нават такое павер'е: чорт пастаянна знаходзіцца пры чалавеку з левага боку і схіляе яго да зла, а з правага боку ў чалавека ёсць анёл – у якасці маральнага ахоўніка. І той, і другі вядуць запісы спраў чалавека. Чорт – дрэнных, злых, анёл – добрых. І ў залежнасці ад таго, што пераважыць, – дабро ці зло, будзе прызначана грэшніку пекла, а праведніку рай. Наступны Боскі суд быў магутным рэгулятарам маральных паводзін. Ужо з пялёнак дзіцяці пачыналі ўнушаць, што Божачка ўсё бачыць, і калі зробіш дрэннае, то Божачка пакарае. І гэта глыбока ўкаранялася ў свядомасці.

Як толькі дзіця пачынала размаўляць, яго прымушалі перад ежай і пасля ежы асяняць сябе крыжам. Калі ж дзеці супраціўляліся гэтаму, то ім унушалі, што Бог іх за гэта пакарае, не дасць хлеба і кашы, і яны памруць ад голаду. Выхаваўчы метад у выглядзе запалохвання значна ўплываў на паводзіны дзіцяці, тым больш што яно бачыла перад сабой прыклад дарослых, якія, не памаліўшыся Богу і не перахрысціўшы сябе крыжам, не садзіліся за стол і не прыступалі да трапезы.

Дзесьці пачынаючы з двух гадоў дзеці пад наглядам старэйшых братоў і сясцёр уранні чыталі малітву.

Этнографы прыводзілі прыклад, калі на 4–5–6-м годзе маці вучыла дзіця хрысціцца: „Дзякуй табе, Пане Божа, што захаваў ночанку і прыждаў дня святога!..", „Дзякуй табе, Пане Божа, што дзянёк перажыў і ночанкі святую ілі дождаўся" (64, 78, 79).

Як адзначалі некаторыя этнографы, найважнейшым сваім абавязкам бацькі лічылі навучыць дзіця маліцца Богу. Аднак маці, на якую ў асноўным быў ускладзены гэты абавязак, не мела магчымасці падаваць патрэбнага прыкладу. Звычайна яна вучыла дзіця малітвам паміж справамі, не засяроджваючы ўвагі на змесце малітваў. У выніку дзеці толькі механічна засвойвалі малітвы, не ўнікаючы глыбока ў іх сэнс. Гэта

Восьмая: ня свътчъ хвальчива,
Живи зъ людьми справедливо,
Ни наягай ни на кого,
Покинь злости, бойся Бога...
Десятое: Бога люби,
И ближняго свого ни губи,
Люби яго якъ самъ сябя
Дълай добря, дасть Богъ табъ.
Одиннадцатое: ни якой бяды ня дълай,
Ни зымути водой бълой" (63, 637, 638).

Уплывалі на выхаванне маладога пакалення так званыя „лірнікі" – „старыя-сляпцы", якія хадзілі з лірай, і „старыя-песняпеўцы", якія не мелі ліры. Ніводнае храмавае свята, „кірмаш", вяселле, гулянне моладзі не абыходзіліся без песень старых. Іх песні лічыліся павучальнымі, і таму старыя заўсёды былі акружаныя цікаўнымі слухачамі. Нярэдка можна было сустрэць старых у вёсках. Пачуўшы аб іх месцазнаходжанні, сяляне збіраліся абавязкова паслухаць старых спевакоў. Яны з вялікай павагай ставіліся да старасці і да павучальных песень, якія маглі слухаць многа разоў запар. Кожны гаспадар лічыў за гонар запрасіць спевака ў свой дом.

Адной з найважнейшых маральных вартасцей такіх песень было тое, што яны ў простай і даступнай форме давалі ўяўленне пра дабро і зло, вучылі жыць па Богу, нагадвалі пра непазбежнасць справаздачы перад Госпадам за свае добрыя і дрэнныя ўчынкі і пра наканаванасць грэшнікам пакутаваць у пекле, а высокамаральным і богабаязным аказацца ў раю.

Бог не атаясамліваўся ў беларусаў ні са святарамі, ні з царквою. Трэба аддаць належнае назіральнасці, праніклівасці беларускага народа. Святара ён бачыць не толькі пасланнікам Боскім, служыцелем культу, але і простым смяротным з усімі яго заганамі. У прымаўках, загадках, казках, анекдотах высмейваюцца маральныя заганы царкоўных святароў: бязбожжа, махлярства, крадзеж, п'янства, прагнасць, вымаганне, хітрасць і глупства, абжорства, падман, бяздушша (гл., напрыклад, казкі „Поп і дзяк", „Святы дух", „Як ксяндзы выляцылісь", „Пра папа Кірылу і яго работніка Гаўрылу", „Як мужык папоў ашукаў", „Як Іван напалохаў разбойнікаў і збавіўся ад папа і дзяка").

У анекдотах беларускі народ высмейвае прагных, скупых, ілжывых махляроў-царкоўнікаў. Яны паказаны бязбожнікамі, карцёжнікамі, бабнікамі, п'янюгамі, вымагальнікамі, невукамі, зладзеямі, хапугамі („Тры ксяндзы", „Як богі пакралі смятану ў папа", „Поп, дзяк і голуб", „Поп-фокуснік", „Поп і батрак", „Аб хітрым дзяку", „Поп-хабарнік", „Нічога не чуваць", „Поп-п'яніца", „Скупы поп").

## Эстэтычнае выхаванне

На развіцці эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы адбіліся перш за ўсё асаблівасці прыродна-геаграфічных умоў Беларусі. Незвычайна разнастайная беларуская прырода: беластволыя празрыстыя бярозавыя гаі змяняюцца змешаным лесам, напоўненым шматгалоссем птушак, то тут, то там раскіданы азёры і азерцы, апушаныя расліннасцю, усюды рэкі і рачулкі, ручаі... А які прыгожы і зменлівы сасновы бор! Цудоўныя маладыя сасонкі, што цесна туляцца на ўскрайку лесу адна да адной. У маладым хвойніку заўсёды свята: зімою сосны ўхутаны снегам і набываюць фантастычныя абрысы казачных герояў, увесну стаяць прыбраныя і ўрачыстыя, унізаныя мноствам ружовых свечак, а летам іх строі ўпрыгожваюцца карункамі маладой яркай зеляніны. А стары сасновы бор асабліва прыгожы ў спякотны сонечны дзень. Уваходзіш у яго як у храм з мноствам стройных ружова-мармуровых калон. І ўвесь ён напоўнены нейкім урачыстым звонам, быццам водгаласам незямной музыкі! А лугі з іх шматтраўем, дурманлівым водарам!

Назіраючы за прыродай, чалавек вучыцца мэтанакіраванасці і гармоніі. Паслядоўнае чаргаванне часін года, сезонныя змены прыроды, пераход яркіх летніх і асенніх колераў у строгія і спакойныя адценні зімы, у пяшчотную пастэль вясны развіваюць эстэтычныя пачуцці і густ.

Заўважаную шматвекавымі назіраннямі ўзаемазалежнасць прыродных з'яў у розныя поры года народ звязвае з узаемасувяззю і заканамернасцю ў прыродзе: „Зіма снежная – лета дажджлівае", „Студзень мяце – ліпень залье", „Пакуль гром не загрыміць, зямля не адтае", „Калі загрымела нагола, то будзе халодна вясна", „Жураўлі ляцяць высока – зіма яшчэ далёка", „Жураўлі ляцяць нізка – зіма ўжо блізка".

Аграрны каляндар беларусаў і каляндарна-абрадавая паэзія прасочваюць змены ў працы селяніна адпаведна сезонным зменам прыроды. Кожны этап сельскагаспадарчых работ атрымаў высокую маральна-эстэтычную ацэнку. У гэтым сэнсе эстэтычны густ беларускага народа бездакорны і нават непаўторны, пра што сведчаць характэрныя толькі для беларускага народа валачобныя песні. У іх усе сезонныя змены прыроды і тэрміны вядзення сельскагаспадарчых прац паказаны гранічна сцісла, ёміста, лаканічна і ў той жа час незвычайна вобразна і эмацыянальна. Эстэтычнаму выхаванню дапамагае гіпербалізацыя высокамаральных якасцей гаспадара, гаспадыні, іх дзяцей – юнакоў, дзяўчат. У валачобных песнях яны працавітыя, гаспадарлівыя, сумленныя, дамавітыя, сціплыя, паважлівыя да людзей, вынослівыя.



Эстэтычнае ўспрыняцце прыроды і пачуццё прыгожага, што адначасова паўстае, нараджаюць патрэбу ствараць прыгожае і карыснае, мэтанакіраванае. Здаўна беларускі народ імкнуўся зрабіць працу яе больш рацыянальнай, вольнай, творчай, бо шляхам шматвяковых назіранняў прыйшоў да высновы, што „Прымусовая работа самая цяжкая", а „Жаданая праца як сонца ўзыход". Нават самую цяжкую працу, на думку беларускага народа, трэба рабіць добра, сумленна, па-майстэрску. Прыгожа і дыхтоўна зробленая рэч прынясе маральнае і эстэтычнае задавальненне.

Народ выхоўвае эстэтычныя адносіны да працы: „Працуй і смак май", „Хто ў рабоце не лянівы, той і ў жыцці шчаслівы", „Шчасце адчуеш, калі папрацуеш". Гэтаму дапамагае непарыўная сувязь працы з песняй: „Дзе праца, там і песня", „З песняй і работа спорыцца".

У шматлікіх песнях каляндарна-абрадавага цыкла (валачобных, талаковых, купальскіх, пятроўскіх, жніўных, калядных, вяснянках), а таксама ў многіх песнях сямейна-абрадавага цыкла (песні радзін, вясельныя, пахавальныя) беларускі народ вучыць разумець прыгажосць працы, прыгажосць працоўнага чалавека, плённай і ўмелай работы.

З песень нам вядома, што, напрыклад, жаночая прывабнасць не ў знешнім харастве, а ў працавітасці, гаспадарлівасці, сціпласці, сумленнасці, паважлівых адносінах да людзей. Асаблівая ж увага звернута на ўменне жанчыны выконваць складаную, вытанчаную работу – ткаць найтанчэйшае палатно, шыць прыгожае адзенне, вышываць, вязаць.

Усе жанры народнай творчасці садзейнічаюць эстэтычнаму выхаванню, таму што сам акт творчасці – элемент эстэтыкі – натуральным чынам мае на ўвазе самавыяўленне і самаразвіццё. Народная творчасць набывае прагрэсіўную тэндэнцыю развіцця, бо выказвае калектыўную думку людзей, маральнакаштоўную арыентацыю працоўных мас, дзе галоўны крытэрый – гатоўнасць да працоўнага жыцця. Гэта вызначыла і маральна-эстэтычны ідэал беларуса. Сапраўды выдатным лічыцца той чалавек, хто гарманічна развіты як у маральных, так і ў фізічных і разумовых адносінах, прычым галоўнае – не знешняя яго прыгажосць, а маральныя якасці, розум, фізічнае здароўе, што вызначае яго гатоўнасць да працы. Народ вучыць: „Не красата чалавека красіць, а характар", „Не цані чалавека па твары, а цані па душы", „Не шукай красаты, а шукай дабраты", „На красівага сматрэць хораша, а з разумным жыць лёгка", „Красата да вянца, а вум да канца", „Не бяры таей, што ў золаце, а бяры таю, што ў розуме", „Не той харош, хто прыгож, а той харош, хто для дзела гож".

Найстаражытнейшым сродкам эстэтычнага выхавання з'яўляецца рамяство. Майстэрства, сапраўднага росквіту самабытнага таленту і творчасці дасягнуў у рамястве беларускі народ: „Каваль куе, а жалеза пяе". Прыгажосць беларускага народнага мастацтва традыцыйна выяўляецца ў строга функцыянальна створаных рэчаў і ў мастацкай выразнасці іх форм. Такая традыцыя склалася дзякуючы ўдаламу спалучэнню прыроднага густу беларусаў са шматвяковым вопытам народных майстроў, які перадаецца з пакалення ў пакаленне.

Многія стагоддзі беларускі народ шырока выкарыстоўваў у побыце рэчы, створаныя ўласнымі рукамі або набытыя ў рамеснікаў. Кожная рэч у гаспадарцы выконвала пэўную функцыю. Таму майстры імкнуліся максімальна наблізіць свой твор да яго мэтавага утылітарнага прызначэння. І ў той жа час яны ў сваёй творчасці выказвалі ўласнае светаразуменне, уласнае ўяўленне аб ідэале прыгажосці. Прычым разуменне прыгажосці было звязана з успрыняццем навакольнага свету, і перш за ўсё прыроды. Захапленне прыродай вылівалася ў строгія прапорцыі створаных рэчаў, у выкарыстанне зааморфных матываў, упрыгожанняў у выглядзе геаметрычных і раслінных арнаментаў, радзей – арнаментаў са стылізаванай выявай жывёл.

У народных вырабах раскрываецца адзінства прыроды і чалавека, выказваецца імкненне пераняць усё станоўчае ад прыроды. Гармонія ў прыродзе выклікае дзейснае жаданне ствараць прыгожае і практычна значнае.

Эстэтычны густ беларусаў адлюстроўваецца ў адзенні, архітэктуры жылля, прадметах побыту, прыладах працы. Узяць да прыкладу неабходны кампанент хатняга ўжытку – посуд. Ён вельмі разнастайны па сваім функцыянальным прызначэнні, па матэрыяле, з якога выраблены, па форме, памерах, роспісу. Доўблены драўляны посуд вызначаецца манументальнасцю скульптурнай формы, наяўнасцю зааморфных матываў, асабліваў пластыкай і цэласнасцю. Немудрагелісты дэкор толькі падкрэслівае выразнасць старанна прадуманай формы вырабу. Драўляныя лыжкі зноў-такі маюць прыгожую, зграбную форму, часцей за ўсё насковую, а не круглую, г. зн. больш мэтанакіраваную функцыянальна. Дэкор выкананы строга, у выглядзе нарэзак або рыбкі на ручцы.

Традыцыйныя для беларусаў разьба па дрэве, кераміка, ткацтва, пляценне з саломкі, лазы, менш характэрныя – мастацкая апрацоўка металу, роспіс.

Раней кожная беларуская сялянка ўмела ткаць. Гэта было абумоўлена сацыяльна-эканамічнымі і прыродна-геаграфічнымі ўмовамі Беларусі. Выбіраючы нявесту, перш за ўсё правяралі яе ўменне ткаць, пра што меркавалі па яе пасагу, які дзяў-

чына павінна была падрыхтаваць уласнымі рукамі. Ткацтва было самым распаўсюджаным рамяством.

Стараючыся зрабіць сваю работу больш жаданай, радаснай, беларусы ўпрыгожвалі прылады працы. Напрыклад, дэкаратыўнай разьбой аздаблялі калаўрот. Прычым дэкор беларускіх калаўротаў вельмі строгі, стрыманы і спалучаецца з натуральнай прыгажосцю дрэва. У традыцыйнай разьбе пераважаюць выемкі геаметрычнага характару, шматлікія разеткі, якія сімвалізуюць сонца, але сустракаюцца і ўзоры стылізаваных жывёл, раслін, птушак.

Важны сродак эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення – традыцыі. Напрыклад, у беларусаў па традыцыі юнакі і дзяўчаты выраблялі прыгожыя, неабходныя ў гаспадарцы рэчы і падносілі іх у падарунак каханым, сябрам, сваякам. Гэта маглі быць рукавічкі, кісет, вывязаны або вышыты ўласнымі рукамі, драўляная разная хлебніца, пярсцёнак і г. д. Вось як апісваў гэту традыцыю М. Я. Нікіфароўскі: „Вырабу калаўрота і стройнай апрацоўцы яго аддаецца найлепшы час з жыцця юнака, да якога ён прыкладвае ўвесь свой майстэрскі спрыт, таму што большасць калаўротаў ёсць самаробны дар жаніха нявесце, любячага брата – сястры" (41, 173–174).

Выдатны гэта сродак эстэтычнага выхавання – народная творчасць! Асабліва вусная, бо ўжо калыханкі, лічылкі, забаўлянкі даюць дзіцяці першыя ўрокі эстэтыкі. Маленькі чалавечак услухоўваецца ў музыку роднай мовы, адзначае, няхай сабе пакуль несвядома, і рытм, і рыфмы, і пявучасць, і меладычнасць... Прадоўжаць жа эстэтычнае выхаванне падрастаючага дзіцяці вобразныя і паэтычныя казкі, прыказкі, прымаўкі, песні, якія сфарміруюць яго густ. У старэйшым узросце ён адчувае ўплыў народных песень. Сярод іх – песні каляндарнага і сямейна-абрадавага цыкла, у якіх апаэтызаваны чалавек і яго праца.

Нельга не ўспомніць і беларускія народныя танцы як найстаражытнейшы сродак эстэтычнага выхавання. Гэтыя танцы маляўнічыя, жыццярадасныя, дынамічныя, эмацыянальныя, вызначаюцца калектыўнасцю выканання, своеасаблівасцю і багаццем малюнка, які нярэдка нагадвае малюнкі мастацкага ткацтва. Для іх характэрная разнастайная грацыёзнасць руху, выразная пластыка рук выканаўцаў, сюжэтнасць. У танцах апаэтызаваны з'явы прыроды, характар народа, праца людзей, асобныя маральныя якасці чалавека, жывёльны і раслінны свет.

Сярод сродкаў эстэтычнага выхавання на адным з першых месцаў – і народныя святы, дзе ў канцэнтраванай форме пададзены ўсемагчымыя жанры народнай творчасці. Тэатралізава-

ны характар народных свят дазваляе раскрыць эстэтычныя магчымасці народных традыцый, звычаяў, абрадаў, вуснай народнай творчасці, танцаў, народнага дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, нацыянальнага адзення.

Ні з чым не параўнаць эстэтычнае ўздзеянне свята Купалы. Яно па традыцыі праводзіцца падчас найвышэйшага росквіту прыроды, перад касавіцай і выспяваннем хлебных злакаў. Свята нарадзілася ў часы паганства і першапачаткова праводзілася ў гонар сонца, жыватворнай сілы прыроды, урадлівасці зямлі. Па паданні, у купальскую ноч ажывае прырода, расцвітае папараць-кветка, якая дае чалавеку дар прадбачання, дазваляе зразумець мову жывёл і раслін, адкрывае тайны зялёных багаццяў перад смельчаком, які не пабаяўся злых сіл і знайшоў кветку. На Купалу пускаюць па рацэ вянкі, загадваюць на долю, паляць вогнішчы, скачуць праз агонь, водзяць карагоды, на світанку ходзяць глядзець „гульню" сонца, спяваюць народныя песні. У купальскіх песнях апаэтызаваны працоўныя клопаты пра будучы ўраджай, але асноўнае месца тут займае паэзія кахання. Купала, у галоўным сэнсе гэтага слова, – свята кахання.

Этнограф П. А. Бяссонаў у 1871 годзе пісаў: „Свята мае свае абрады, свае характэрныя ўрачыстасці і гульні, а разам з тым і сваё ўласнае пераважнае кола песень. Тут сабрана ўсё, што толькі ёсць у беларускіх сялян самага святочнага, таямнічага, захапляючага, радаснага і гульнявога на працягу цэлага лета" (12, 28).

Асаблівае месца ў эстэтычным выхаванні займае народнае вяселле. Усе яго элементы па традыцыі маляўніча абстаўлены (сватанне, заручыны, дзявочы вечар, пасаг нявесты і жаніха, падрыхтоўка каравая, вясельнае застолле, дзяльба каравая). У вясельных песнях апаэтызаваны нявеста і жаніх, ідэалізуюцца іх маральныя якасці.

Е. Р. Раманаў пісаў пра беларускае вяселле: „Хто прысутнічаў на народным вяселлі, ва ўсіх яго складаных архаічных падрабязнасцях, той з гэткім жа правам можа сказаць, што кожнае народнае вяселле ёсць своеасаблівая опера" (54, УІ).

Гаворачы пра эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы, трэба адзначыць, што і тут народ улічвае ўзроставыя асаблівасці выхаванцаў. Першымі сродкамі эстэтычнага выхавання дзіцяці з'яўляюцца калыханкі, забаўлянкі, лічылкі, гульні, цацкі, казкі, прымаўкі, прыказкі, загадкі, пазней усё большае месца займаюць праца, традыцыі, звычаі, абрады, святы, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Абавязковы элемент эстэтычнага выхавання – эстэтыка паводзін. У беларускіх сем'ях з маленства дзецям прывіваюць правілы паводзін за сталом, „на жывым прыкладзе дарослых

яны засвойваюць прынятыя ў доме і навакольным побыце застольныя правілы прыстойнасці, вядомыя пад імем „люцкысці", або „людзянысці" (41, 59).

Народная творчасць – арганічная частка духоўнага жыцця беларускага народа – садзейнічае ўсебаковаму развіццю яго талентаў і эстэтычнага густу. Усе віды народнай творчасці (традыцыі, звычаі, абрады, святы, разнастайная працоўная дзейнасць) знаходзяцца ў пастаянным абнаўленні, трансфарміруюцца, творча развіваюцца, захоўваючы традыцыйную нацыянальную форму.

### Патрыятычнае выхаванне

Адно з вядучых месцаў у беларускай народнай педагогіцы займае патрыятычнае выхаванне. Фарміраванню высокага пачуцця патрыятызму садзейнічала ўся гісторыя беларускага народа, насычаная барацьбой за сваю незалежнасць, барацьбой супраць сацыяльнага, нацыянальнага і рэлігійнага прыгнёту.

У аснове патрыятычнага выхавання дзіцяці – выхаванне любові да маці, да роднага дому, да прыроды, г. зн. да ўсяго, што спадарожнічае яго першым крокам па сваёй зямлі.

Прыклад і аўтарытэт бацькоў вяршэнствуюць у патрыятычным выхаванні. Дзіця любіць сваіх бацькоў, верыць ім, яны – яго ідэал, узор для пераймання. Адносіны бацькоў да навакольнага свету фарміруюць у дзіцяці першыя ўяўленні аб Радзіме.

У беларускіх сем'ях бытуюць беражлівыя, клапатлівыя, любоўныя адносіны да дзяцей, жывёл, роднага дому, прыроды, зямлі-карміцелькі, і гэта закладвае грунт патрыятычных пачуццяў, свядомасці і паводзін.

Патрыятызм – найважнейшая маральная якасць беларускага народа. Пра гэта хораша сказана ў казцы часоў Вялікай Айчыннай вайны „Самае моцнае слова на свеце". У паняцце „Радзіма" народ аб'ядноўвае ўсё самае высаказначнае і дарагое для чалавека: „Радзіма – матка...", „Край мой – сумленне маё, сям'я – павага мая, жонка – парада мая, дзеці – пацеха мая".

У цеснай сувязі з патрыятызмам фарміруецца такая маральная якасць, як вернасць. Гэта вернасць маці, Радзіме, дадзенаму слову. Народ вучыць: „Бацькоў не цурайся, а ад Радзімы не адракайся", „Даў слова, дык яго і трымай". Грамадская думка захоўвае гэтую маральную якасць і перадае яе з пакалення ў пакаленне. Гэтай якасцю звычайна надзяляюцца і казачныя, і песенныя героі. Яскрава праяўлялася гэтая рыса беларускага характару ў гады нацыянальных бедстваў, сацыяльных узрушэнняў, калі Радзіма апынался ў небяспецы.

Гістарычна сфарміравалася ў беларускага народа паняцце дзейснага патрыятызму („Той патрыёт, хто змагаецца за народ", „Хто любіць Радзіму і свой народ, той сапраўдны патрыёт", „Не той патрыёт, хто кулаком у грудзі сябе б'е, а той, хто працу і жыццё Радзіме аддае", „Памерці можна, а здрадзіць Радзіме няможна"), а таксама пагарда да тых, хто здраджвае свайму краю, свайму народу („Хто роднага краю цураецца, той і маткі сваёй адцураецца", „Хто мову і веру мяняў, той не толькі сябе, а і маці прадаваў").

Гераічны эпас, які найперш выхоўваў патрыятызм, прадстаўлены не толькі вялізнай колькасцю арыгінальных казак пра асілкаў, але і значным зборам песень гістарычнага зместу, паданняў, былін, у якіх распавядалася пра мінулыя войны, паўстанні, розныя мясцовыя падзеі. Многа, напрыклад, было гістарычных песень, паданняў аб гераічнай барацьбе беларускага народа з татара-мангольскімі захопнікамі, аб вайне са шведамі, палякамі, французамі.

Асаблівай выхаваўчай сілай валодалі гістарычныя песні, у якія закладвалася ідэя непарыўнай сувязі беларускага народа з рускім, заклік да барацьбы з іншаземнымі захопнікамі, пагарда да тых, хто выракся сваіх традыцый, сваёй веры:

„Ой, колы б, колы
Москалі прышлы,
Москалі прышлы,
Нашы сродные,
Веры одныя!
Добрэ нам было,
Шчасно нам было,
Колі Русь уся,
Трымаючыся
Одной сілаю,
За одно была.
Да й к нам за грэхі
Панайшлі ляхі,
Занялі нам край
Аж до ляховіч.
Ой, ляхі б не прыйшлы,
Шчоб паны іх не свелы,
Ой, паны шчобы пропалы,
Шчо ляхам нас запродалы;
Ой, пашы, шчоб вы сгінулы,
Шчо вы веру покінулы" (8, 187).

Гістарычныя песні выхоўвалі гонар за гераічныя справы продкаў, веру ў неперараможнасць народа ў барацьбе з ворагам, мужнасць, стойкасць, імкненне любой цаной адстаяць незалежнасць сваёй роднай зямлі:

„Падымаліся чорны хмары,
Неба пакрывалі, —
Прыхадзілі злы татары,
Пад Крычавам сталі.
Запалілі стары Крычаў, —
Канцы запылалі...
Наш Івашка падымаўся,
Людзі ў рады сталі.
Палілася кроў, змяшалась
З чорнаю зямлёю, —
Злы татары падаліся
Уцякаць гурбою.
А Івашка гоніць, гоніць,
Голасна смяецца,
Што татарва ўцякае,
Аж хахол трасецца” (8, 165).

Смеласць і знаходлівасць, кемлівасць і волатаўская сіла беларуса, апетыя народам, натхнялі. Непакоілі ж душу зверствы, жорсткасць захопнікаў: забіваюць дзяцей, гвалцяць дзяўчат і жанчын, забіраюць хлеб, аднімаюць жывёлу. Вось як распавядаецца ў паданні пра Айчынную вайну 1812 года: „Нагнаў ён (Напальён – А. О.) сюды войська, бы цёмная хмара, да й пачаў паліць вёскі, гарады да забіваць людзей. Пахаваліся людзі, хто пасьпеў у лес, ці за балото, загналі туды ўвесь свой статак, а дабро закапалі ў землю. Знішчылі французы ўвесь край, змарнавалі ўсё дабро, так што й самі пачалі падыхаць з голаду. Пераелі паганые сабак да катоў, палавілі мышэй да пацукоў, пастралялі ўсіх варон да й паелі ўселякую погань...” (8, 225). Але хутка зверствам захопнікаў прыйшоў канец: „Зберуцца яны дзе-небудзь грэцца ў хату, а тут бы з зямлі вынырне Платон-казак да й запаліць атусюль тую хату. Пекуцца французы, бы картопля ў прыску, пекуцца, а вылезці з хаты не могуць, бо дзверы калом падперты. Гуляе Платон-казак та тут, та там і ніяк яго не могуць злавіць французы... Ён па полю раз'езжае, страх на варм'ю наганяе, паліць янералаў хаты, да берэ ат іх гарматы; забегае на дарозі, топіць войско ў Берозі” (8, 225–226).

Эпас беларускага народа вызначаецца шматлікімі казкамі пра герояў-асілкаў („Кірыла Кажамяка”, „Івашка Мядзвежжа Вушка”, „Праз Іллюшку”, „Васька Папялышка”, „Пра Івана-Дарагана” і інш.). У іх апаэтызаваны свяшчэнны абавязак чалавека – абарона Радзімы, услаўляюцца мудрыя, працавітыя, велікадушныя і сціплыя героі, якія любяць сваю Радзіму, гатовы да яе абароны, змагаюцца са злом і насіллем, з прыгнётам, клапоцяцца пра ўсіх прыніжаных і зняважаных, што жывуць у галечы і горы. Казкі дапамагаюць усвядоміць сваю

сілу, абуджаюць мужнасць, выхоўваюць любоў да Айчыны.

Патрыятычнаму выхаванню служаць і казкі пра жывёл, і чароўныя, і сацыяльна-бытавыя казкі. Яны ў алегарычнай форме паказваюць барацьбу са злом і насіллем, праслаўляюць мужнасць і смеласць, адданасць сваёй зямлі.

Выхаванню патрыятызму дапамагаюць і шматлікія песні каляндарна- і сямейна-абрадавага цыкла. У валачобных песнях падкрэсліваецца, што адна з галоўных вартасцей чалавека – яго патрыятызм: любоў да радзімы і свайго народа, уменне абараніць родную зямлю ад ворага. Пра маральныя якасці чалавека-патрыёта народ у валачобных песнях гаворыць адкрыта („З-пад гаю зялёнага") або ў сімвалічнай форме („Да ляцяць, ляцяць два галубочкі"). Нават у купальскіх песнях можна знайсці сюжэт на патрыятычную тэму, прычым размова ідзе пра дзяўчыну, якая на вайне здзяйсняе подзвіг, параўнальны хіба толькі з подзвігамі былінных асілкаў.

Неад'емнай часткай і дзейсным сродкам патрыятычнага выхавання з'яўляюцца прымаўкі і прыказкі: „Радзіма – матка, а чужына – мачаха", „Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднае крыніцы", „На роднай зямлі, як на камлі", „Той бацькаўшчыну любіць, хто ёй сумленна служыць", „Хто ўмее любіць Радзіму, той умее ненавідзець ворага", „Той перамагае, хто ў бядзе са сваёй зямелькі не ўцякае", „Хто за правае дзела стаіць, той усягда пабядзіць". Народная мудрасць папярэджвае: „Здраднік за агрызкі прадасць родных і блізкіх", „З народным гневам не жартуюць", „Для прадажнай псіны – кол з асіны" і вучыць: „Лепей смерць на полі, чым мука ў няволі", „Чалавек без радзімы, што салавей без песні".

На ўсіх этапах гістарычнага развіцця беларускага народа можна знайсці прыклады выкарыстання такіх метадаў народнай педагогікі, як благаславенне на подзвіг, наказ абараніць родную зямлю ад варожай навалы. Напрыклад, у дакастрычніцкай беларускай народнай песні „Сястра брату каня асядлала..." гучыць наказ:

„Сястра брату каня асядлала,
Выпраўляла народу служыць:
– Сваю родную, братка, краіну
Ты ўмей ад паноў абараніць" (7, 738).

З ёю пераклікаецца народная песня часоў Вялікай Айчыннай вайны „Праважала сына маці...":

„– Будзь, сынок, адважным!..
У радах адважных, мужных
Будзь і ты, мой родны!
У бой за родную краіну,
За спакой народны!" (7, 739–740).

У вуснай народнай творчасці часоў Вялікай Айчыннай вайны найбольш распаўсюджаныя жанры – песні, прымаўкі, прыказкі, частушкі, загадкі, якія ствараліся ў партызанскіх атрадах, у Чырвонай Арміі, у падполлі. Перадаваліся яны з вуснаў у вусны, друкаваліся ў армейскіх газетах і ў такіх выданнях, як „Савецкая Беларусь", „Партызанская дубінка", „За Савецкую Беларусь", „Раздавім фашысцкую гадзіну!", гучалі ў канцэртах самадзейных калектываў.

Народная творчасць ваенных гадоў была важным сродкам і палітычнай прапаганды і агітацыі. Тады наглядна выявілася, наколькі глыбокая і арганічная сувязь беларускага фальклору з карэннымі інтарэсамі нашага народа. У народнай творчасці ваенных гадоў паказаны ўсе нягоды, што выпалі на долю людзей, барацьба з ворагам, вера ў перамогу, у бессмяротнасць роднай зямлі. Героі вуснай народнай творчасці ў Вялікую Айчынную вайну – партызаны, байцы Чырвонай Арміі, рэальныя асобы, носьбіты гуманістычнай маралі, якія не шкадавалі свайго жыцця ў барацьбе за здзяйсненне адзінай мары – перамогі над фашысцкімі захопнікамі.

## Фізічнае выхаванне

На мэце фізічнага выхавання – вырасціць здаровага чалавека, здаровага працаўніка, бо здароўе – аснова ладу ды моцы сям'і: „Здароўе даражэй за ўсё", „Абы здароўе, а работа будзе", „Няма лепшага багацтва над здароўем", „Абы здароўе, а жыццё будзе", „Як здароў, дык жыць нада".

Добразычлівае стаўленне беларусаў да іншых людзей выказваецца ў шматлікіх пажаданнях здароўя, якія бытуюць сярод сялян. Пры сустрэчы знаёмых і нават незнаёмых людзей звычайна кажуць: „Добры дзень! – Добрага здароўя!", „Здароў! – Бывай здароў!" На развітанне людзям таксама зычаць здароўя: „Аставайся здаровы! – Бывайце здаровы!", „Бывайце здаровы!", „Заставайцеся здаровы! – Ідзіце здаровы!" З якой-небудзь асабістай нагоды чалавеку кажуць: „Будзь здароў, як дуб, ды моцны, як зуб", „Каб быў здаровы, як дуб скарбовы (найздароўшы)". Выказаць пашану ды прыязнь да чалавека можна і так: „А каб ты жыў-быў ды здароў!", „Будзьце мацненькі, дужанькі! – І табе тое самае". У тостах у застоллі таксама зычаць здароўя: „Будзем здаровенькі! – Будзьма!", „Дай бог здароўя і ручкам, і ножкам, і ўсяму патрошкі", „Добрага здароўя ад краю да краю, ды ўсім дабра харошага жадаю", „Жадаю табе разам трое: шчасця, долі ды здароўя", „Здароў будзь!" На вяселлі маладых благаслаўляюць: „Дару бытам добрым, векам доўгім ды моцным здароўем".

Аднак фізічная сіла, цягавітасць маюць вартасць у вачах людзей толькі тады, калі яны высокага маральнага грунту.

Казачныя героі-асілкі дужыя не толькі фізічна, але і маральна. І ў гэтым адна з галоўных педагагічных ідэй народа. Фізічнай моцаю, здароўем народ надзяляе дзеля таго, каб герой мог працаваць, змагацца з ворагамі, са злом і гвалтам — у імя Радзімы ды людскога шчасця. Фізічную сілу маюць і цёмныя, варожыя да людзей сілы (Паганы Цмок, Цуда-Юда, ведзьмы), аднак з-за сваёй маральнай недасканаласці, з-за таго, што яны ўвасабляюць сілы зла і насілля, самыя горшыя маральныя заганы, у казках заўсёды церпяць крах. Іх перамагаюць сілы дабра і справядлівасці.

Здароўе — гэта першае, што зычаць немаўляці і яго бацькам на свяце радзін, у час адведзін парадзіхі: „Здароўя яму, быць вумнаму-разумнаму, бацькам пацехай у маладосці, кармільцам іх старасці".

Дзіця ад дзён нараджэння пачынаюць фізічна выхоўваць: даглядаюць, сочаць за чысцінёю ягонага цела, праз адпаведныя прамежкі часу кормяць, загартоўваюць. Раней існавалі адпаведныя звычаі і абрады, замовы, скіраваныя на тое, каб дзіця расло здаровае. Так, напрыклад, кума павінна была разам з навародкам сесці на тачыльны камень — каб дзіця было моцнае ды здаровае. Е. Р. Раманаў пісаў: „Каб дзіцёнка ніхто не сурочыў, трэба над калыскаю павесіць воўчы зуб. Таксама трэба ўсяляк засцерагаць ад ветру, каб не падзьмуў на дзіця ў калысцы" (54, 304). У гэтым — сапраўдны клопат пра фізічнае здароўе дзіцяці, засцярога ад прастуды пераплятаper ў свядомасці народа са старажытным містычным павер'ем.

У народнай педагогіцы выпрацавалася беражлівае стаўленне да фізічнага і псіхічнага здароўя. Ужо з першых дзён дзіця засцерагалі ад непажаданых кантактаў („нядобрага вока"), ад непрадбачлівых узрушэнняў, трывог і страху. Дзеля гэтага імкнуліся асабліва не звяртаць на яго ўвагі, не вадзіць „на людзі", калі ж госці прыйшлі ў хату, то дзяцей адпраўлялі на печ, або на двор, дзе яны гулялі, не перашкаджаючы дарослым. Нельга было ўголас дзівіцца на здароўе, рухавасць ды зграбнасць малога. Лічылася, што ўсё гэта ў адносінах да яго нясе ахоўную функцыю. Нямоцны арганізм мусіць адаптавацца ў навакольным асяроддзі. І народны погляд на адносіны да дзіцяці як найлепей спрыяў фарміраванню яго псіхікі, развіццю станоўчых маральных, фізічных, разумовых сіл і здольнасцей.

У беларусаў існуе шэраг павер'яў, прыкмет, перасцярог, замоў, якія, на думку людзей, павінны ахоўваць здароўе. Лічыцца, што нельга калыхаць пустую калыску, бо гэта прывядзе да хваробы, капрызаў і нават да смерці немаўляці. Маці забаранялася хадзіць на могілкі на пахаванне свайго першын-

ца, – каб не памерлі астатнія дзеці. Нельга біць дзіця нават жартам, бо яно зробіцца капрызным. Нельга браць на рукі задам, бо будзе ўпартае. Нельга цалаваць да году ў вусны, іначай яно доўга не будзе гаварыць. Ні ў якім разе нельга біць дзіця па пятках, бо яно захварэе. Нельга клясці, абзываць, даваць яму зневажальныя мянушкі, бо праклёны, асабліва матчыны, могуць прывесці да таго, што дзіця або ўтопіцца, заб'ецца ці памрэ ад няшчаснага выпадку, стане калекам, вырадкам, дурнем. Да году дзіцяці можна шыць адзенне толькі са старога палатна, паношага адзення, каб дзіця заставалася жыццяздольным.

Дбаючы пра здароўе маленькага чалавечка, яго з першых дзён пачынаюць прывучаць да вады. Раней увогуле лічылася за лепшае, каб роды праходзілі ў лазні, дзе маці і навародак адразу маглі „пакарыстацца выгодамі лазні..." Усё гэта магло б заставацца незаўважаным, калі б яно не клікала за сабою строгага выканання такога звычаю: „На працягу наступных шасці тыдняў у такой лазні мыюцца толькі парадзіха і навародак, а калі дзеля помачы туды заходзіць бабка, або іншыя жанчыны, то яна не мыецца і не здымае бялізны" (41, 300). Так робіцца невыпадкова, бо захаванне чысціні ў лазні, як і купанне ў ёй малога дзіцёнка прадухіляла ад розных хвароб, на што малыя асабліва „здольныя".

Беларусы клапоцяцца не толькі пра чысціню дзіцячага цела, але дбаюць пра яго гарт, фізічную моц. Вось як пра тое пісаў М. Я. Нікіфароўскі: „Парыцца з венікам не пазбягаюць і дзеці, нават сысуны. Паспытаўшы раней лазні з парам, які-небудзь трохгадовы Мікітка пазірае па-бычынаму на мамку, якая шчыруе над ім, а калі тая пакладзе яго пад венік, ён доўга сапе і пыхкае і толькі тады зараве, калі мамка надта захопіцца сцёбаць яго дзіцячае цельца" (41, 297).

Лазня з парам для малых дзяцей, магчыма, мае адмоўны бок у такой традыцыі, бо, вядома ж, дзіця мае вельмі тонкую далікатную скуру, непрыстасаваную дзеля такой працэдуры. Аднак у ёй выяўляецца і вялікі клопат народа пра фізічнае развіццё дзяцей, бо лазня – не толькі гігіенічны сродак, але ўмацавальны і аздараўляльны.

Вера ў цудадзейныя сілы лазні была заснаваная на шматвяковых назіраннях. Той, хто заўсёды яе наведваў, выглядаў маладзейшым за аднагодкаў, менш хварэў або ўвогуле не хварэў, асабліва прастуднымі і сардэчнымі хваробамі, адчуваў сябе моцным і здаровым. Пра чысціню беларусаў этнографы пішуць: „Наведванне лазні хоць адзін раз на тыдзень з'яўляецца неадкладнаю, рэгулярнаю неабходнасцю... і старыя і малыя накіроўваюцца на „голы банкет", спяшаюцца, як толькі могуць: дзеці бягуць навыперадкі, шаноўныя мужы паскараюць звычайную хаду, нават старэнькія дзяды ды бабулькі з

кульбаю часцей перасоўваюць усе тры свае нагі...” (41, 293–294).

Лазня разам з параннем – цудоўны сродак загартоўкі арганізма, ён шырока бытуе ў асяроддзі беларусаў: „Аднаразовым параннем задавальняюцца нямногія... пасля кожнага парання назіраецца выхад з лазні, каб асвяжыцца, астыгнуць. Калі паблізу ёсць возера, рака, сажалка ці маленькая „мачула”, чалавек з пару кідаецца туды, бултыхнецца разы два – і зноў на паліцу, за венік; зімою замяняе гэта снег: паваляцца ў ім адразу з пару і потым зноў за венік – адно з любімых дадаткаў лазні” (41, 297).

Лазня, несумненна, – вялікі народны лекар. Здаўна выкарыстоўваюць яе беларусы ў якасці прафілактычнага сродку ад розных хвароб, дзеля таго і ўжываюць у час парання бярозавыя венікі, якія забіваюць хваробатворныя мікраарганізмы і ачышчаюць паветра, і венікі з дададзеным дубовым голлем, плёскаюць у распаленую каменку настоі з лясных траў – чабору, мяты, душыцы.

Такім чынам, лазня – неад'емны элемент традыцыйнага фізічнага выхавання. Яна гартуе чалавека, служыць як умацавальны прафілактычны сродак ад розных хвароб, як сродак самарэгулявання арганізма. У той жа час лазня – гігіенічны сродак, гімнастыка сасудаў, трэніроўка дыхання, разрадка нервовай напругі,аднаўляльнік сіл, рэгулятар абмену рэчываў. Лазня дапамагае выгнаць з арганізма адпрацаваныя шлакі, супакойвае, амаладжвае.

Клопат пра фізічнае выхаванне дзіцяці праяўляўся і ў асаблівай вопратцы маломy, яго спавіванні. „Наваpодка апранаюць звычайна ў „мятлік”, які ўяўляе сабою кавалак чыстай, мяккай матэрыі або добра праношанага, памытага, мяккага палатна. У ім робіцца разрэз, каб пралязала галава дзіцяці; сшываць у гэтым мятліку нічога не трэба, як і не трэба ніякіх рукавоў. Такі мятлік апранаюць на дзіця да 4–6 месяцаў, потым яму шыюцца з палатна або паркалю кашулькі. Разам з тым ад дня нараджэння і да 6–9 месяцаў немаўля спавіваюць, дзеля гэтага бярэцца чатырохвугольны кавалак зношанага палатна, аршына 1 $^1/_2$ даўжынёю, невялікая белая або каляровая хустка і звычайны пояс, які носяць мужчыны замест паса і па-тутэйшаму называюць „спавівач” (54, 23).

Спавіванне дзіцяці да 6–9 месяцаў было абумоўлена вялікай занятасцю жанчын у дарэвалюцыйныя часы і аберагала дзяцей ад розных няшчасных выпадкаў. Аднак народ ужо даўно заўважыў, што дзеля нармальнага развіцця дзіцяці неабходны фізічныя практыкаванні і розныя рухі.

Беларуская народная педагогіка лічыць мэтазгодным з першых дзён жыцця дзіцяці рабіць з ім фізічныя практыкаван-

ні. Маці забаўляе малое, гладзіць, згінае, разгінае ягоныя ножкі, ручкі і спявае.

Напрыклад:

„Пацягушкі, парастушкі,
Упоперак талстунюшкі,
А ў ножкі хадунюшкі,
А ў ручкі хватунюшкі,
А ў раток гаварок,
А ў галоўку разумок".

*(З сшытка школьнага музея Каменскай СШ Лепельскага раёна Віцебскай вобласці.)*

Калі дзіця пачынае станавіцца на ножкі, маці бярэ яго на рукі, стаўляе сабе на калені і гуляе з ім, пры гэтым спяваючы. Дзіця ў такт песні прысядае, падскоквае, пляскае ў ладкі. Вось прыклад такіх песень, запісаных у вёсцы Валосавічы Лепельскага раёна, на рускай мове:

„Дыбок, дыбок,
Скоро Ванюшке годок!
Поехали, поехали,
С орехами, с орехами!
Поскакали, поскакали,
С калачами, с калачами!
Вприпрыжку, вприпрыжку,
По кочкам, по кочкам –
Бух в ямку!"
„Шел козел по лесу,
По лесу, по лесу,
Нашел себе принцессу,
Принцессу, принцессу.
Давай, коза, попрыгаем,
Попрыгаем, попрыгаем.
Давай горе размыкаем,
Размыкаем, размыкаем,
Ладошками похлопаем,
Похлопаем, похлопаем,
Ножками потопаем,
Потопаем, потопаем". (Там жа.)

Асаблівая радасць кожнай маці – калі яе дзіця пачынае рабіць першыя самастойныя крокі. З такой падзеяй звязаны шматлікія звычаі і абрады. „Каб дзіця хутчэй мацнела і хутчэй пачало хадзіць, яго варта часцей саджаць на тое месца, дзе перад гэтым ляжаў свежаспечаны хлеб. Каб дзіця хутчэй пачало хадзіць, ставяць яго на падлогу і між ягоных ног перарэзваюць вяроўку, або, прынамсі, робяць выгляд, што перарэзваюць яе. Гэта называецца „рэзаць шлях" (54, 305).

Раней паўсюдна беларусы рабілі спецыяльныя прыстасовы дзеля навучання хадзьбе: „Амаль неразздельна з калыскаю ў хаце туліцца дзіцячая „садзібка"... Пры ўменні ды магчымасці „садзібка" робіцца з выпіленым кружком у верхняй дошцы; за недахопам жа іх – значна прасцей, і ўся пабудова яе складаецца з квадратнай у аснове дошкі, абітай мяккаю тканінаю, куды туга ўстаўлены 4 падпоркі, злучаныя ўверсе перакладзінамі, – што здалёк гатова нагадаць фігуру куба. Пры поўнай адсутнасці хоць якой „садзібкі", апошняю становіцца парожняя скрыня, кош, вядро, ражка і інш." (41, 325).

Неад'емны кампанент фізічнага выхавання – кармленне. Па традыцыі ў беларускіх сем'ях дзяцей даволі доўга кармілі грудзьмі. Пасля таго як адымалі малога ад грудзей, яго пачыналі прывучаць да таго строгага распарадку харчавання, які быў заведзены ў хаце. Этнографы адзначалі: „... дзеля сапраўднай правільнай ежы існуюць дакладныя, з незапамятных часін установленыя тэрміны, калі ўся сям'я, або значная частка яе, збіраецца за сталом і ўсе разам ядуць. Паказчыкамі гэтых тэрмінаў у асобнай сям'і, як і ва ўсёй вёсцы, служаць: звычка, размяшчэнне сонца на небе і вясновы хранометр у вобразе пеўня. Пад іх кіраўніцтвам ствараюцца чатыры тэрміны дзённага сілкавання, у будні і ў свята ... прычым здольныя абыходзіцца з лыжкаю дзеці знаходзяцца пры маццярках, то „станьком" на лаўцы, то на пастаўленай на яе калодцы" (41, 55–56, 59).

Фізічнаму выхаванню дзяцей садзейнічала і ўласцівая беларусам высокая патрабавальнасць да чысціні і ахайнасці прыгатавання ежы. М. Я. Нікіфароўскі пісаў наконт гэтага „... да пахвальнага боку кухарскае справы неабходна аднесці даволі частае мыццё рук кухаркі, а таксама і тое, што кожная пасудзіна абавязкова спаласкваецца вадою нават і тады, калі яна была памытая раней ... міскі ды лыжкі не толькі мыюць, але і выціраюць" (41, 49).

Правільна прыгатаваная, здаровая, разнастайная ежа, шырокае выкарыстанне вегетарыянскіх страў (нацыянальная асаблівасць беларускай кухні) дапамагаюць вырасціць здаровых і моцных людзей.

У аснову фізічнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы пакладзены прынцып прыроднай мэтазгоднасці. Гэта значыць, што фізічнае выхаванне ў беларусаў ладзіцца ў адпаведнасці з узроставымі асаблівасцямі дзяцей, у залежнасці ад змен у прыродзе і пад уздзеяннем прыродных фактараў. Фізічнае выхаванне здзяйснялася і здзяйсняецца большасцю на ўлонні прыроды. Так, шматлікія калектыўныя рухавыя гульні звычайна адбываюцца на дварэ: „У ката і мышку", „У гарэлыша", „Калім-бам-ба", „У здагонкі", „Штандар", „У гарадкі", „У булу".

Усе рухавыя гульні развіваюць хуткасць, спрыт, вынослівасць, сілу, выхоўваюць смеласць, настойлівасць, мэтанакіраванасць.

На Беларусі шмат азёраў і рэк, таму дзеці часта праводзяць свой час ля вады. Вельмі рана яны пачынаюць вучыцца плаваць, ладзяць гульні на вадзе, бегаюць і скачуць каля-вады, загараюць. Сонца, паветра, вада гартуюць цела. Той жа мэце служыць і хадзьба па расе, абліванне халоднай вадой, працяглыя паходы ў лес. Зімою фізічнаму выхаванню спрыяе катанне на санках, на лыжах, на каньках.

Яшчэ ў 1890 годзе Е. Р. Раманаў у фізічным выхаванні дзяцей надаваў вялікую ўвагу гульням, дзіцячым забавам: „Даўно вядома, што цацкі, гульні і разнастайныя забавы дзяцей маюць велізарнае значэнне ў выхаванні дзяцей увогуле і іх фізічным развіцці асабліва. Нездарма таму на іх заўсёды звярталі ўвагу многія мысленнікі і педагогі... Вельмі карысная гімнастыка, але, як справядліва заўважаюць некаторыя гігіеністы, яна параўнальна з найбольш уласцівымі ўзросту дзяцей рухамі ў гульнях складае да апошніх ні больш, ні менш як толькі дадатак” (55).

Фізічна выхоўваюць дзяцей і ўдзел апошніх у працы дарослых, прывучванне іх да розных карысных заняткаў. У беларускіх сем’ях здаўна заведзена, каб частку хатняй работы выконвалі дзеці, якія вельмі рана пачынаюць дапамагаць маткам мыць посуд, прыбіраць хату, паліваць кветкі, дагледаць жывёл, паліваць і палоць градкі, грэбці сена. Ва ўзросце дванаццаці–чатырнаццаці гадоў дзеці актыўна ўключаюцца ў працоўную дзейнасць бацькоў. Усё гэта развівае іх фізічныя, валявыя і маральныя якасці.

На фізічнае выхаванне станоўча ўплывае і грамадская думка, бо кожны хоча, каб пра яго гаварылі як пра моцнага, спрытнага, вынослівага чалавека. Асабліва гэта назіраецца падчас правядзення народных свят, калі ў час розных спаборніцтваў маладыя людзі мераюцца сіламі, паказваюць свой спрыт, уменне, кемлівасць.

У беларускай народнай педагогіцы галоўнымі метадамі фізічнага выхавання з’яўляюцца фізічныя практыкаванні, гульні, праца. А метады праверкі фізічнага развіцця – грамадская думка, выпрабаванні, спаборніцтвы, асуджэнне.

## ПЕДАГОГІКА МАЛЕНСТВА, ДЗЯЦІНСТВА І ЮНАЦТВА

УСЁ сваё жыццё беларус узгадняе з прыродай – прыродай навакольнага свету і прыродай самога чалавека. Таму ў аснове беларускай народнай педагогікі ляжыць прынцып прыроднай гармоніі.

Адпаведна гэтаму прынцыпу з'явілася ў народнай педагогіцы ўзроставая перыядызацыя: кожны перыяд аднесены да карэнных змен у натуральнай прыродзе чалавека, у яго ўзаемаадносінах з навакольным светам. Спынім увагу на трох першых перыядах.

І – ад нараджэння да шасці–васьмі гадоў.

ІІ – ад шасці–васьмі да чатырнаццаці гадоў.

ІІІ – ад чатырнаццаці да шаснаццаці–дваццаці аднаго года.

Першы перыяд – маленства. У народзе толькі што народжанае дзіця называюць немаўляткам. Ад нараджэння і да таго часу, калі дзіця яшчэ мала што разумее, не размаўляе і не ходзіць, было прынята таксама называць яго анёлкам. Як толькі дзіця пачынала свядома размаўляць, хадзіць і свядома ўспрымаць навакольны свет (гэта доўжылася да 6–8 гадоў), яго звалі блазнам, блызнюком, блазненкам, блызнянёнкам.

Клопат аб працягу роду пачынаўся ўжо ў час выбару нявесты або жаніха. Народ марыў пра здаровае і дужае патомства, здольнае забяспечыць пераемную сувязь пакаленняў. Грамадская думка не дапускала браку паміж аднакроўнымі сваякамі, заахвочвала імкненне парадніцца з фізічна дужымі, здаровымі людзьмі. Фізічнае здароўе, лічыў народ, – умова для дабрабыту новай сям'і не менш важная за працавітасць або высокамаральнасць яе стваральнікаў.

Вялікае значэнне надаецца наяўнасці дзяцей у сям'і. Пра гэта сведчаць, напрыклад, вясельныя звычаі і абрады. У многіх мясцінах Беларусі існуе абрад пасада: нявесту саджаюць на дзяжу з прыгатаваным цестам для каравая, спяваюць рытуальныя песні і па асаблівасцях „падняцця" цеста вызначаюць пладавітасць маладой пары. Акрамя таго, падчас вясельнага рытуалу нявесце па традыцыі перадаюць каравай – сімвал апладняльнай сілы.

Сур'ёзна ставіцца народ да нараджэння і выхавання дзяцей і нагадвае пра гэта ў вясельных тостах-пажаданнях маладым:

„Каб дзетак напладзілі і нагадавалі",

„Колькі ў хаце вугалочкаў, каб столькі было сыночкаў",

„Каб у нашага маладога было многа дочак і сынкоў, радасных дзянькоў!",

„Каб столькі было дочачак, колькі ў хаце дошчачак, а сынкоў, колькі ў хаце сучкоў",

„Дару чатыры падушкі, каб мелі чатыры дачушкі",

„Дару скрынку мукі, каб раждаліся сынкі".

Ідэал беларускага народа – мнагадзетная сям'я: „Сям'я гушчу любіць". Шчасце для сям'і, калі яна поўная, г. зн. калі ў ёй абавязкова ёсць дзеці: „Тут і я, тут і жонка мая, тут і дзеці, люба паглядзеці". Народ вучыць: „Без дзяцей ціха, ды на ста-

расці ліха", „Многа дзяцей – многа клопату, але і радасці шмат", „Дзе сыноў лава, там бацьку слава, дзе дачок лава, там матцы слава".

Дабрабыт сям'і залежаў ад колькасці працаўнікоў у ёй, адсюль імкненне мець многа дзяцей. Невыпадкова ў песні малады муж прасіў жонку:

„Радзі мне дзевяць сыноў,
А дзесятую дочку...
Сыны будуць поле баранаваць,
А дачка хустачкі ткаць" (52, 87).

Галоўнае – выгадаваць, выхаваць добрага працаўніка, які стане звяном у адзіным ланцугу пераемнай сувязі пакаленняў, сувязі бацькоў і дзяцей:

„І ззамаладу – на ўцеху,
А на старасці – на падмену.
Нам ручанькі падмяніць" (52, 81).

Аддаючы перавагу нараджэнню сыноў, якія павінны выканаць асноўную функцыю ў пераемнай сувязі пакаленняў і стаць апорай бацькоў у старасці, беларускі народ радуецца і нараджэнню дачок:

„Жана мая дарагая,
Радасць мая дарагая,
Нарадзіла мне сыночка,
Як яснага сакалочка,
Нарадзі яшчэ дачушку,
Як ясную сакалушку" (68, 82).

„А ў нашым садзе ўсе роўныя кветкі,
Сынкі, дачушкі – ўсе роўныя дзеткі" (52, 69).

У беларускіх сем'ях, за выключэннем вельмі бедных і вялікіх, нараджэнне дзяцей было радасцю. Таму ў народныя святы гаспадару дома зычылі многа дзяцей:

„Прачыстая ідзе, тры радасці нясе,
Первая радось – у твоім домі,
Другая радось – у твоім оборы,
Трэйця радось – у чыстым полі!
У твоім домі дробныя дзеткі,
У твоім оборы – волы, коровы,
У чыстым полі – буйна жыта..." (61, 81–82).

Імкненне мець многа дзяцей звязана з тым, што ў вялікай сям'і дзеці лягчэй гадуюцца: „Адзін сын – не сын, а баўтун", „...чка адна і та не людна", „Двое дзетак як дзве окі ў лобе",

„Адно дзіця – не дзіця, двое дзяцей – палова дзіцяці, трое дзяцей – гэта дзіця".

Нельга абысці праблему адносін бацькоў да дзяцей у шматдзетнай сям'і. Асаблівасць народнага выхавання ў тым, каб бацькі аднолькава любілі ўсіх сваіх дзяцей, не вылучаючы нікога. На спрадвечнае дзіцячае пытанне „Каго ты больш любіш?" у народа ёсць гатовы адказ: „Каторага пальца не ўрэж, то кожан баліць, будзь катораму дзіцяці кепска, то ўсё бацькам сэрца баліць". Яшчэ адно сведчанне педагагічнай мудрасці народа!

Напярэдадні нараджэння дзіцяці стараліся выканаць усе ўмовы і абрады, што садзейнічаюць нараджэнню здаровага і шчаслівага чалавека. Прымаўка заклікае: „Не радзіся красны, а радзіся шчасны". Нават у самых бедных сем'ях шукалі магчымасць пазбавіць будучую маці ад непасільнай працы. Беларускія этнографы ў сваіх даследаваннях прыводзяць шэраг перасцярог цяжарным жанчынам: не наступаць, напрыклад, на жывёліну, бо цела дзіцяці ад гэтага пакрыецца поўсцю; не наступаць на вяроўку, каб дзіця не задушылася пупавінаю; не спаць пры месяцы, каб дзіця потым не зрабілася лунацікам; не глядзець на нябожчыка або на падлу, а то дзіця захварэе на цынгу, не есці яешню з патэльні, каб цела дзіцяці было чыстае; не ўступаць у круг, які пакідае мокры посуд, каб цела наваародка не пакрылася каростаю; не краталь рукамі цела, калі спалохаешся пажару, каб у дзіцяці не аказалася чырвоных плямаў; не зашываць на сабе адзенне, не глядзецца ў люстэрка, не выліваць вады з акна, не карыстацца чужымі рэчамі, а то дзіця будзе аслабленае, нездаровае.

Задоўга да нараджэння дзіцяці бацькі задумваліся пра яго прызначэнне ў жыцці і пра мэтанакіраванае выхаванне. (Дарэчы, „народ" у гэтым выпадку – выхавальнікі дзіцяці ў шырокім сэнсе слова, г. зн. бацькі, сваякі, суседзі, усе кроўна зацікаўленыя ў яго правільным выхаванні.) У народным разуменні, „дасканаласць", „ідэал чалавека" – гэта канкрэтны вобраз: дзіця хочуць выгадаваць не проста працавітым, сумленным, разумным чалавекам з высокамаральнымі якасцямі і найлепшымі рысамі характару, але чалавекам, падобным на нейкага канкрэтнага народнага героя або на сваяка, знаёмага, які карыстаецца ўсеагульнай павагаю і любоўю. Адсюль звычай мінуўшчыны – абразаць пупавіну хлопчыка на сякеры або на кнізе, а дзяўчынкі – на калаўроце, ткацкім станку, каб яны сталі працавітымі, разумнымі, а таксама звычай загортваць дзіця ў адзенне найбольш паважанага чалавека або звычай называць дзіця ў яго гонар, каб разам з імем або адзеннем дзіця ўспрыняло іх уласныя якасці. Потым сам напамін пра гэта ў многім садзейнічае выхаванню. Самы

вялікі дакор у беларускіх сем'ях: „Ты ганьбіш сваё імя, гонар сваёй сям'і!" Самай жа вялікай пахвалой служаць словы: „Ты не зняславіў гонару свайго дома! Сям'я (маці, бацька, дзядуля, бабуля, г. зн. чалавек у доме асабліва аўтарытэтны, у чый гонар дзіця носіць імя) можа ганарыцца табою!", „Ты сапраўдны дзядуля" і да т. п. Чалавек, чыё імя носіць дзіця, часам нават сваёй нябачнай прысутнасцю не дазваляе адступіць ад маральных канонаў.

Свяшчэнным бацькоўскім абавязкам лічылася ахрысціць дзіця, знайшоўшы хроснага бацьку, хросную маці і будучых апекуноў. Выбар кума і кумы – няпростая справа. Бацькі раіліся паміж сабой, стараючыся выбраць кумамі найперш высокамаральных, а потым ужо забяспечаных людзей. Народ вучыць: „Каго паважаць, з тым і кумаваць". Толькі зрэдку, калі ў сям'і паміралі дзеці, знаходзілі выпадковых кумоў, што, паводле павер'я, павінна было забяспечыць наварodку жыццяздольнасць. Найперш выбірала парадзіха. Адмова ад абавязкаў хроснага бацькі або хроснай маці лічылася грахом. Аднак рознага роду забабоны і занятасць працай тым не менш не заўсёды дазвалялі атрымаць згоду ад асоб, выбраных бацькамі. Калі, напрыклад, жанчыны ахвотна ішлі ўпершыню хроснымі маці да хлопчыкаў, то да дзяўчынак ісці пазбягалі, бо, паводле павер'я, у іх будзе дрэнна расці лён. Нарэшце, калі хросныя бацькі былі знойдзены, вызначаўся дзень хрышчэння.

Перыяд ад нараджэння да хрэсьбінаў вядомы пад назвай „радзіны", падчас якіх праходзілі „адведкі", „ватпоты". На „адведках", „ватпотах", хрэсьбінах упершыню публічна паказвалі дзіця бліжэйшым сваякам, суседзям. Ва ўрачыстай сустрэчы з немаўлём бралі ўдзел ад малога да вялікага.

Па традыцыі найбольш урачыста і святочна абладжваўся дзень хрышчэння. Апрача сваякоў і суседзяў, на свяце прысутнічалі кумы, бабка-павітуха, якім адводзілася асаблівая роля не толькі ў гэты дзень, але і ў будучыні. У дзень хрышчэння дзіця паказвалі ўсім прысутным, перадавалі ад хроснага бацькі да хроснай маці, па чарзе, з рук у рукі, іншы раз пры гэтым цалуючы яго. Кожны благаслаўляў дзіця на доўгае шчаслівае жыццё, жадаў яму быць здаровым, багатым, працавітым.

Дзіцяці і яго бацькам жадаюць:

„Штоб вам у ём мець пацеху, у горасці – уцеху",

„Здароўя яму, быць вумнаму, разумнаму, шчасліваму, багатаму, радзіцелям пацехай ва маладосці, кармільцам іх старасці",

„Каб табе ў маладосці розуму прыдбала, а ў старасці вочы свяцілі".

За сталом падымалі тосты ў гонар малога:

„Штоб добра пахаў ды добра малаціў",
„Каб свой розум і навука далі сыну сілу ў рукі".
У песнях спяваюць:

„І дай жо, божа, дзіцяці
Добрую долю ўбачыць:
І хлебавую, і салявую,
Трэцюю — здаравейкую,
А сілачку — багатырскую,
А волю свабодную".

У гонар немаўляці па традыцыі пякуць хлеб, якім частуюць усіх прысутных, а таксама тых сваякоў, суседзяў, знаёмых, якія не змаглі прыйсці на ўрачыстасць. Атрымліваючы хлеб, трэба было благаславіць дзіця, пажадаць яму добрай долі, шчасця, здароўя, багацця, каб яно слухалася дарослых, а потым стала апорай бацькам у старасці. Хлеб сімвалізуе любоў да дзіцяці і абавязвае таго, хто прымае хлеб, аберагаць дзіця ў выпадку страты бацькоў.

Кумы і бабка лічацца сваякамі сям'і навародка, адказнымі за яго выхаванне. Прычым адказнасць гэта не фармальная, бо падтрымліваецца трывалай народнай традыцыяй і грамадскай думкай. Становішча, калі аб выхаванні канкрэтнага дзіцяці клапоціцца вялікая колькасць людзей, задавольвае ўсіх — і дзіця, і яго родных, і грамадства ў цэлым. Гэтая традыцыя — важны рэзерв выхавання. Такім чынам народ сфарміраваў мэтанакіраваныя педагагічныя традыцыі, звычаі і адпаведныя абрады, якія давалі ўпэўненасць у заўтрашнім дні дзіцяці: у любой жыццёвай сітуацыі яно будзе мець надзейнага абаронцу і выхавальніка.

Клапоціцца народ і пра выхаванне бацькоў. Нават калі роды прымаў урач, на ролю бабкі-павітухі па-ранейшаму выбіралі жанчыну з вялікім жыццёвым вопытам, якая можа даглядзець дзіця і дапамагчы парадай бацькам. Бабка-павітуха, кумы, бацькі-старыя, бліжэйшыя сваякі даюць маладым урокі маралі, вучаць выхоўваць дзяцей і весці хатнюю гаспадарку.

Усё гэта адлюстроўваецца ў радзінных песнях. Адна з іх сустрэлася ў матэрыялах, сабраных і ўпарадкаваных П. В. Шэйнам:

„Ты ходи, ходи ды Кулінушка,
Ты ходи, ходи ды Андреевна!
Буду цябе вучыць, як падвор'я вадзіць,
Буду цябе вучыць, як дзяцей гадуваць,
Буду цябе вучыць, як цялятак дзяржаць,
Буду цябе вучыць, як замчужку насіць:
Падвор'е вадзіць — не разіня рот хадзіць,

Дзяцей гадуваць — не санлівай быць,
Цялятак дзяржаць — не лянівай быць,
Замчужку насіць, а усе строгай быць...” (61, 19).

Многія абрады, звязаныя з нараджэннем дзіцяці, неслі выхаваўчую нагрузку. Напрыклад, абрад дзяліць „бабіну кашу” яшчэ больш радніў прысутных на свяце людзей, што ўрэшце дапамагала лепш выхаваць чалавека, які нарадзіўся. Адзін толькі прыклад. Па звычаях, на масленіцу бацькі разам з дзецьмі хадзілі ў госці да бабкі-павітухі, адорваючы яе падарункмі, а бабка, наладжваючы для дарагіх гасцей багаты стол, ішла назаўтра да сваіх дзяцей (61, 115).

Выхаванне – абавязак бацькоў: „Умеў дзіця радзіць, умей і вывучыць”, „Хто дзяцей мае, няхай навучае”. Узаемаадносіны бацькоў і дзяцей здаўна строга рэгуляваліся грамадскай думкай. У пачатку ХХ стагоддзя этнографы даследавалі сямейныя законы сялян Мінскай губерні. Было адзначана, што „ў сферу сямейнага жыцця яшчэ не прыйшоў пісаны закон; традыцыі сям’і надзвычай дарагія для селяніна, наша ж заканадаўства мала прымяняльнае ў гэтых адносінах да сялянскага побыту, і тут валасному суддзі, больш чым дзе б тое ні было, даводзіцца карыстацца запаветамі бацькоў і мірыць іх, прыстасоўваць да новых жыццёвых патрабаванняў, адстойваючы кожную дробязь народнай традыцыі... Погляд суда на адносіны дарослых дзяцей да бацькоў вельмі цікавы. Суд глядзіць так, што дзеці павінны падпарадкоўвацца бацькам, але калі яны не падпарадкоўваюцца, то бацькі самі вінаватыя ў гэтым” (22, 2, 21).

У няшчасці сваякі, хросныя бацькі, суседзі нярэдка замяняюць сапраўдных бацькоў, бяруць дзяцей на выхаванне. Гэта ў нейкай меры звязана са старажытным павер’ем беларусаў: „Хто не любіць чужых дзяцей, той ніколі не ўзгадуе ўласных: народжаныя дзеці будуць паміраць у раннім узросце” (42, 82). На ўсынаўленне дзяцей уплывае і грамадская думка. Яшчэ ў дарэвалюцыйны час этнографы адзначалі, што „прымаюць беларусы прыёмышаў вельмі ахвотна, асабліва падлеткаў, нават шматсямейныя. З аднаго боку, спадзяюцца на яго пасільную працу, з другога – прыём сірот складае маральны абавязак заможнага селяніна, асабліва сваяка сіраты. Прымусіць узяць можа нават грамадства або сваякі” (22, 40). Нярэдка ўсынаўленне было звязана з адсутнасцю ўласных дзяцей. У гэтым выпадку, як зноў адзначаюць этнографы, „лічаць за лепшае прымаць сваякоў асабліва тыя, хто разлічвае перадаць прыёмышу зямлю, гаспадарку. Беларус імкнецца да таго, каб „вочы закрыў” чалавек свайго роду (г. зн. сям’і: род разумеюць у гэтых выпадках у цесным сэнсе), менавіта той, які пасля яго будзе жыць у ягонай хаце, араць тую ж зямлю, што і ён араў

(закрыць вочы нябожчыку, асабліва гаспадару, абавязкова павінен старэйшы з мужчынаў, якія засталіся ў доме): а памерці, не пакінуўшы асобы, якая абавязана была б „пахаваць, вочы закрыць" (г. зн. без наступніка) беларус лічыць найвялікшым няшчасцем. У адносінах да прыёмыша ўсынавіцель заступае на месца бацькі. Прыёмыш называе яго бацькам, нават і тады, калі апошні яму даводзіцца дзядзькам... Радзей, але беларусы прымаюць „на права дачкі" і асоб жаночага полу, прычым яны карыстаюцца ўсімі правамі і становішчам дачок у сям'і" (22, 40, 41). Такім чынам, звычай усынаўлення і ўдачарэння, як мы бачым, традыцыйны для беларусаў.

Прыёмных бацькоў, якія клапоцяцца аб выхаванні дзяцей, народ праслаўляе, узводзіць у ранг маці, а бацькоў, якія грэбуюць сваім свяшчэнным абавязкам, асуджае: „Не тая маці, што спарадзіла, а тая, што выгадавала". Маці тая, якая вырасціла, выхавала, а не проста нарадзіла: „Дабранач, мамулька, дабранач! Але не тэй дабранач, што нанач, а тэй, што на ўвесь век".

Цэнтральная фігура ў беларускай сям'і – маці. Нават ва ўмовах дарэвалюцыйнага часу, калі нярэдка бытавала такая негатыўная з'ява, як пагардлівыя адносіны да жанчыны з боку мужчыны, роля і значэнне жанчыны значна ўзрасталі з пераходам яе ў новую якасць – у якасць маці, бо маці – галоўны выхавальнік у сям'і, ад яе ў многім залежыць, якім вырасце падрастаючае пакаленне, ці стануць дзеці надзейнай апорай бацькам. Народ вучыць бацькоў: „Што ў маленстве выхаваеш, на тое ў старасці абапрэшся", „Ніхто дзецям так не спагадае, як матка радная".

Вось як пісаў на пачатку XX стагоддзя этнограф М. В. Доўнар-Запольскі: „Становішча жанчыны ў беларускай сям'і далёка не можа быць названа прыгнечаным. Яна з'яўляецца поўнаю гаспадыняю ў сваёй сферы, памочніцай і дарадчыцай мужа. У адносінах да дзяцей народны погляд патрабуе таксама поўнай павагі з боку апошніх да маці. Дзеці наогул знаходзяцца пад яе наглядам; толькі хлопцы, гадоў з 14, калі яны ўжо падрастаюць настолькі, што становяцца прыдатнымі для лягчэйшых работ пры апрацоўцы зямлі, напрыклад возяць снапы, сена і іншае, пераходзяць у непасрэднае падпарадкаванне гаспадару дома. Да гэтага часу, а дзяўчаты да самага выхаду замуж, знаходзяцца выключна ў распараджэнні маці" (22, 14).

Народная педагогіка выпрацавала свой погляд на ролю маці ў жыцці чалавека. Маці – эталон маральнай чысціні, сімвал усяго самага дарагога на свеце. Беларускі народ сцвярджае: „зямля – маці", „зямелька – матка наша: і корміць, і поіць, і адзявае нас". Такім чынам, народ вучыць: маці – гэта

тое ж, што Радзіма, зямля-карміцелька, самае важнае, святое на свеце.

У беларусаў выхаванне дзяцей – свяшчэнны абавязак маці. Калі жанчына, што нарадзіла дзіця, адмовілася ад сваіх абавязкаў, яе чакае асуджэнне народа: „Не тая маці, што нарадзіла, а тая маці, што ўскарміла".

Людзі верылі ў Бога, і гэтая вера на дазваляла маці загубіць жывую душу. Народ строга патрабаваў ад бацькоў: „Хто народзіць дзяцей, той і выхадзіць", „Умеў дзіця радзіць, умей і вывучыць". Нават калі жанчына нарадзіла ў дзявоцтве, вера ў Бога і грамадская думка не давалі ёй адмовіцца ад дзіцяці або кінуць яго. Хаця маці ведала, што яе чакае цяжкае выпрабаванне, яна не магла ўзяць грэх на душу і пагрэбаваць сваім святым абавязкам.

Задоўга да з'яўлення дзіцяці маці пачынае аб ім клапаціцца: шые пялёнкі, адзенне, вяжа чэпчыкі, кофтачкі, чаравічкі, пытаецца парады ў больш вопытных жанчын, як спавіваць дзіця, загартоўваць, карміць, выхоўваць. Клопат жанчынымаці – дзіця. Народ заўважае: „Маці сама не з'есць, а дзіця накорміць", „У каго маці родненька, у таго сарочка беленька", „У каго матка, у таго галоўка гладка". Самая жорсткая крыўда для маці – знявага яе дзіцяці: „Узяў дзіця за руку, матку бярэш за сэрца".

Клопат маці – выхаванне дзіцяці: „Матка дзяцей вучыць". Высока ацэньваюць ролю маці самі дзеці: „Мая матка не адкладала да пятка (лятка)". Маральны прыклад маці ўплывае на выхаванне: „Дзеўка маткаю красна", „Няма чаго дзівавацi, такая была і маці", „Якая матка, такое й дзіцятка", „Ад злой маткі злыя і дзеткі", „Матка вінавата, што дачка чаравата", „Пазірай на матку, а жаніся на яе дзіцятку".

Маці – лепшы сябар свайму дзіцяці: „Нет лучшай altruжачкі, як родная матка". У любым узросце маці застаецца маці, яна нясе на сабе ўвесь цяжар жыцця, аберагае нас ад нягод, яна лепшы дарадчык, маральная апора: „ Матчыны рукі заўсёды мяккія". Добрыя, ласкавыя матчыны рукі – сімвал мацярынскага клопату, яе штодзённай працы па фарміраванню чалавека: „Родную маці нікім не заменіш", „Другой маткі не знойдзеш", „Без маткі і сонца не грэе".

Мудры народ заклікае берагчы маці: „Беражы маці, яна не будзе век целепаці", „Усяго за грошы купіш, апроч бацька-мацеры", „Няма тых лавак, дзе кушляюць родных мамак".

Адзінкавыя выпадкі, калі дзеці вырастаюць і больш не клапоцяцца пра маці, ігнаруюць яе меркаванні, прывычкі, не наведваюць яе або нават спрабуюць ад яе пазбавіцца. Грамадская думка строга асуджае гэта („Маці датуль міла, пакуль пялёнкі мыла", „Як навучыўся, то і матку забыўся") і, заклі-

каючы такіх дзяцей адумацца, прымушае іх узяць на сябе натуральны абавязак у адносінах да старых бацькоў.

М. Доўнар-Запольскі пісаў: „Народны погляд патрабуе, каб дзеці шанавалі маці, а малодшыя члены сям'і – гаспадыню і наогул старэйшых жанчын" (22, 273). У беларускай сям'і дагэтуль захоўваюцца шматвекавыя традыцыйныя адносіны да жанчыны як да гаспадыні дома і маці – выхавацелькі дзяцей.

У дзяцінстве бацькі – прыклад і аўтарытэт. Іх паводзіны – узор для перайманння. Можна сказаць, што фарміраванне дзіцяці ў першыя гады жыцця адбываецца найперш пад уплывам бацькоў, галавы дома. А ў беларускай сям'і галавою яе можа стаць толькі той, хто мае аўтарытэт, прыклад у побыце, справядлівы, добры гаспадар і працаўнік. Вось як пра гэта пісаў М. В. Доўнар-Запольскі: „Улада гаспадара ў сям'і не бывае дэспатычнаю, таму што ўсялякая несправядлівасць з яго боку ў адносінах да каго-небудзь з членаў сям'і, нявопытнасць у працы, няўмелае валоданне маёмасцю, нарэшце п'янства і лянота – непазбежна вядзе да разрыву сям'і, да падзелу яе, або пераходу гаспадаркі ў іншыя рукі, напрыклад, да старэйшага сына ў сям'і, або да брата гаспадара. Гаспадар абавязаны не толькі рабіць тое, чаго патрабуюць інтарэсы сям'і, але і сваёю асабістаю работаю ён павінен служыць прыкладам астатнім членам сям'і" (22, 272).

У штодзённых адносінах выпрацоўваліся нормы і правілы, уласцівыя маралі працоўнага народа.

Фальклор выразна крышталізуе ўяўленні беларускага народа аб уплыве сямейных асноў на фарміраванне дзіцяці: „Дзе ў сям'і лад, там і дзеці добра гадуюцца", „Па гнязду відаць, якая птушка", „Якое дрэва, такі клін, які бацька,такі сын", „Няма чаму дзівавацi, такая была і маці", „Які бацька, такія дзеткі", „Якая матка, такое й дзіцятка", „Балмошная матка, балмошнае й дзіцятка". Галоўнае, лічыць народ, – каб бацькі былі высокамаральнымі людзьмі. Маральны прыклад і аўтарытэт бацькоў – аснова сямейнага выхавання: „Харошых бацькоў харошыя дзеці", „Добрага бацькі – добрыя дзеці, ліхога – ліхія", „Не бацькоўская паходка трэба сыну, а бацькоўская кемлівасць".

Пра добрых бацькоў-выхавальнікаў народ гаворыць: „Каб я так сваіх дзетак дагадавала".

Старэйшае, больш вопытнае пакаленне не мае магчымасці браць паўнацэннага ўдзелу ў працоўным жыцці сям'і, затое клапоціцца пра выхаванне малых дзяцей. Бабулі і дзядулі садзейнічалі не толькі фізічнаму развіццю дзіцяці, але і разумоваму, эстэтычнаму, маральнаму, знаёмілі дзяцей з народнымі традыцыямі і звычаямі. Пазбягаючы павучанняў, яны ў расказах і казках, прымаўках і прыказках, у легендах і па-

вер'ях перадавалі свой жыццёвы вопыт. Як сведчаць этнографы, „дзе б ні знаходзіўся беларускі селянін, раз яму дазваляе вольны час або не празмерна цяжкая фізічная праца, ён прыступае да казак, расказаў і да т. п." (58, III).

Ролю старых у выхаванні дзяцей паказвае, напрыклад, пахавальны плач унучкі па бабулі:

„Бабулічка наша родная, а нашто ж ты нас пакідаеш? Ты ж нас калыхала і гадавала, наша труджаніца, наша бабулічка, а цяпер ты нас астаўляеш! Мы ж твае ручкі патарвалі, – нас носючы, твае ножкі прытамілі, – нас калыхаючы, прыказкі нам усякія співаючы – бабусічка наша роднінькая!" (54, 537).

Здаўна беларусы прыцягваюць старэйшых дзяцей да выхавання малодшых. Е. Р. Раманаў, вядомы этнограф, вельмі пераканаўча расказваў пра гэту беларускую традыцыю. Ва ўсіх без выключэння сем'ях старэйшыя дзеці няньчылі малодшых, даглядалі іх. Дзіця ва ўзросце ад 5 да 7 гадоў увогуле лічылася ў сям'і нянькай. Старэйшыя дзеці забаўляюць, гуляюць, даюць першыя ўрокі маралі малодшым братам і сёстрам. Гэта было вельмі важна ва ўмовах дарэвалюцыйнай Беларусі, калі маці-парадзіха часта літаральна адразу ж пасля нараджэння дзіцяці абавязана была брацца за цяжкую сялянскую працу і не мела ніякай магчымасці аддаць належную ўвагу немаўляці, а потым і дзіцяці першых гадоў жыцця. Старэйшыя дзеці, выхоўваючы малодшых, развівалі і сваю ўласную самастойнасць, адказнасць за даручаную справу, рыхтавалі сябе саміх да будучага сямейнага жыцця.

Фальклор указвае на такі ўдзел старэйшых дзяцей у выхаванні малодшых:

„Наша мама – парадніца,
Дзевяць сыноў парадзіла,
Дзевяць сыноў парадзіла,
А дзесятую дачушку.
Яе браты калыхалі,
Калышучы, прымаўлялі:
„Люлі, люлі, сястрыца,
Спі доўга, расці скора,
Сваёй маме на пацеху,
Чужым людзям на ўспамогу" (48, 315).

„І харош, і прыгож Кастуська,
Ці не сонца яго радзіла?
Радзіла яго матулька,
А гадаваў татулька,
А калыхалі братулькі,
І няньчылі сястрыцы" (25, 446).

Ледзь не адзіным сродкам выхавання ў сялянскай сям'і была народная педагогіка. Незаменнымі памочнікамі бацькоў з самага нараджэння дзіцяці былі калыханкі, забаўлянкі,

лічылкі, дражнілкі, скорагаворкі, а потым – казкі, прымаўкі, прыказкі, загадкі.

Першае, з чым сутыкаецца дзіця ў сваім жыцці, – калыханкі. „Слухаючы такую песню – гэтую вечную неўміручую песню мацярынскай любові, – міжволі думаеш, магчыма, менавіта адсюль, вось з такой калыханкі, з яе самай простай і геніяльнай на зямлі мелодыі і пачынаецца чалавек", – адзначае беларускі літаратуразнаўца і фалькларыст Н. С. Гілевіч (19, 173).

У калыханках маці спявае пра ўсё, што ёй блізкае і знаёмае, спявае пра сваё жыццё, прыродныя з'явы, пра людзей, пра рабочыя працэсы, з якімі яна сутыкаецца. Дзіця змалку, дзякуючы калыханкам, пазнае навакольны свет, у яго складваецца пэўнае светаразуменне, бацькі ў калыханках перадаюць дзіцяці свае этычныя і выхавальныя погляды.

У недакучлівай форме, іншы раз нават у выглядзе звароту да жывёл, прывівае калыханка дзіцяці навыкі паводзін:

„Не хадзі, коцік, па пячы,
Буду біць ў плячы.
Не хадзі, коцік, па масту,
Буду біць па хвасту,
Не хадзі, коцік, па лаўцы,
Буду біць па лапцы.
Не мні, коцік, падушкі,
Буду драці за вушкі" (21, 86).

Калыханкі выхоўваюць у дзяцей працавітасць: „Праў кот кудзелю", знаёмяць з паслядоўнасцю працоўных працэсаў:

„Там красёнцы ткала
І кудзельку прала.
На сонцы бяліла,
На ветры сушыла,
Кашульку пашыла" (21, 134),

выхоўваюць адказнасць за народнае дабро:

„Ехаў каток ды па дрова,
Загарэлася дуброва.
Пайшоў каток ваду насіці,
Стаў дубровушку тушыці" (21, 100) і да т. п.

Вядомы этнограф і педагог Р. С. Вінаградаў адносіў калыханкі да важных сродкаў „матчынай школы" (16, 13), адзначаючы, што ўсімі сваімі вартасцямі яны абавязаны народнай педагагічнай практыцы.

Традыцыйны для беларусаў ласкавы зварот маці да свайго дзіцяці: „Агу, Васілёк, Васілёчак мой маленькі!", „Ах маё сакалянятка!", „Кравіначка ты мая!", „Мой кроўнічак дарагі, дзіцёначак ты мой!", „Дзеткі мае, галубяткі мае!", „Ластавачка мая маленькая!", „Маліпінька мая!", „Мой ты каласок!", „Птушанятка маё маленькае", „Сыночак мой любінькі". Гэта дапамагае, па-першае, усталяванню цеснага кантакту паміж маці і дзіцем, па-другое, – фарміраванню нервовай сістэмы (у ласкавай маці дзіця спакойнае), што вельмі важна для далейшага развіцця асобы. У дзіцяці выхоўваюцца добразычлівыя, ветлівыя, мяккія адносіны да людзей.

Народная педагогіка выпрацавала шэраг працейшых метадаў знаёмства дзіцяці з навакольным светам. Спавіваючы дзіця, гуляючы з яго ручкамі, ножкамі, маці ласкава дакранаецца да асобных частак цельца і называе іх („Мая ты галовачка"), а таксама розныя дзеянні дзіцяці („Мой сынок спатанькі захацеў", „Пацягушэнькі, на Ваню парастушэнькі", „Хочаш естанькі, мая дачушка?", „Хадзі сядзь, мой малесенькі", „На ката пацягушкі, а на дзеці растушкі").

Першыя ў жыцці дзіцяці гульні ўжо дапамагаюць яго развіццю. Е. Р. Раманаў адзначаў сярод дзіцячых гульняў „Кую, кую ножку", якая вучыць дзіця назіраць навакольны свет і знаёміць яго з часткамі чалавечага цела: „Тая ж нянька бярэ адной рукой ножку дзіцяці, а другой злёгку пляскае па падэшве ступні і спявае:

„Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Куплю чаравічкі,
Ножкі невялічкі.
Трэба коня падкаваць,
Штоб далёка начаваць.
Тут пень, тут калода,
Тут сцюдзёная крыніца,
Тут халодная вадзіца,
Вадзіца!
І шчыкоча ножку" (54, 587).

Гульні дзяцей – неад'емная частка іх жыцця. Маці, бацька, бабуля, дзядуля, няня-сястрычка або брацік даюць малому спачатку „цацкі", неабходныя для смактання і прарэзвання зубоў, а пазней, як умацуюцца ручкі і ножкі, і дзіця не будзе ўжо цягнуць у рот усё без разбору, – разнастайныя „лялькі" – прадметы штодзённага хатняга ўжытку.

Спачатку дзіця не размяжоўвае паняцці „цацкі" і „лялькі". Пазней яно назаве „лялькамі" ўсё падобнае на людзей (лялек і нават маленькіх дзяцей), а „цацкамі" – астатнія цацкі.

Прычым „цацкі" – гэта часцей за ўсё ўжо гатовыя цацкі, а „лялькі" – гэта цацкі, зробленыя дарослымі спецыяльна для дзяцей або створаныя дзіцячай фантазіяй.

Гульня ў „лялькі" іншы раз суправаджае дзяўчынку ад маленства і да выхаду замуж. Хлопчыкі гуляюць у „лялькі" часцей за ўсё ў дзяцінстве, у падлеткавым жа ўзросце – рэдка. Аднак і гэтага бывае дастаткова, каб выхаваць у хлопчыку адказнасць за будучую сям'ю.

Будучых бацькоў-выхавальнікаў пачынаюць рыхтаваць з маленства. Дзяўчынка з ранняга дзяцінства рыхтуецца да ролі маці. Першай цацкай беларускай дзяўчынкі ва ўсе часы была лялька. Калісьці самаробная – саламяная, пашытая з анучак, драўляная, гліняная, іншы раз лялькаю лічыўся кавалачак галінкі або шышка. Пазней ляльку выраблялі на фабрыцы. Але сутнасць не ў гэтым. Няважна, у якія строі апранаюць ляльку, прыгожая яна або не. Усё роўна гэта любімая цацка дзяўчынкі, яе лялька, яе дзіця. З ёю можна пагуляць у „маму і тату", у „дочкі-маці", падзяліцца запаветнымі думкамі. У дзіцячым узросце аўтарытэт маці настолькі вялікі, што дзяўчынка хоча пераймаць яе ва ўсім. І калі прыглядзецца да гульняў дзяўчынкі, то пачуеш і ўбачыш, што ў гульні з лялькаю яна паўтарае ўсё тое, што робіць яе маці. Усе свае жыццёвыя назіранні дзяўчынка пераносіць на гульню з лялькай. Яна гатуе ляльцы ежу, шые сукенку, кладзе яе спаць, напяваючы калыханку, корміць, вядзе гуляць, навучае, „выхоўвае" сваё дзіця. Лялька – сяброўка дзяўчынкі, яе талісман, цацка на ўсё дзяцінства.

Распаўсюджанымі цацкамі дзяцей былі ваўчок, мячык, жужалка, конь у выглядзе палкі, лодка з берэсту і сасновай кары, кошыкі, скрыначкі, вянкі, млын-вятрак, розныя гліняныя самаробкі, часцей за ўсё птушка-свісцёлка. Радзей сустракалася цацка „пілавальшчыкі", выробленая з тоўстай дошкі і сімвалізуючая пілавальшчыкаў бярвенняў.

Сярод цацак, што дапамагалі эстэтычнаму і музычнаму выхаванню, былі распаўсюджаны „пішчалкі", выробленыя з гусінага пер'я, „свісцёлкі" з лазовай кары або пустых ствалоў бузіны, з гліны, радзей – „трашчоткі", зробленыя з падручных матэрыялаў, напрыклад, з дошкі, праз якую наскрозь прасунута ручка, „труба", зробленая з гарбузовага ліста.

Разнастайная выхаваўчая накіраванасць гульняў. Яны дапамагаюць пераключыць увагу дзіцяці, супакоіць яго. Калі малы пачынае капрызіць, маці гуляе з ім у „сароку". Вось як апісваў гэта Ю. Ф. Крачкоўскі: „Калі дзіця сядзіць на руках у маці і бывае неспакойнае, маці стараецца вучыць яго наступным чынам: вучыць, што называецца ў сялян, сароку: чыкі, чыкі, сарока, кажа маці, прыляцела здалёку, стала кашку

мяшаць, дзеткам стала даваць; пералічваючы пальчыкі дзіцяці, працягвае: гэтаму дала, а гэтаму (мезенцу), не дала, бо гэты малы, круп не драў, хлеба не мясіў, кашы не варыў; яму кашка пад лаўкаю, зарасла мураўкаю, яго лыжачка на паліцы, зарасла ў камяніцы, шуш, шуш, гацю!" (35, 178).

Ужо ў маленстве гульня ўнушала дзіцяці: каб нечага дабіцца ў жыцці, трэба папрацаваць.

Гульні развіваюць увагу і мысленне малога, назіральнасць і кемлівасць. „Калі маленькія дзеці застаюцца дома з падлеткамі, іх забаўляюць наступнай гульнёю: усе ставяць указальныя пальцы на стол у адно месца. Тады старэйшы кажа:

– Гусі ляцяць!

І паднімае руку ўгору, паказваючы наглядна, як гусі ляцяць.

Дзеці адказваюць:

– Ляцяць!

І таксама ўзнімаюць рукі.

– Качкі ляцяць!

– Ляцяць!

– Вераб'і ляцяць!

– Ляцяць!

– Мухі ляцяць!

– Ляцяць!

– Шчупакі ляцяць!

Захапіўшыся, дзеці часта адказваюць:

– Ляцяць!

І ўзнімаюць рукі. Старэйшы пляскае іх па руках і крычыць:

– Не ляцяць, не ляцяць!

Потым зноў спачатку:

– Гусі ляцяць! Вароны ляцяць! Сарокі ляцяць! Каровы ляцяць!

Але навучаныя вопытам дзеці ўжо не ўзнімаюць на карову рук і маўчаць. Тады зноў:

– Гусі ляцяць! Лебедзі ляцяць! Салаўі ляцяць! Дубы ляцяць!

Гэты своеасаблівы ўрок натуральнай гісторыі заканчваецца тады, калі ўвага малышоў стоміцца, і яны пачынаюць неўпапад узнімаць і не ўзнімаць рукі" (54, 586).

Гэта прыклады самых ранніх гульняў, якія арганізуюць для дзяцей старэйшыя (бацькі, бабулі, дзядулі, браты і сёстры).

Па меры сталення дзяцей іх гульні набываюць усё больш самастойны характар. Дарослыя і старэйшыя дзеці толькі ў крайнім выпадку ўмешваюцца ў дзіцячую гульню, у асноўным для таго, каб падказаць традыцыйныя асаблівасці і правілы, з якімі маленькія дзеці яшчэ незнаёмыя.

Этнографы ў сваіх даследаваннях адзначалі некаторыя характэрныя асаблівасці кіравання дзіцячай гульнёю з боку дарослых, народжаныя народнай выхаваўчай практыкай. Удзел дарослых у дзіцячых гульнях педагагічна абгрунтаваны: „Тут застаецца цалкам прызнаваць толькі гульню першых і настаўніцкае кіраўніцтва другіх, за якім следуе толькі заахвочванне, нагляд і простае назіранне за тым, як ідзе навука, або як выказваецца дзіцячая рухавасць, дзіцячая вынаходлівасць: усмешка, заахвочвальны смех ды кароткае адабрэнне словамі – вось апошні ўдзел дарослых у гульнях дзяцей ранняга ўзросту" (40, 55).

У той жа час не абыходзілі маўчаннем і негатыўны ўплыў старэйшага пакалення на выхаванне дзяцей праз гульню; імкненне старых (бабуль і дзядуляў) пазбавіць дзяцей рухомых гульняў з-за небяспекі фізічнай траўмы.

У беларускай народнай педагогіцы сфарміраваліся пэўныя адносіны да дзіцячых гульняў: дарослыя не павінны перашкаджаць дзецям гуляць у сюжэтна-ролевыя гульні і не павінны разбураць дзіцячыя збудаванні. Можна толькі ненадакучліва кіраваць дзіцячай гульнёю, падказваючы дзецям традыцыйныя правілы гульні. Такія адносіны дарослых да дзіцячых гульняў падтрымліваюцца народнымі павер'ямі, згодна з якімі дзіцячыя гульні маюць прароцкі характар. Лічыцца, напрыклад, што гульня ў лялькі прадказвае хуткае з'яўленне ў доме немаўляці, дрэнныя ж адносіны да лялькі – хваробу, а „пахаванне" лялькі, збудаванне крыжа з саломкі або галінак ці скрыначак – смерць. Хлебныя аладкі, зробленыя дзецьмі, прадказваюць добры ўраджай. Гульня з каменьчыкамі, шышкамі, глінянымі фігуркамі каровак, свінак або іншай хатняй жывёлы азначае ўдачу ў жывёлагадоўлі. Збудаванне печаў прадказвае пажар улетку, будаўніцтва розных гаспадарчых будынкаў звязваецца з заможнасцю. Знішчэнне жаб і насякомых – урадлівасць і вайну. Аднак у любой сітуацыі, нават у выпадку прадказвання няўроду, смерці, народ лічыў, што нельга перашкаджаць дзецям гуляць, інакш дарослых чакае пакаранне Бога, які кіруе дзіцячай гульнёю.

Этнографы падкрэслівалі, што ў беларускай народнай педагогіцы існуе асаблівая з'ява, якая ўзмацняе выхаваўчы ўплыў народных гульняў на гульні маленькіх дзяцей. У сем'ях, дзе жылі доўгажыхары, якія „здзяцініліся", можна было назіраць сумесныя гульні маленькіх дзяцей і старых-дзяцей. Прычым народ патрабаваў павагі да гульняў дзяцей з доўгажыхарамі, што „здзяцініліся". Боская кара чакала таго, хто дазваляў сабе або дзецям, падлеткам, моладзі, пабочным людзям пакрыўдзіць старэнькага. Дарослыя члены сям'і не дапускалі, каб чужыя людзі ўбачылі дзіцячыя гульні старых.

Дзеці ж, што гулялі са старымі, рана прывучаліся да міласэрнасці, павагі да старасці і, паводле павер'я, павінны былі жыць доўга і ў свой час таксама стаць старымі-дзецьмі.

У дзіцячых гульнях можна ўбачыць усю разнастайнасць жыцця беларускага народа. Сюжэтна-ролевыя гульні, створаныя фантазіяй дзіцяці, аднаўлялі рэальныя з'явы і падзеі, паўтаралі ўвесь уклад сямейнага, грамадскага, працоўнага жыцця сялян і рамеснікаў. Дзеці па прыкладу старэйшых віталіся ў гульнях: „Добрай раніцы!", „Добры дзень, добры дзень добрым людзям!", „Добры дзень!", „Добры дзень! Добрага здароўя!", „Добры дзень старым людзям!", „Добры дзень у хату!", „Добрага дня!", „Здароў!", „Бывай здароў!", „Здраствуй, добры чалавек!", „Лягчыся з дарогі, сядзь, пасядзі!", „Добры вечар добрым людзям!" Развітваючыся, яны казалі: „Добрай ночы! (Дабранач!)", „Заставайцеся здаровы", „Бывайце здаровы". У пашане былі словы ўдзячнасці, дзіця вучылася гаварыць іх адразу пасля слоў „мама", „тата", „баба", „дзед": „Дзякаваць вам!", „Дзякуем вам за ваша добрае слова", „Дзякуй (дзякую, дзякуем)", „Дзякуй табе, галубе, за добрае слова". У гульнях замацоўваліся элементарныя правілы народнага этыкету.

У гульнях дзеці гадавалі жывёлу, якую ім замянялі каменьчыкі, палачкі, шышкі, апрацоўвалі ўяўнай сахой зямлю, садзілі бульбу або сеялі жыта, праполвалі, рыхлілі зямлю, жалі спелыя каласы, вязалі снапы, малацілі – аж да атрымання гатовага хлеба. Гулялі дзеці і ў „тату і маму". Гулялі ў вяселлі з элементамі традыцый, звычаяў, абрадаў. Гулялі ў радзіны, хрэсьбіны, іншыя сямейныя святы і ўрачыстасці, у якіх па традыцыі бралі ўдзел змалку.

У гульнях адлюстроўвалі кожную дробязь сямейнага жыцця. Гуляючы ў „сям'ю", дзеці паўтаралі інтанацыі, жэсты, міміку сваіх бацькоў, бабуль і дзядуляў, братоў і сясцёр. Рыхтуючыся да трапезы, у гульнях, як і ў жыцці, усаджваліся за ўяўны стол па старшынству. Трапезу пачыналі з малітвы, потым „галава сям'і" падаваў знак дазволу брацца за ежу. Абыгрываліся розныя сітуацыі, якія маглі быць за сталом: дзіця правінілася (разліла страву на стол, пачало размаўляць, катаць хлебныя мякішы, карміць ката, сабаку, не выходзячы з-за стала, і г. д.) і атрымлівала маральны ўрок ад „дарослых". Як і ў рэальным жыцці, „галава сям'і" падводзіў вынікі за дзень, даваў распараджэнні назаўтра, караў тых, хто правініўся.

Дзеці, падрастаючы, усё часцей уключалі ў свае гульні элементы не толькі сямейна-абрадавага, але і каляндарна-абрадавага жыцця. У дзіцячую гульню пераносіліся прымаўкі і прыказкі, песні, прыкметы, якія шырока ўжываліся ў паўсядзённым жыцці. У гульні паўтараўся і замацоўваўся маральны кодэкс.

Акрамя вышэйназваных, папулярнымі былі гульні, галоўная мэта якіх – фізічнае развіццё. З'явіўшыся ў выніку натуральнага імкнення дзіцячага арганізма да руху, да творчасці, гэтыя гульні склалі для дзяцінства цэлы шэраг „бав" і „гул", распаўсюджаных на Беларусі.

Гульні праходзілі ў асноўным на свежым паветры. У іх, як правіла, удзельнічалі як хлопчыкі, так і дзяўчынкі. Улетку, звычайна басанож і ў адной кашулі, яны праводзілі на вуліцы ў гульнях увесь светлавы дзень. Дарослыя маглі не хвалявацца, бо дзеці знаходзіліся ў час гульні пад наглядам старэйшых дзяцей або старых. Да пяці гадоў малышоў апякалі дзеці-нянькі і старыя-нянькі, а з пяці гадоў яны самі рабіліся нянькамі сваіх малодшых братоў і сясцёр і адказвалі за іх бяспеку.

Любімымі рухомымі гульнямі дзяцей былі „конікі", „абгонкі", „каток", „кулянне", „кулякушкі", „палачка-вяровачка", „хованкі", „класы", „ходы на кывілах", „ходы на кырачках", „боркі", „скокі і пераскокі", „швыргі", „пераця́жкі", „возіцца".

З ростам дзіцяці адбывалася палавая дыферэнцыяцыя гульняў. Дзяўчынкі ўсё больш аддавалі перавагу „лялькам", а хлопчыкі – фізічным гульням, спаборнічалі ў спрыце, сіле, пругкасці. Этнографы адзначалі: „Хлопчыкі пераймаюць мужчын, дзяўчынкі – жанчын. Хлопчык бярэ бізунок і палачку („пужку і кіёк") або двое хлопчыкаў бяруць доўгі пояс; за яго канцы бярэцца адзін, а другі ззаду кіруе першым, з „пужкай" у руках, і такім чынам „гуляюць у коней". Іншы раз, узяўшы нож, хлопчык стараецца зрабіць сабе якую-небудзь цацку-палачку, крыжык, карыта, лодачку і інш. Матэрыялам служаць, акрамя дрэва, кара, бульба, гарбуз. Дзяўчынкі таго ж узросту робяць сабе „ляльку" з розных шматкоў, кладуць яе ў скрыначкі „калыскі" і стараюцца закалыхаць" (45, 88).

Гадоў з шасці – васьмі дзеці ўступалі ў падлеткавы перыяд, або, як у народзе гаварылі, у „блазноцтва". У гэты час упершыню падзялялі дзяцей па палавой прыкмеце, хлопчыка апраналі ў штаны, а дзяўчынку – у спаднічку. Хлопчыкі цяпер ужо хадзілі ў лазню толькі з мужчынамі. Дзяўчынку пачыналі называць „блазнаўкай", „блазноткай", хлопчыка „блазнам".

Дзіця паступова пачынала выконваць усю прасцейшую хатнюю работу: няньчыла дзяцей, прыбірала пакоі, даглядала жывёлу і пасвіла яе. Дзяўчынак з сямігадовага ўзросту прывучалі прасці, а там, дзе ў сем'ях былі ў асноўным хлопчыкі, гадоў з сямі да пятнаццаці пралі і яны. Прычым бацькі не стараліся аберагаць дзяцей ад працы, як у папярэдні перыяд, а, наадварот, імкнуліся захапіць дзіця ўсімі пасільнымі відамі сямейнай працы, радаваліся жаданню дзіцяці дапамагчы па гаспадарцы і ўсяляк заахвочвалі: усмешкай, ласкавым сло-

вам, падзякай у выглядзе ласунка, пахвалой пры чужых людзях, трапнай прымаўкай.

Клопат народа аб працоўным выхаванні знаходзіў сваё ўвасабленне ў своеасаблівых абрадах і павер'ях. Каб дзіця было добрым і ўмелым работнікам, першы яго самастойны выраб кідалі ў агонь або знішчалі нейкім іншым спосабам. Рабіць гэта рэкамендавалася ў адсутнасць дзіцяці. Змалку дзіцяці давалі ў рукі нож, сякеру, іншыя вострыя прылады працы. Калі дзіця парэжа руку, не засмучаліся, а лічылі, што затое потым яно будзе добра выконваць работу.

Пераход з маленства ў падлеткавы перыяд (перыяд дзяцінства) суправаджаўся ў сялянскіх сем'ях пасвячэннем у пастухі. Гэтая своеасаблівая ініцыяцыя знаменавала сабой зусім іншы лад жыцця як хлопчыка, так і дзяўчынкі. З аб'екта выхавання дзіця ператваралася ў суб'ект выхавання. Калі ў першыя шэсць-сем гадоў жыцця галоўнымі выхавальнікамі былі бацькі, бабулі і дзядулі, блізкія сваякі (кумы, бабка-павітуха), старэйшыя браты і сёстры, то падлетак ужо выхоўваецца самастойна. Значна ўплывае цяпер на яго сталенне ўвесь лад грамадскага, сямейнага, працоўнага жыцця ў гэтай мясцовасці, равеснікі, найбольш паважаныя людзі, грамадская думка.

Дзіця і яго родныя загадзя рыхтаваліся да будучага пастухоўства. Яно ўспрымалася як радасная падзея ў жыцці не толькі самога дзіцяці, але і ўсёй сям'і. Прадчуванне будучай работы хвалявала і радавала падлетка. У яго з'яўлялася пачуццё ўласнай годнасці, пачуццё гаспадара. Работа ў якасці пастуха была прызнаннем яго самастойнасці, давала пэўную свабоду, радасць сустрэч з равеснікамі.

Ролю своеасаблівага выхавальніка выконваў тут дарослы чалавек, пастух, пад наглядам якога быў не толькі грамадскі статак, але і аднагодкі-пастушкі. Выхаванне не было дакучлівым, бо старэйшы пастух, нават стары, успрымаўся дзецьмі як старэйшы таварыш, паплечнік у агульнай працы, дарадчык у цяжкай справе, больш вопытны работнік, з якога трэба браць прыклад. Галоўнымі ж выхавальнікамі былі іншыя пастушкі. Дзіця старалася з гонарам несці ўскладзеную на яго адказнасць. Падлетак хацеў, каб да яго ставіліся як да дарослага, з павагаю. Ён прывучаўся да працоўнай дысцыпліны: уставаў на золку, своечасова, без пярэчанняў, выконваў усе даручэнні, якія атрымліваў ад старэйшага пастуха. Пачуццё ўласнай годнасці, важнасці ўскладзеных на яго абавязкаў не давала дзіцяці праспаць ранішні выган жывёлы. Яно вучылася пераносіць усялякія фізічныя нягоды, без якіх работа пастуха немагчымая: холад, дождж, слату, спёку, вучылася не баяцца навальніцы, буры.

Падлетак засвойваў такі погляд на адносіны да жывёл, які патрабаваў клопату, павагі, любові і дзейснай увагі. Змалку дзіця бачыла, як бераглі бацькі жывёлу, як стараліся своечасова пакарміць яе, напаіць, абараніць ад ветру і холаду. Малыя назіралі, як шануюць карову-карміцельку, як клапоцяцца пра будучае яе патомства, як хвалююцца пры нараджэнні цялят, а потым выхаджваюць іх, як маленькіх дзяцей. Селянін ведаў, што здароўе і дабрабыт жывёлы – умова здароўя і дабрабыту яго сям'і. Гэта думка вельмі рана засвойвалася падрастаючым пакаленнем, якое не толькі візуальна ўспрымала мудрыя адносіны народа да жывёл, але і на справе даглядала свойскую жывёлу. А. К. Сержпутоўскі ў „Нарысах Беларусі" прыводзіць некаторыя з метадаў і сродкаў, якімі карыстаўся народ, каб выхаваць у моладзі любоў да жывёл: „... трэба адзначыць, што прасталюдзін любіць свойскіх жывёл, дзеліцца з імі апошнім кавалкам хлеба... Убеленыя сівізною і ўмудроныя жыццёвым вопытам старыя звычайна гавораць моладзі ў выглядзе павучанняў і парад: „Сам не еш, а каню дай", „Дагледзь каня дома, та ён цябе ў дарозе (дагледзіць)", „Вала перш пакармі, тагды даймі (патрабуй работы)", „У дарозе не куонь вязе, а ауёсь", „Як дагледаў (гауядо), так і Буогъ даў". „Гауядо бы дзіця: голадна – не скажа" (57, 6).

У пастухоўскі перыяд жыцця (а працягваўся ён ад шасці—васьмі гадоў дзесьці да трынаццаці) дзіця паступова авалодвала разнастайнымі традыцыямі, звычаямі, паэзіяй каляндарнага абрадавага цыкла, звязанымі з доглядам жывёлы. Сям'я загадзя рыхтавалася да выгану жывёлы на пашу. Пастушок жа станавіўся галоўнай дзеючай асобай. Яго навучалі абрадам, якія суправаджалі свята. На свяце сачылі, каб пастушок у пэўнай паслядоўнасці выконваў усе неабходныя цырымоніі, бо правільнае выкананне абраду абяцала поспех і дабрабыт жывёле і, як вынік, усёй сям'і. І кожнае дзіця старалася не падводзіць родных. Гэта садзейнічала выхаванню адказнасці, пачуцця ўласнай годнасці, асабістай вартасці (у залежнасць ад падлетка ставіла сям'я свой дабрабыт), пачуцця сямейнага гонару.

Дзяўчынкі, дзе была магчымасць, заставаліся з малодшымі дзецьмі дома. Яны рабілі нескладаную справу па гаспадарцы: даглядалі цялят, парасят, птушку, бялілі палатно, насілі ваду, а таксама абед бацькам у поле і на луг.

У „пастухоўстве" дзеці мелі магчымасць многа часу праводзіць у гульнях, якія дапамагалі ўсебаковаму развіццю. Шырока выкарыстоўваліся гульні з фізічным эфектам, яны выхоўвалі спрыт, рухавасць, хуткасць рэакцыі, сілу, пругкасць. Гулялі ў „цуркі", у „казла", у „казу", у „блудзень", у „ката", у „крэймолі" або „камешкі", „крупнік" (пераскокван-

не праз палку, „апранутую" ў шапкі), у „круцель" або „круцёлка", у „кацелкі" або ў „гыняць-вовкі". Гэтыя гульні належалі ў асноўным хлопчыкам.

У некаторых мясцовасцях Беларусі былі таксама распаўсюджаныя сярод падлеткаў такія гульні, як „барацьба" або „кулачкі", „рыса", „лапта", „гарадкі" або „рухі", „кеглі", „жгуты", „чахарда", „рэдзька" і інш.

Дзяўчынкі-пастушкі пераважна гулялі ў рухомую гульню „пакупка дзіцяці".

Як дзяўчынкі, так і хлопчыкі любілі аднаўляць у сваіх гульнях жыццё сям'і, наладжваць своеасаблівыя тэатралізаваныя сюжэтна-ролевыя гульні, дзе па-свойму паказваліся традыцыі сямейна-шлюбных адносін. Кожны ігрок стараўся жыць тым жыццём, якое вёў член сям'і, чыю ролю ён выконваў. „Бацькі" кіравалі ўсёй гульнёй, размяркоўвалі абавязкі па гаспадарцы. У час гульні „сям'я" збіралася за імправізаваны стол і аднаўляла дзеянні членаў сям'і, адпаведныя рэальным. Згодна з бытуючым у народзе этыкетам, трапезу пачынаў выбраны „бацька" як галава дома. „Бацька" і „маці" кіравалі паводзінамі дзяцей за сталом. Калі здаралася, што дзіця кідала кавалачак недаедзенага хлеба, „бацькі" давалі яму маральны ўрок. У народзе лічылася вялікім грахом кінуць скарынку або крошку хлеба. Вось як пра гэта пісаў П. В. Шэйн: „Калі хто з дзяцей упусціць крошку хлеба, то бацька або маці абавязкова скажа: „Ах, ты, разявака! Нашто ты кідаеш дар Боскі? Гэта грэх вялікі". Або скажа: „Не кідай хлеба, бо Бог будзе гневацца і хлеб кіне, то кепска будзе без хлеба" (64, 242).

Тут жа размяркоўваліся заданні па дому, падводзіўся вынік зробленай работы, з адпаведнымі павучаннямі галавы дома. Падчас гэтых гульняў дзяўчынкі выхоўвалі сваіх дзяцей-лялек, ролю якіх іншы раз выконвалі не толькі іншыя дзеці, але і палачкі, драўляныя, саламяныя лялечкі. Дзяўчынкі займаліся гатаваннем ежы, шыццём, вязаннем, ткацтвам, бяленнем палатна, жалі, г. зн. рабілі звыклыя жаночыя работы. Хлопчыкі любілі скакаць па палачках-конях, запасалі жарабятам на зіму сена, аралі поле, рабілі іншую тыповую мужчынскую справу. Часта гулялі дзеці ў тэатралізаваныя вяселлі, гулялі ў „караля і княгіню", што, як і ў дарослых, пачыналася з выбару жаніха і нявесты і наступнага вясельнага абраду. Пры гэтым дзеці спрабавалі ўзнавіць не толькі дзеянні дарослых, але і песні, абрады, якія іх суправаджаюць.

У перыяд пастухоўства хлопчыкі пад кіраўніцтвам старэйшага пастуха вучыліся плесці лапці, кошыкі, капелюшы. Прычым вучыліся не толькі самому працэсу пляцення, але і нарыхтоўцы лыка, рагоззя. Гадоў з дванаццаці хлопчыкі (падручнікі) пасвілі коней, кампаніямі хадзілі ў начное, дзе ля вогні-

шча падоўгу распавядалі казкі і „страшныя" паданні. У некаторых мясцовасцях, на Гродзеншчыне, да прыкладу, пасвіць коней і валоў даручалася як хлопчыкам, так і дзяўчынкам 8–15-гадовага ўзросту.

У падлеткавы перыяд жыцця вельмі цікавымі здаваліся дзіцяці ўсе з'явы і прадметы навакольнага свету. Яно спрабавала знайсці адказы на ўсе свае пытанні. А паколькі гэтых пытанняў было шмат і задаволіць падлетка ў сям'і маглі не заўсёды, то шукаў ён ісціну ў равеснікаў-пастушкоў, якія абменьваліся пачутымі тлумачэннямі. Тут прымяняліся і расказы, і прыкметы, і павер'і, і казкі, і легенды, і загадкі. У гэтым узросце дзіця асабліва востра ўспрымае прыкметы і павер'і, традыцыйны сродак беларускай народнай педагогікі. Выхавальны эфект заключаўся найперш у тым, што прыкметы і павер'і выкарыстоўваліся ва ўсіх узроставых перыядах, практычна ў любой жыццёвай сітуацыі. Яны захоўвалі інфармацыю пра ўсемагчымыя з'явы і факты рэальнага і ўяўнага свету, падводзілі вынік шматлікімназіранням народа, а таксама яго пошукам ісціны, веры, дабра, справядлівасці, шчасця. Тое, што аб'ектыўна існуе, у прыкметах і павер'ях перапляталася з фантастычным. У гармоніі аб'ектыўнага і фантастычнага адлюстроўваўся духоўны свет народа. Павер'і, прыкметы дапамагалі перадаваць з вуснаў у вусны назіранні, павучанні, парады, наказы, папярэджанні, думку народа літаральна пра кожную падзею з жыцця чалавека і яго сям'і. Самым, бадай, пераканаўчым і дзейсным было тое, што прыкметы і павер'і ўмомант адгукаліся на любую змену ў жыцці, аб'ектам і суб'ектам мог стаць практычна любы чалавек. Адбылася падзея, назіраецца нейкі факт, і гатовы адказ на гэта маленькаму чалавечку даюць яго браты і сёстры, бацькі, бабуля і дзядуля, суседзі, а іншы раз і ён сам – як любы іншы чалавек, які ўжо сустракаўся з такой з'явай або чуў пра яе ад кагосьці іншага.

Падлеткам і юнакам падабаліся святы аграрнага календара. Святочныя абрады ўтрымлівалі багатую інфармацыю пра вядзенне сельскагаспадарчых работ. Выхавальны эфект значна ўзмацняўся дзякуючы таму, што дзеці ў ходзе падрыхтоўкі і правядзення свята знаёміліся з гадавым цыклам земляробчага календара.

Пастаянны ўдзел у працы дарослых, у абрадах, звязаных з жывёлагадоўляй і земляробствам, шматразовае паўтарэнне абрадавых песень садзейнічалі таму, што дзеці змалку пачыналі авалодваць азамі вядзення сельскай гаспадаркі, у падлеткавым узросце яны знаёміліся з асновамі земляробства і жывёлагадоўлі, а ў юнацкі перыяд на практыцы шліфавалі і замацоўвалі набытыя веды, развівалі ўменні і навыкі, станавіліся сапраўднымі знаўцамі сялянскай навукі.

Непрыкметна настаеаў завяршальны этап сталення і фарміравання асобы – юнацтва. Значна змяняліся паводзіны, знешнасць, псіхіка, што выяўлялася нават у гульнях. У гэтым узросце юнак ужо не захапляўся дзіцячымі і падлеткавымі гульнямі, а дарослыя ў свае гульні яго яшчэ не прымалі. Тады юнакі і дзяўчаты прыдумвалі свае гульні.

Ад падлеткаў да моладзі пераходзяць гульні „Каток і мышка", „У ворана", якія на новым узроставым этапе характарызуюцца большай стрыманасцю і хутчэй падобны на нейкую абрадавую фармальнасць. Гуляюць у карагоднае і вяровачнае „Кола". Любімай маладзёжнай гульнёю была „Горуць", або „У гарэлыша", дзе выразна выяўляліся новыя адносіны паміж юнаком і дзяўчынаю. Вось як пісаў пра гэта М. Я. Нікіфароўскі: „Я павінен засведчыць толькі асаблівую чысціню іракоў, якая, пры сумеснай гульні мужчын і жанчын, забараняе крануць нават сукенку той, каго даганяюць: дастаткова забегчы наперад і тым загарадзіць уцёкі, або ўзяцца за кісць рукі" (40, 39–40).

Юнацкая гульня ў нейкай меры саступала месца танцам. Папулярнымі былі самыя разнастайныя „скокі" і „танцы-плясы" – „Лявоніха", „Руская", „Барыня", „Па вуліцы маставой", „Мяцеліца", „Прысядка" або „Казачок", „Кадрыля".

У святочныя дні моладзь наладжвала гульбішчы. Старэйшае пакаленне звычайна ўхваляла гэта. Падчас гульбішчаў юнакі і дзяўчаты знаходзіліся пад наглядам старэйшых, атрымлівалі ад іх нярэдка маральны ўрок. Выхавальны патэнцыял гульбішчаў добра раскрыў П. В. Шэйн: „На гульбішчах спяваюць, весяляцца і танцуюць. Калі ж у які вечар няма музыкі, то моладзь слухае расказы, байкі і казкі старых, загадваюць загадкі, спяваюць шчадрацовыя песні, або такія, якія можна спяваць ва ўсякі час, таксама гуляюць у розныя гульні" (61, 43).

Найбольш эмацыянальна-эстэтычна ўплывала на юнакоў і дзяўчат свята Купала, якое па традыцыі суправаджалася гульнямі-песнямі, маляўнічымі абрадавымі дзеямі. Да традыцыйных гульняў моладзі належыць таксама абрад „завіўкі бяроз". Ён звычайна праводзіўся на свята Пятра і Паўла і сімвалізаваў кумаванне дзяўчат, а іншы раз і юнакоў. І хаця абрадавы сэнс „завіўкі бяроз" амаль страціўся, маладыя людзі тым не менш з задавальненнем удзельнічалі ў гэтай гульні, бо яна звычайна суправаджалася распальваннем кастроў, танцамі, песнямі.

Гадоў з чатырнаццаці, а іншы раз з дванаццаці-трынаццаці, хлопчыкаў і дзяўчынак пачыналі актыўна прывучаць да больш складаных работ па гаспадарцы. П. В. Шэйн пісаў: „Бацька – сына, а маці – дачку пачынаюць прывучаць да работы, г. зн.

браць з сабою паўсюль. Да 18 гадоў як хлопец, так і дзяўчына становяцца ўжо сапраўднымі работнікамі" (64, 10).

Хлопчыкі вучыліся араць, баранаваць, сеяць, касіць. Прычым яны павінны былі не толькі выконваць гэтыя работы, але і вырабляць і рамантаваць прылады працы: саху, барану, вазок, сані, касу. Акрамя таго, хлопчыкаў вучылі рабіць дзверы, вокны, бочкі, ражкі, вёдры, карыты, драўляныя лыжкі, міскі, вырабляць гліняны посуд і нават будаваць хату, класці печ, г. зн. выконваць усю мужчынскую работу па гаспадарцы.

Дзяўчынкі вучыліся вядзенню хатняй гаспадаркі: гатавалі ежу, падтрымлівалі парадак у хаце, даглядалі жывёлу, птушку (паілі, кармілі, даілі і да т. п.), палолі і рвалі лён, садзілі і капалі бульбу, убіралі каноплі, жалі жыта, ткалі сукно і палатно, адбельвалі палатно, шылі бялізну для ўсёй сям'і, выконвалі ўсю жаночую работу. Ужо да шаснаццаці – васемнаццаці гадоў яны цалкам валодалі ўсімі неабходнымі ўменнямі.

Пасля заканчэння восеньскіх работ і на працягу ўсёй зімы дзяўчаты пралі лён. Іншы раз удзень яны збіраліся па 6–10 чалавек у адну хату, пралі і спявалі песні. Часта разам з імі пралі і жанчыны. Гэты звычай атрымаў назву „кудзельніц". Вечарамі дзяўчаты таксама не сядзелі без справы. Увесь доўгі зімовы вечар, а то і частку ночы яны праводзілі за калаўротам. У гэтым выпадку дзявочы збор называўся „вечарніцай", у некаторых мясцовасцях – „супрадкамі", „пасядзелкамі". Работа праходзіла за размовамі, жартамі, песнямі, загадкамі, казкамі, былінамі, паданнямі. Нярэдка гадалі на лёс.

Іншы раз на пасядзелкі запрашалі хлопцаў. У гэтым выпадку наладжвалі музыку, гульні, танцы.

Тут часта адбывалася знаёмства юнакоў і дзяўчат, выбар нявесты і жаніха.

Маладыя людзі знаёміліся таксама на святах, гульбішчах, „кірмашах", у карчме.

У карчме былі нават спецыяльныя памяшканні – залы, дзе праходзілі розныя сходы, нарады, усе сямейныя ўрачыстасці: заязджалі кумы пасля хрэсьбін дзіцяці, выглядвалі нявесту і жаніха, абмяркоўваючы іх вартасці, наладжвалі замовы і запоіны, сюды прыбываў вясельны поезд пасля вянчання, сюды прыходзілі пасля пахавання. Усе ад малога да вялікага збіраліся ў карчму пасля наведвання царквы на традыцыйных святах.

На галоўныя ж святы ў карчму прыходзілі ўсёй сям'ёй. Дзень Святога Духа, другі дзень Нараджэння Хрыстова, Новы год, 6 студзеня, 2 лютага, дзедаву нядзелю і заговіны сяляне праводзілі ў карчме зранку да вечара, а то і ўсю ноч. Старыя

за чаркай абмяркоўвалі розныя пытанні, а моладзь пад наглядам старэйшых, бацькоў весялілася, танцавала, спявала, гуляла, знаёмілася, „жаніхалася".

Практычна ва ўсіх выпадках жыцця моладзь знаходзілася пад наглядам старэйшых. Грамадская думка перасцерагала ад дрэнных учынкаў. Парады, расказы, казкі дарослых рэгламентавалі паводзіны юнака і дзяўчыны. Умудроныя жыццёвым вопытам людзі значна ўплывалі на выбар жаніха і нявесты.

Адносна чысціні і маральнасці погляды народа былі даволі строгія. Калі ў карчме з'яўляліся п'яніцы, якіяператваралі яе ў прытон, моладзь не мела права там знаходзіцца, а збіралася ў дамах суседзяў. Юнакі не дазвалялі сабе вольных адносін да дзяўчат, якія, у сваю чаргу, павінны былі захоўваць чысціню.

Беларуская карчма была не столькі піцейным домам, колькі арэнай грамадскага жыцця. Яна служыла своеасаблівым клубам і канторай, дзе абмяркоўваліся разнастайныя праблемы як сямейнага, так і грамадскага характару, і важным месцам для рашэння пытання аб выбары нявесты і жаніха.

У брак уступалі пасля пачатку палавой сталасці. Ужо гадоў з пятнаццаці на дзяўчыну глядзелі як на дарослую, як на нявесту, і звычайна ў шаснаццаць–дваццаць гадоў яна выходзіла замуж. Юнак жаніўся ва ўзросце васемнаццаці–дваццаць аднаго года.

У беларускай народнай педагогіцы сфарміравалася дакладнае ўяўленне аб арганізацыі сямейнага жыцця. Гэта ў канцэнтраванай форме зафіксаваў фальклор. Народ выступае супраць ранняга браку („Ажаніцца, як і паміраць не спяшайся", „Не спяшайся ўперад бацька жаніцца"), асуджае тых, хто, не набыўшы жыццёвага вопыту, пачынае цікавіцца ўзаемаадносінамі полаў („Яшчэ мацярынскага малака не аблізаў, а ўжо за дзяўчат бярэшся"), вучыць, што спачатку трэба ўстаць на ногі, а потым думаць пра жаніцьбу („Жаніўся б і сёння, але дзе жонка спаць будзе?", „Жонку на бацькоўскі закорак не садзі", „Спачатку хлеб зарабі, а потым жонку бяры"). Сямейнае жыццё – гэта праца. Яна ўскладвае пэўныя абавязкі на мужа і жонку: „Замуж выйсці – трэба знаці: позна легчы, рана ўстаці".

Вялікую ўвагу надае народ правільнаму выбару суджанага, вучыць не спяшацца ў гэтай важнай справе, не рабіць паспешных высноў: „Жонку бяры не на год, а на век", „Жаніўся на скорую руку – на доўгую муку".

Існуе ў народнай педагагічнай практыцы такая выхаваўчая з'ява, як нежаданне радніцца з дрэнна выхаванымі людзьмі або з сям'ёй, якая нядобра сябе зарэкамендавала, і наадварот, ухваляецца сваяцтва з працавітай, сумленнай сям'ёй. Народ вучыць: „Каго паважаюць, з тым і кумуюць", „Жонку выбірай і вачыма і вушыма" – прыслухоўвайся, маўляў, да грамадскай думкі.

Асабліва значнымі якасцямі лічыліся: розум („На хараша-га глядзець харашо, а з разумным жыць лёгка", „Краса прыглядзіцца, а розум прыгадзіцца", „Не глядзі, што на галаве, а паглядзі, што ў галаве", „З тварам да вянца, а з розумам да канца"), працавітасць („Не той харош, хто тварам прыгож, а той харош, што на справу гож", „Сенажаць аглядаць, як раса абсохне, а дзеўку на рабоце"), дабрыня („Не шукай красаты, а шукай дабраты").

Дзяўчына – будучая маці, галоўная выхавальніца ў сям'і, і ад яе вартасцей залежыць, якім вырасце будучае пакаленне, бо „якая матка, такое і дзіцятка". У сувязі з гэтым у беларускага народа выпрацаваліся пэўныя патрабаванні да дзяўчыны-нявесты. Вось як пра гэта пісаў П. В. Шэйн: „Селянін, як вядома, шукае ў сваёй жонцы найперш добрую гаспадыню, здаровую жанчыну і работніцу, прытым паводзін сумленных, не гуляшчую і не зганьбаваную, так што дзяўчына з проціглымі якасцямі мае мала надзеі выйсці замуж. Увогуле ўвага звяртаецца пераважна на здароўе і мажнасць, а матэрыяльны бок не мае вялікай вагі" (64, 188).

Пра тое ж – навучанні, парады, маральныя наказы ў беларускім фальклоры:

„Не едзь, сынку, у мястэчка,
Бо там дзевачкі лянівы:
Высока ржышча зжынаюць,
А рэдка копы стаўляюць...
Да едзь, сынку, у вёску,
Там дзевачкі рабочы:
Нізка ржышча зжынаюць,
Густа копы стаўляюць" (7, 138).

„Не бяры, сынку, ды што ў золаце!
Не бяры, сынку, ды што ў серабры!
А бяры, сынку, што ў беленькім!
А што ў золаце, то не паненачка,
то гультаечка,
А што ў серабры, то цыганачка,
то абманачка,
А што ўбеленькім, то работніца!" (7, 152).

„А другі брахна яго научаець:
– Да будзь, брахна, разумненькі,
Да паедзеш, брахна, у чужыя людзі,
Выйдзець к табе танок дзевак;
Не бяры таей, што ў золаце,
Ды бяры таю, што ў розуме,
Мы золата ў краме дастанем,
Мы розуму свайго не ўставім" (7, 283).

Пры стварэнні сям'і ў беларускага народа здаўна вялікае значэнне надаецца маральнай чысціні адносін юнака і дзяўчыны. Вясельны абрад „пасад на дзяжу" выхоўвае строгую мараль. „Галоўная ўмова пасада – гэта чысціня як жаніха, так і нявесты: сесці на пасад ні той, ні іншы не можа, калі не захаваў чысціні" (22, 102), – пісаў М. Доўнар-Запольскі.

Выхоўваючы ў дзяўчыны пачуццё ўласнай годнасці, дзявочага гонару, народ вучыць: „Чэсць дзявочае шчасце беражэ", „Чым дзяўчына стражэй, тым яна прыгажэй і даражэй", „З добрага цеста добрая паляніца, з добрай дзеўкі добрая і маладзіца".

Строга сачыла грамадства за маральнасцю юнака і дзяўчыны. Нявіннасць цанілася больш за прыгажосць і багацце. Вось што пісаў пра гэта М. Доўнар-Запольскі: „Адзіная ўмова, якая патрабуецца ад нявесты, гэта яе нявіннасць, яна яшчэ і цяпер паўсюль мае вельмі важнае значэнне. Зганьбаваная дзяўчына з цяжкасцю знаходзіць сабе жаніха, часцей за ўсё ўдаўца або беднага сірату. Дзяўчына, якая вырашыла выйсці замуж і падманула сям'ю і мужа наконкт сваёй маральнасці, не толькі сама – і ўся яе сям'я, сваякі і сваты падвяргаюцца ганьбе, але часта такое вяселле зусім скасоўваецца або маладыя разыходзяцца і не жывуць па некалькі гадоў" (22, 25).

Строга асуджае і карае народ дзяўчат, якія не зберaглі свайго гонару. У баладзе „На бітым гасцінцы..." расказваецца пра дзяўчыну, якая, трапіўшы ў карчму, дазволіла сабе прыняць ад праезджых малайцоў запрашэнне:

„– Ой, едзьма, дзяўчына,
З намі, малайцамі,
Будзе табе лепей,
Як у твае мамы.
А ў свае мамы
Работу рабіці, –
З намі, малайцамі,
Мёд, гарэлку піці" (7, 600).

І вынік: сорам . ганьба. Абняслаўленая дзяўчына не смее вярнуцца дадому:

„– Ой, я не вярнуся,
Сораму баюся".

Тады яе прывязваюць да сасны і падпальваюць. Павучальны канец балады. Паміраючы, дзяўчына гаворыць:

„А хто дзеці мае,
Няхай навучае,
Да тае карчомкі
Гуляць не пускае,

Бо тая карчомка –
Вялікая здрадніца, –
Была дзеўка добра,
Стала паскудніца" (7, 601).

Такім чынам, у баладзе народ кляйміць непаслухмянства дзяўчыны, якое прывяло яе да ганьбы, закрыла дарогу назад у сям'ю.

У іншай баладзе зганьбаваная дачка забіла сваё маленькае дзіцятка і цяпер ідзе на жорсткую расплату:

„Матка ж мая родненькая, маеш дома пяць,
Не пускай жа на гулянне, няхай дома спяць.
Матка ж мая роднenька, маеш дома дзве,
Не давай жа ім патолі так, як дала мне.
Ой, дала мне патолі, дала змалку,
Цяпер цярпі, мая матка, па мне знязлаўку,
Гэта ж табе, матка, перша навука:
Не спраўляўшы вяселля, да гадуй унука" (7, 609).

Выхавальную вагу мае звычай пасля першай шлюбнай ночы пераканацца ў нявіннасці нявесты. Калі яна захавала сябе, то і яе, і родных яе ўшаноўваюць. Калі не, то існавалі розныя рытуалы ганьбы: пускалі пеўня, надзявалі хамут на шыю нявесце, яе маці, хроснай маці, свацці і г. д. Такім чынам, за грэх нясуць адказнасць усе родныя нявесты, калі не змаглі правільна яе выхаваць. І гэты звычай таксама ўнёс сваю лепту ў станаўленне маральна-этычных уяўленняў беларускага народа аб ідэале дзяўчыны.

Да юнака-жаніха ў беларускага народа таксама вялікія патрабаванні. У фальклоры мы бачым яго працавітым, гаспадарлівым, разумным, смелым, спрытным. Ён – абаронца ад усіх нягод.

Цэніць народ і маральную чысціню юнака. Беларускія этнографы апісваюць выпадкі, калі бацька не благаслаўляў сына, які адмовіўся сесці на дзяжу, а, значыць, не захаваў чысціні (22, 104).

У народнай педагогіцы ёсць сцвярджэнне пра неабходнасць рэальнага падыходу да ўліку маральных якасцей выбранніка, у тым ліку і да маральных заган: „З гультаём пажаніцца – лепей задавіцца", „Хто п'яніцу палюбіць – жыццё сабе пагубіць". Калі ж выбар зроблены, то, вучыць народ, сям'ю нельга разбураць: „Сем раз глядзі, а назад не вядзі".

Народная педагогіка заклікае быць добрым сямейнікам: „Нашто клад, калі ў сям'і лад", „Добры сем'янін у хату горнець, а благі з хаты выносіць".

Калі ў сямейным жыцці напачатку сустракаюцца цяжкасці, трэба памятаць, што яны непазбежныя. Неабходна добра-

зычліва ставіцца адзін да аднаго: „Як гукнеш, так і адзавецца". Трэба пазбягаць усялякіх непаразуменняў і ў любой сітуацыі захоўваць сваю годнасць: „Людзей слухай, а свой розум мей і жонкі не бей", не спяшацца, калі што-небудзь не ладзіцца, і не разбураць сям'ю: „Мяняць дабро на дабро не спяшайся", „Думаць трэба, як жаніцца, а ў пяць разоў больш, як разжаніцца". Вельмі цяжка наладзіць аднойчы парушаныя добрыя адносіны: „Адсячэш – не прыставіш".

Сям'я павінна будавацца на ўзаемных павазе і сумленнасці: „Жыві з адною, да й чэсна". Народная мудрасць вучыць, што добрыя сямейныя ўзаемаадносіны значна ўплываюць на важнейшую функцыю сям'і – нараджэнне і выхаванне дзяцей: „Дзе ў сям'і лад, там і дзеці добра гадуюцца". Непрымірымыя беларусы да разрыву сям'і, бо „Муж жонку знойдзе, жонка мужа знойдзе, а дзеці бацьку не знойдуць".

Грамадская думка, зафіксаваная ў маральным кодэксе працоўнага народа, ахоўвае сям'ю, заснаваную на каханні, чысціні пачуццяў, узаемнай павазе, сумесным вядзенні гаспадаркі і выхаванні дзяцей. Бацькі, сваякі, старыя, суседзі, знаёмыя ацэньваюць паводзіны кожнай канкрэтнай сям'і, кожнага юнака і дзяўчыны, кожнага падлетка і дзіцяці, іх маральна-этычныя погляды, і сваімі меркаваннямі дапамагаюць вызначыцца чалавеку ў жыцці, правільна выбраць суджанага, мэтанакіравана будаваць сямейнае жыццё, выхаванне дзяцей. Сваякі, знаёмыя садзейнічаюць аб'яднанню ў сям'ю падыходзячых, на іх думку, юнакоў і дзяўчат, дапамагаюць ім зрабіць выбар. Выхоўваюць таксама абрады – сватанне, заручыны, традыцыйнае беларускае вяселле.

Вяселле – гэта сур'ёзнае выпрабаванне не толькі для нявесты і жаніха, але і для ўсіх сваякоў. Ю. Ф. Крачкоўскі пісаў: „Вяселле – гэта адна з найважнейшых падзей у жыцці чалавека, таму, трэба думаць, характар селяніна нідзе не малюецца так выпукла, як у дадзеным выпадку. Тут вы сустракаецеся з доўгім шэрагам правіл, прыкмет, замоў, прыгавораў і розных абрадаў, заснаваных на забабонных вераваннях і крый Божа ўпусціць, не зрабіць чаго-небудзь з таго, што, як святыня, перадавалася з роду ў род, выконвалася пры бацьках і дзядах, „даўным даўно бывала"; пастаянныя няшчасці, вечныя няўдачы, а бадай і неблагаслаўленне Боскае будуць праследаваць, на думку сялян, да скону такога парушальніка сівой даўніны" (34, 1).

На вяселлі знаёмяцца сем'і, якія будуць цяпер роднымі, завязваюцца сваяцкія сувязі, а гэта адна з важных умоў для стварэння спрыяльнага клімату ў новай зямлі, для яе ўмацавання і стабілізацыі, бо ад сваякоў маладыя атрымліваюць не толькі матэрыяльную падтрымку, але, што самае галоўнае, у іх

асобе яны знаходзяць мудрых і вопытных настаўнікаў, да якіх можна прыйсці за маральнай дапамогай і парадай ва ўсіх жыццёвых сітуацыях.

Усе элементы традыцыйнага вясельнага абраду выконваюць выхаваўчую функцыю. Возьмем хаця б абрад, які папярэднічае шлюбу, – бацькоўскае благаславенне перад вяселлем. Вось адно з характэрных для беларусаў бацькоўскіх благаславенняў: „Благаслаўляю цябе хлебам, соллю, шчасцем, доляй і добрым здароўем, не на адну гадзіну, а на ўвесь доўгі век" (62, 165). Такім чынам, бацькі вучаць маладых: жаніцьба – гэта сур'ёзны крок, на ўсё жыццё.

Па звычаі на вяселлі маладым выказваюць розныя пажаданні-парады, што маюць выхаваўчы падтэкст, напрыклад пажаданне ўзаемаразумення і ладу ў сям'і: „Дару торбу грэчкі, каб ні было між маладымі ніколі спрэчкі", „Каб адзін аднаго шанавалі і нас, старых, не забывалі".

Асаблівае ж месца ва ўсіх вясельных абрадах займалі песні. Яны суправаджалі ўсе асноўныя этапы вяселля: сватанне, заручыны, падрыхтоўку каравая, пасад нявесты і жаніха, вясельную бяседу, урачыстае застолле ў доме жаніха і інш. У гэтых песнях апаэтызаваны духоўны свет чалавека, яго паўсядзённае жыццё, побыт, маральныя якасці нявесты і жаніха. Песні змяшчаюць павучанні, наказы, парады, пажаданні, настаўленні, перасцярогі.

Вяселле ў абавязковым парадку ўключала ў сябе выпрабаванне маладой. Гэты вясельны абрад дазваляў дакладна зведаць характар нявесты і меркаваць аб яе ўменні выконваць розныя віды хатняй работы. Яна павінна была ўмець замясіць і спячы пірагі, бліны, прыбраць у хаце, прынесці з калодзежа, не расплескаўшы, вядро вады, памыць бялізну. Правяралі таксама яе ўменне прасці.

Нявеста сваімі рукамі рыхтавала пасаг, па ім таксама меркавалі аб яе гатоўнасці да сямейнага жыцця. На другі дзень вяселля маладая павінна была ўпрыгожыць сваімі вырабамі дом мужа, апрануць бацькоў маладога ва ўсё новае і дапамагчы ім залезці на печ, паказваючы гэтак сваю павагу і гатоўнасць служыць новым бацькам.

Існаваў абрад навучання маладой. Родныя мужа вучылі яе вядзенню хатняй гаспадаркі – мыць посуд, гатаваць ежу, грэбці сена, насіць дровы. За ўсякую „навуку" маладая расплачвалася саматканым поясам.

Юнакоў і дзяўчат загадзя, ужо змалку, рыхтавалі да традыцыйных вясельных выпрабаванняў, усё папярэдняе іх жыццё было падрыхтоўкай да сямейнага.

Змоўклі вясельныя песні, разышліся госці, закончылася вяселле, закончылася юнацтва, пачынаецца дарослае жыццё.

# Літаратура


1. Алексеев Л. В. Полоцкая земля: Очерки по истории Советской Белоруссии. IX–XIII вв. Мн., 1966.

2. Алексютович Л. К. Белорусские народные танцы, хороводы, игры / Под ред. М. Я. Гринблата. Мн., 1978.

3. Анталогія беларускай народнай песні / Уклад., прадмова і каментарыі Г. Цітовіча. 2-е выд., дап. Мн., 1975.

4. Балады: у 2 кн. Кн. 1 / Пад рэд. К. П. Кабашнікава, В. І. Ялатава. Мн., 1977.

5. Беларуская народна-паэтычная творчасць: вучэбн. дапаможнік для філал. фак. ВНУ / Пад рэд. М. Р. Ларчанкі. Мн., 1979.

6. Беларускі народ супраць папоў і рэлігіі: Зборнік фальклорных твораў / Пад рэд. М. М. Нікольскага. Мн., 1939.

7. Беларускі фальклор: Хрэстаматыя. 2-е выд., дап. / Склад. К. П. Кабашнікаў, А. С. Ліс, А. С. Фядосік, І. К. Цішчанка. Мн., 1977.

8. Беларускі эпас / Пад рэд. П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава. Мн., 1959.

9. Белорусские народные сказки. Мн., 1963.

10. Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі / Склад Я. Рапановіч, 2-е выд., перапр. і дап. Мн., 1974.

11. Белоруссия (Выписки из труда В. Игнатовского „Белоруссия". Мн., 1924 г.) // Бюллетень официальных приказов и сообщений Витебского Отдела Народного Образования. 1924. № 8.

12. Бессонов П. А. Белорусские песни. М., 1871.

13. Богданович А. Е. Педагогические воззрения белорусского народа // Минский листок. 1886. № 66.

14. Булгаковский Д. Г. Пинчуки: Этнограф. Спб. 1890.

15. Валачобныя песні / Пад рэд. К. П. Кабашнікава. Мн., 1980.

16. Виноградов Г. Народная педагогика. Иркутск, 1926.

17. Вусна-паэтычная творчасць беларускага народа: Хрэстаматыя для ВНУ / Склад. С. І. Васілёнак, І. В. Гутараў. Мн., 1959.

18. Выслоўі / Пад рэд. А. С. Фядосіка. Мн., 1979.

19. Гілевіч Н. С. Наша родная песня. Мн., 1968.

20. Горький А. М. Об искусстве / А. М. Горкий о литературе. М., 1953.

21. Дзіцячы фальклор / Пад рэд. К. П. Кабашнікава. Мн., 1972.

22. Довнар-Запольский М. В. Исследования и статьи. Т. 1. Киев, 1909.

23. Дубинин Н. П. Социальное и биологическое в современной проблеме человека // Вопросы философии. 1972. № 10.

24. Жартоўныя песні / Пад рэд. А. С. Фядосіка, Г. І. Цітовіча. Мн., 1974.

25. Жніўныя песні / Пад рэд. А. С. Фядосіка. Мн., 1974.

26. Загадкі / Пад рэд. А. С. Фядосіка. Мн., 1972.

27. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: Избр. произв. 16 – начала 19 в. / Под ред. В. А. Сербента и др. Мн., 1962.

28. Ильюшин И., Умрейко С. Народное образование в Белорусской ССР. Мн., 1961.

29. Карский Е. Белорусы. Кн. 1. Вильно, 1904.

30. Карский Е. Ф. Белорусы. Т. 3. М., 1916.

31. Карский Е. Ф. Белорусы. Т. 3. Кн. 3. Ч. 2. М., 1922.

32. Козлов В. В. Народные идеалы и действительность в белорусской сказке: Учеб.-метод. пособие. Ч. 1. Гомель, 1985.

33. Козлов В. В. Отражение социально-этических идеалов народа в белорусской сказке: Автореф. дис... канд. филол. наук. М., 1979.

34. Крачковский Ю. Ф. Быт западно-русского селянина. М., 1874.

35. Крачковский Ю. Ф. Очерки быта западно-русского крестьянина // Виленский сборник. 1869. С. 160—209.

36. Лірычныя песні / Уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. Мн., 1976.

37. Мудрыя дарадцы: Прыказкі і прымаўкі / Уклад. А. У. Янголь. 2-е выд., дапрац. Мн., 1983.

38. Мялешка А. А. Савецкая сямейная абраднасць Беларусі. Мн., 1976.

39. Мялешка А. А. Сучасныя традыцыі, святы і абрады. Мн., 1976.

40. Никифоровский Н. Я. Очерки Витебской Белоруссии // Этнографическое обозрение. 1897. № 3.

41. Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности: Этнографические данные. Витебск, 1885.

42. Никифоровский Н. Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах. Витебск, 1897.

43. Носович И. И. Сборник белорусских пословиц: Сб. отд. рус. яз. и словес. ИМП АН. СПб., 1874.

44. Носович И. И. Словарь белорусского наречия. СПб. 1870.

45. Нравственный долг коммуниста // Правда. 1979. 13 апр.

46. Онуфриев М. Детские игры у белорусов. Село Хоново Быховского уезда // Могилевская старина. 1902—1903 / Под ред. Е. Р. Романова. Вып. 3. Могилев-на-Днепре. 1903.

47. Очерки истории народного образования и педагогической мысли в Белоруссии / Под ред. С. А. Умрейко, Г. Г. Сенкевич, В. К. Андреенко, П. С. Солнцева. Мн., 1968.

48. Песні беларускага народа / Уклад. Г. І. Цітовіч. Мн., 1950.

49. Песні народных свят і абрадаў / Уклад і рэд. Н. С. Гілевіча. Мн., 1974.

50. Песні сямі вёсак: Традыцыйная народная лірыка Міншчыны / Уклад. і рэд. Н. Гілевіча. Мн., 1973.

51. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. Кн. 1, 2 / Пад рэд. А. С. Фядосіка. Мн., 1976.

52. Радзінная паэзія / Пад рэд. Г. І. Цітовіча. Мн., 1971.

53. Романов Е. Р. Белорусский сборник. Т. 1. Вып. 1, 2. Могилев, 1885.

54. Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. Вильна, 1912.

55. Романов Е. Р. Статья без заглавия об изучении детских белорусских игр: Неофициальный отдел // Витебские губернские ведомости. 1890. № 93.

56. Сахута Е. М. Народное искусство и художественные промыслы Белоруссии. Мн., 1982.

57. Сержпутовский А. Очерки Белоруссии. СПб. 1908.

58. Сержпутовский А. К. Сказки и рассказы белорусов-полешуков: Материалы к изучению творчества белорусов и их говора. СПб. 1911.

59. Соколова В. К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов. 19 — начало 20 в. М., 1979.

60. Чарадзейныя казкі. Ч. 1. / Пад рэд. В. К. Бандарчыка. Мн., 1973.

61. Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края: СПб. Т. 1. Ч. 1. 1887.

62. Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края: СПб. Т. 1. Ч. 2. 1893.

63. Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края: СПб. Т. 2. 1893.

64. Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб. Т. 3. 1902.

65. Шпилевский П. Белорусские народные поверья // 1852. Лит. Приб. № 3.

## ЗМЕСТ

Прадмова . . . . . . . . . . 3

Уводзіны ў народную педагогіку . . . . . . . . . . 5

Што такое народная педагогіка? . . . . . . . . . . —

Асноўныя сродкі народнай педагогікі . . . . . . . . . . 7

Спосабы і прыёмы выхавання ў народнай педагогіцы . . . . . . . . . . 15

Асноўныя ідэі выхавання ў беларускай народнай педагогіцы . . . . . . . . . . 22

Працоўнае выхаванне . . . . . . . . . . —

Разумовае выхаванне . . . . . . . . . . 37

Маральнае выхаванне . . . . . . . . . . 47

Рэлігійнае выхаванне . . . . . . . . . . 68

Эстэтычнае выхаванне . . . . . . . . . . 72

Патрыятычнае выхаванне . . . . . . . . . . 78

Фізічнае выхаванне . . . . . . . . . . 82

Педагогіка маленства, дзяцінства і юнацтва . . . . . . . . . . 88

Літаратура . . . . . . . . . . 188

185 р. 100